# ГЕРОЛЬД LITHERLAND

**№ 1–2 (13–14). Горадня, 2004. Год IV.**

“***Герольд Litherland***”© – навуковы геральдычны часопіс. Выдавец і рэдактар – Аляксей Шаланда. Намеснік рэдактара – Сяргей Амелька. Тэхнічны рэдактар – Генадзь Семянчук. Нумар дапамагалі рабіць: Юры Кітурка, Іна Крайнева, Віталь Карнялюк. Часопіс выходзіць раз у квартал і распаўсюджваецца толькі па замове. Наклад 100 асобнікаў. Пры передруку спасылка на часопіс “*Герольд Litherland*” абавязковая. Адрас для дапісаў і замоваў: **РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ, 230024, ГОРАДНЯ–24, п/с 50. E-mail: Litherland@tut.by**


**ЗМЕСТ:**


**Ад рэдакцыі**, с.1; **АРТЫКУЛЫ:** А.Шаланда: **Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ВКЛ у другой палове XVI–XVIII ст. (А)**, с.2; А.Леўчык: **Пячаткі менскага біскупа Якуба Дэдэркі ў фондах НГАБ у Менску**, с.21; Г.Брэгер: **Жодзішкі Ашмянскага павета і яго ўладальнікі ў XVI–пачатку XX ст.**, с.24; Ю.Гардзееў: **Матэрыялы да генеалогіі і эпіграфікі ў гарадзенскім фарным касцёле**, с.27; В.Карнялюк: **З гісторыі барацьбы жыхароў мястэчка Крынкі за свае правы ў першай палове XIX ст.**, с.29; **ПАВЕДАМЛЕННІ:** А.Шаланда: **Герб мястэчка Новы Двор у Ваўкавыскім павеце**, с.34; В.Міронава: **Да пытання аб колерах герба Пружанаў**, с.36; С.Амелька: **Дзейнасць дабрачынных таварыстваў шляхты ў Беларусі ў канцы XVIII–сярэдзіне XIX ст.**, с.39; **КРЫНІЦЫ:** Г.Семянчук: **Попіс шляхты Ваўкавыскага павета 1621 г.**, с.44; А.Шаланда: **Пергаміны 1700–1775 г. у фондах Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея**, с.51; **РЭЦЭНЗІІ**, с.62; **ПЫТАННІ, АДКАЗЫ, КАНТАКТЫ, ІНФАРМАЦЫЯ,** с.65; **СПІС СКАРОТАЎ**, с.68.


## Ад рэдакцыі.

Пры падрыхтоўцы гэтага нумару “*ГL*” так атрымалася, што нягледзячы на ўключэнне ў яго матэрыялаў па Менску, Крынкам, Жодзішкам і Пружанам, асноўная частка артыкулаў у ім прысвечана былому Ваўкавыскаму павету Наваградскага ваяводства ВКЛ. Яны ёсць ва ўсіх трох раздзелах часопісу (“*Артыкулы*”, “*Паведамленні*”, “*Крыніцы*”). Тлумачыцца гэта тым, што з Ваўкавыску паходзіць адзін з рэдактараў “*ГL*” – Генадзь Семянчук. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы яго намаганням 20–21 чэрвеня 2003 г. адбылася навукова-краязнаўчая канферэнцыя з нагоды 500-годдзя надання Ваўкавыску Магдэбургскага права (1503–2003) і з’явілася ў друку кніга “*Памяць. Ваўкавыскі раён*”[1]. Частка сабраных ім матэрыялаў не трапіла ні ў планаваны сборнік матэрыялаў канферэнцыі, ні ў згаданае выданне. Затое, яны добра ўпісваюцца ў канцэпцыю нашага часопіса і таму атрымаўся амаль тэматычны нумар “*ГL*”, прысвечаны шляхце Ваўкавыскага павета. У дадатак да гэтага мы звярнуліся да аднаго з нашых сталых аўтараў з просьбай зрабіць агляд-рэцэнзію на адзіны (!) пакуль што зборнік матэрыялаў канферэнцыі, прысвечаны гісторыі Ваўкавышчыны, які быў надрукаваны аж у 1997 г. Гэта зроблена з мэтай звярнуць яшчэ раз увагу даследчыкаў на такога кшталту выданні, якія ў свой час былі пэўнай брамай у навуку для маладых гісторыкаў і краязнаўцаў. Тым болей, што сёння ў Беларусі колькасць гістарычных і краязнаўчых выданняў зменьшылася да небяспечнага мінімуму.

Прапанаваны нумар больш “*геральдычны*” за папярэднія. Цешыць, што, хаця і паволі, але павялічваецца кола аўтараў “*ГL*” і пашыраецца іх геаграфія (Менск, Берасце). Тым не меньш, запрашаем усіх зацікаўленых тэматыкай часопіса да супрацоўніцтва. Упэўнены, што толькі разам можна рабіць якаснае навуковае выданне.

*Рэдакцыя.*

[1] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ваўкавыскага раёна.– Мн.: БЕЛТА, 2004.– 528 с.

## *АРТЫКУЛЫ.*

# Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ВКЛ у другой палове XVI–XVIII ст. (А).

In work "*The true Armorial of nobility of Vaŭkavysk region in second half 16$^{th}$ –18$^{th}$ c.*" **Alaksiej Šałanda** on basis sphragistic materials reconstructs really heraldic situation among Vaŭkavysk nobility in the specified period, analyzes processes in nobility heraldry separately taken region, and allocates three basic kinds nobility of the arms: Polish, mark and western European. The work is attempt of creation new heraldic-archeographic type of armorial of nobility of GDL on an example Vaŭkavysk region.

***Уводзіны.***

Шляхта Ваўкавыскага павета ВКЛ і яе гербы пакуль не дачакаліся спецыяльнага даследавання ні ў айчыннай, ні ў замежнай гістарыяграфіі. Асноўнымі крыніцамі для яе вывучэння застаюцца гербоўнікі другой паловы XVI–XVIII ст. Барташа Папроцкага [1], Шымана Акольскага [2], Войцеха Віюка Каяловіча [3] ці Каспара Нясецкага [4]. Асабліва трэба адзначыць працы апошніх аўтараў. В.Каяловіча – таму, што яго гербоўнік быў прысвечаны непасрэдна гербам шляхты ВКЛ, а К.Нясецкага – за тое, што ён стварыў найбольш поўны гербоўнік шляхты Рэчы Паспалітай. Аднак, пры знаёмстве з іх матэрыяламі высвятляецца, што пошук гербаў павятовай шляхты ВКЛ мае пэўныя цяжкасці. Па-першае, аўтары гербоўнікаў не заўсёды пазначаюць з якога павета паходзіць той ці іншы род, аддаючы перавагу іх прывязцы да ваяводстваў. Па-другое, вялікая частка шляхты (у першую чаргу гэта датычыць К.Нясецкага) падаецца без указання гербаў. Па-трэцяе, шматлікія роды сярэдняй і дробнай шляхты і іх гербы навогул не трапілі на старонкі згаданых твораў. Красамоўна пра гэта сведчаць словы В.Каяловіча: "*Pisali B.Paprockj y x.Okolski, ludzie wieczney pamięci y wdzięczności godni, o herbach domow Litewskich, więcey tu nierównie, niz w nich, naydziesz, iednak abyś wszytkich nalazł, tego obiecować nie mogę...*" [3, s.1].

Пералічаныя цяжкасці датычаць пошукаў і гербаў шляхты Ваўкавыскага павета ВКЛ. У такой сітуацыі асноўнымі крыніцамі для складання сапраўднага гербоўніка ваўкавыскай шляхты, на нашу думку, павінны стаць сфрагістычна-геральдычныя матэрыялы або адбіткі пячатак. Прыярытэт згаданых крыніцаў вынікае з таго, што адбіткі пячатак захоўваюць той выгляд гербаў, клейнаў і выяваў, якімі непасрэдна карысталіся шляхцічы ў сваёй жыццёвай практыцы [5, с.10]. У параўнанні з дадзенымі гербоўнікаў, а таксама з геральдычнымі помнікамі, якія захаваліся да нашых дзён на кафлі, карцінах, мурах будынкаў, нагробках і іншых рэчах, яны дазваляюць вызначыць сапраўдную геральдычную сітуацыю ў павеце. Першы вопыт такой працы дазваляе гаварыць аб перспектыўнасці падобных геральдычных даследаванняў[2].

Праблема складання сапраўдных гербоўнікаў павятовай шляхты ВКЛ сёння стаіць надзвычай востра. Па-першае, так і не створаны пакуль поўны гербоўнік шляхты ВКЛ. Па-другое, у тых гербоўніках, што існуюць, менавіта сярод гербаў шляхты ВКЛ найбольш памылак. Па-трэцяе, у геральдычнай літаратуры моцна закараніўся погляд аб шляхецкай геральдыцы ВКЛ як аб пераважна польскай. Пры гэтым не ўлічваецца, што з XV па канец XVIII ст. адбылася гербавая паланізацыя шляхты ВКЛ, або свядомы пераход да карыстання

---

[2] Гл.: Шаланда А. Падляшскі гербоўнік: Весэлі гербу "*Рагаля*".// Бельскі гостінэць.– Бельск, 2000.– Nr 5.– С.14–17; яго ж: Да праблемы складання сапраўднага гербоўніка шляхты Браслаўскага павету ВКЛ другой паловы XVI–XVIII ст.// Браслаўскія чытанні: Мат-лы V-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 935 годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах.– Браслаў, 2001.– С.101–104; яго ж: Падляшскі гербоўнік: Галынскія гербу "*Праўдзіц*". Сухорскія гербу "*Ястрабец*".// Бельскі гостінэць.– Бельск, 2001.– Nr 4.– С.26–27; яго ж: Сапраўдны гербоўнік шляхты Браслаўскага павета ў XVI–XVIII ст.: новыя знаходкі.// Браслаўскія чытанні: Мат-лы VI-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926).– Браслаў, 2003.– С.105–108; яго ж: Шымборскія гербу "*Слепаўрон*" зменены.// Бельскі гостінэць.– Бельск, 2003.– Nr 2.– С.19–20.

польскімі шляхецкімі гербамі[3]. Завяршыўся гэты працэс у першай палове XIX ст. ужо ў складзе Расійскай імперыі, пра што сведчаць гербы з так званых "*вывадовых*" дакументаў канца XVIII–першай паловы XIX ст. За рэдкім выключэннем менавіта польскімі гербамі шляхта былога ВКЛ імкнулася падмацаваць сваё шляхецтва ў Расіі[4]. На самой жа справе, у XVI–XVIII ст. сярод гербаў беларускай і літоўскай шляхты дакладна прасочваюцца тры асноўныя віды: польскі, клейнавы і заходнееўрапейскі[5].

Апошняе справядліва і ў адносінах да ваўкавыскай шляхты, таму галоўнай мэтай нашай працы стала стварэнне на падставе сфрагістычна-геральдычных матэрыялаў такога гербоўніка, які складаецца з аўтэнтычных гербаў канкрэтнай асобы пэўнага роду. У сувязі з гэтым, сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ў другой палове XVI–XVIII ст. заснаваны на асабовым прынцыпе. Генеалагічныя звесткі выкарыстоўваюцца ў ім як дадатковыя і дапаможныя. У гэтым наша праца адрозніваецца ад таго геральдычна-генеалагічнага тыпу гербоўніка, які быў выпрацаваны яшчэ ў XVI ст. Б.Папроцкім і падтрыманы яго наступнікамі як у Польшчы, так і ў ВКЛ у XVII–XVIII ст. У пэўным сэнсе "*Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ў другой палове XVI–XVIII ст.*" уяўляе сабой больш геральдычна-археаграфічны твор, дзе галоўная ўвага звярталася менавіта на герб канкрэтнага прадстаўніка таго ці іншага роду, а таксама на змест дакумента, да якога была прыкладзена яго гербавая пячатка.

***Храналагічныя рамкі гербоўніка.***

Храналагічныя межы гербоўніка ахопліваюць другую палову XVI–XVIII ст. – час найвышэйшага росквіту і заняпаду шляхецкай геральдыкі ВКЛ. Вылучаны перыяд падзяляецца на два этапы:

- другая палова XVI–першая палова XVII ст.;
- другая палова XVII–канец XVIII ст.

На першым з іх шляхецкая геральдыка ў ВКЛ дасягнула свайго росквіту, што праявілася ў росце колькасці гербаў, іх відавым багацці, разнастайнасці тыпаў гербавых выяў. У першую чаргу гэта датычыць клейнавай геральдыкі шляхты ВКЛ. У вызначаны час працэс геральдызацыі ўключаў у сябе далучэнне да выяў на тарчах дадатковых гербавых элементаў: гелмаў, каронаў, кляйнотаў, намётаў. Важнай асаблівасцю гэтага этапу быў моцны і хуткі працэс натуралізацыі клейнавых гербаў. Пад ім разумеецца такая мастацкая расшыфроўка знакаў-клейнаў, пры якой яны ператвараліся ў выявы натуралістычнага і рэалістычнага характару, што было вынікам уплываў у ВКЛ рэнесансавага і барокавага мастацтва. Вылучаецца поўная і непоўная натуралізацыя. У выніку апошняй атрымоўваўся камбінаваны герб: клейнавы знак + выява. Цалкам натуралізаваны клейнавы герб ужо нічым не адрозніваўся ад гербаў заходнееўрапейскага тыпу.

Шырокае распаўсюджанне сярод беларускай і літоўскай шляхты складаных шматпалёвых гербаў засведчыла складанне ў шляхецкай геральдыцы ВКЛ трох узроўняў гербаў: асабістых (складаных), сямейных (клейнавых) і родавых. У якасці апошніх, пасля аб'яднання ў 1569 г. ВКЛ і Польшчы ў Рэч Паспалітую, усё часцей пачынаюць выкарыстоўвацца польскія шляхецкія гербы. Рост польскага сектара шляхецкай геральдыкі ВКЛ адбываўся як афіцыйным шляхам на падставе віленскага прывілея караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста ад 7 чэрвеня 1563 г., так і неафіцыйным – праз сямейныя сувязі, праз стварэнне ўласнага герба на ўзор польскага і, нарэшце, праз паланізацыю клейнавых

---

[3] Гл., Шаланда А. Гербавая паланізацыя шляхты Гарадзенскага павета ВКЛ у другой палове XVI–першай палове XVII ст.// Мінулае Гродзеншчыны: Вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў гісторыі і геаграфіі./ Пад рэд. В.Шведа.– Гродна: УА "*Гродзенскі АІПК і ПКР і СА*", 2002.– С.12–16.

[4] Гл., Малы гербоўнік Наваградскай шляхты./ Склад. С.А.Рыбчонак.– Мн.: БелНДІДАС, 1997.– 161 с.; Яцкевіч Зм. Малы гербоўнік халопеніцкай шляхты.– Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999.– 111 с.; Гербоўнік беларускай шляхты./ Т.Капіца, А.Леўчык, С.Рыбчонак і інш.– Мн.: БелНДІДАС, 2002.– Т.1.– 493 с.

[5] Гл., напрыклад: Шаланда А. Асноўныя віды гербаў шляхты Наваградскага павета ў другой палове XVI–першай палове XVII ст.// Краязнаўчыя запіскі.– Гродна, 2003.– Вып.6.– С.77–82.

гербаў[6]. Падвышэнне значэння польскіх шляхецкіх гербаў у ВКЛ было звязана з канчатковым афармленнем мясцовага шляхецкага саслоўя на ўзор польскага, пры гэтым польскія гербы выступалі ў якасці галоўных доказаў прыналежнасці да яго.

У гэты час звычайнай з'явай сярод беларускай і літоўскай шляхты былі дзвухгербавасць – сітуацыя, калі прадстаўнікі аднаго і таго ж роду, або нават адная асоба, ужывалі два гербы – клейнавы і польскі, і шматгербавасць, калі ў родзе выкарыстоўваліся больш за два гербы. З аднаго боку гэта сведчыла аб раўнавазе паміж асноўнымі сектарамі шляхецкай геральдыкі ВКЛ, з другога – гэта было прыкметай збліжэння геральдычных сістэмаў ВКЛ і Польшчы ў межах Рэчы Паспалітай.

На другім з вызначаных этапаў узмацняюцца польскія геральдычныя ўплывы на геральдычную сістэму ВКЛ. Крызіс перажывае клейнавая шляхецкая геральдыка. У вызначаны час праз паланізацыю і натуралізацыю значна змяншаецца колькасць клейнавых гербаў. Паланізацыя іх гербавых выяў набыла штучны характар – не праз натуралізацыю, а праз прамое ўключэнне клейнавых гербаў аўтарамі гербоўнікаў XVII–XVIII ст. (Ш.Акольскім, В.В.Каяловічам, К.Нясецкім і інш.), з мэтай сістэматызацыі і класіфікацыі, у лік польскіх гербаў і іх варыянтаў. Тыя клейнавыя гербы, якія замацаваліся ў шляхецкай геральдыцы Рэчы Паспалітай, набылі родавы характар. На ўзор польскіх ім даваліся назвы або ад імя родапачынальніка ("*Агінец*", "*Карыбут*", "*Барэйка*"), або ад назвы ўладання ("*Друцк*"), або ад падабенства на нейкую рэч ("*Вага*", "*Ліхтар*"), або, найбольш часта, ад прозвішча роду ("*Масальскі*", "*Зяновіч*"). Працягваўся далей і працэс натуралізацыі клейнавых гербаў, які цяпер суправаджаўся міфалагізацыяй. Апошняя прадугледжвала стварэнне такой гербавай гісторыі (міфа), якая б тлумачыла яго паходжанне. Усё гэта спрыяла перацяканню клейнавых гербаў у польскі і "*заходні*" сектары шляхецкай геральдыкі ВКЛ. Аднак, галоўным фактарам, які абумовіў заняпад клейнавай геральдыкі, было знікненне прыватнай гербавай пячаткі ў шляхецкіх масах ВКЛ і замена яе подпісамі. У выніку знікла з ужытку вялікая колькасць клейнавых гербаў, якія так і не знайшлі адлюстравання ў гербоўніках.

Крызіс і заняпад клейнавай геральдыкі прывёў да дысбалансу ў сістэме шляхецкай геральдыкі ВКЛ на карысць польскіх гербаў. У самым жа польскім сектары вызначальнай тэндэнцыяй становіцца уніфікацыя ці прывядзенне польскіх гербаў шляхты ВКЛ у адпаведнасць з тымі ўзорамі, якія былі змешчаны ў гербоўніках. Гэта сведчыла аб далейшым збліжэнні геральдычных сістэм ВКЛ і Польшчы, аж да іх поўнага аб'яднання. Шмат у чым падобны працэс быў адлюстраваннем сацыяльна-палітычнай і культурнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай.

На гэтым этапе ў шляхецкай геральдыцы ВКЛ закончыўся працэс геральдызацыі. Па сутнасці, гэта была яго заключная стадыя: гербы набылі такія дадатковыя элементы, як арматура, тарчатрымальнікі, ордэны і дэвізы. Былі вызначаны і замацаваны гербавыя колеры. Асаблівасцю геральдызацыі было знікненне гелмаў і шырокае выкарыстанне шляхецкіх каронаў, княжацкіх мітраў і намётаў.

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 г.) пад час правядзення новымі ўладамі легітымацыі шляхты былога ВКЛ адбылася яе канчатковая гербавая паланізацыя або масавы свядомы пераход зпаланізаванай мясцовай шляхты да карыстання польскімі шляхецкімі гербамі. Расцягнуты па часе гэты працэс меў месца і ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст.

***Геаграфічныя межы гербоўніка.***

Геаграфія гербоўніка ахоплівае межы Ваўкавыскага павета ў другой палове XVI–XVIII ст. Павет быў створаны ў 1507 г. [6, Т.2, с.235] на тэрыторыі былога Ваўкавыскага княства (зямлі). У склад павета, які яшчэ ў пачатку XVI ст. уваходзіў у Троцкае ваяводства, акрамя ўласна Ваўкавыскай воласці, ўваходзілі Мсцібогаўская, Поразаўская і Новадворская [7, с.163–164]. Пазней Ваўкавыскі павет увайшоў у Наваградскае ваяводства, што было

[6] Пад паланізацыяй клейнавых гербаў разумееццаператварэнне клейнавай гербавай выявы ў польскую ў выніку яе натуралізацыі і геральдызацыі.

замацавана адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформай 1565–1566 г. У канцы XVI ст. у ім разам з павятовым цэнтрам – горадам Ваўкавыскам – існавалі наступныя мястэчкі: Воўпа, Новы Двор, Мсцібогаў (Мсцібаў) (усе – дзяржаўныя) і Рось, Крамяніца, Межырэч, Лыскава, Поразава, Пятухова, Лапеніца, Свіслач, Зэльва, Пяскі, Ялаўка (прыватныя). З іх Ваўкавыск, Воўпа, Лыскава, Мсцібогаў, Межырэч і Пяскі мелі ўмацаваныя замкі [6, Т.2, с.235–236]. Даволі кампактны Ваўкавыскі павет на поўначы меў за мяжу Нёман, на ўсходзе – Зэльвянку, на паўднёвым захадзе – Нараў. Галоўная рака павету – Рось. Межы павета некалькі разоў удакладняліся, асабліва ў 1565–1566 г. У 1624 г. яны апісваліся так: "*Ад Каралёва Маста, дзержачы маёнткі Бераставіцкія да Горадні па леваму [боку], аж да старога Двару Воўпенскага, [далей] граніцай Воўпенскай да Гудзевічаў, ад Гудзевічаў да Лунна, паміж Лунна і граніцай Воўпенскай у Нёман, Нёманам да Зэльвы ракі, дзе ў Нёман упадае, Зэльвай ракой ўверх аж да Ражанай рэчкі, дзе ў Зэльву ўпадае, за Зэльвай жа [ракой] міма Шэпезы [Шчэпічаў] і Ба[й]ковічаў да Жалабатых Мастоў граніцай Падляшскай, ад Жалабатых Мастоў да Нараўскай дарогі, якая ідзе Пушчай Белавежскай з боку, і [з] Пушчы аж да Каралёва Маста*" [8, а.177 адв.]. У 1793 г. з утварэннем новага Гарадзенскага ваяводства Ваўкавыскі павет адышоў да яго. У XVIII ст. на яго тэрыторыі фіксуюцца экс-тэрытарыяльныя адзінкі – графствы. Так, у 1768 г. фальварак Палонск Ваўкавыскага павета ўваходзіў у графства Ражанскае, якое належала Сапегам [9, ф.1664, воп.1, спр.188, а.4]. У 1800 г. да графства Ябланоўскага князёў Ябланоўскіх належалі Цяневічы і Каралішкі Ваўкавыскага павета [29, с.57].

Сёння большая частка былога Ваўкавыскага павета Наваградскага ваяводства ВКЛ знаходзіцца ў складзе Рэспублікі Беларусь, а меньшая – заходне-паўднёвая частка (Ялаўка і акруга) – у Польшчы.

***Гістарыяграфія і крыніцы.***

Пры складанні сапраўднага гербоўніка шляхты Ваўкавыскага павета ў другой палове XVI–XVIII ст. намі выкарыстоўваліся як апублікаваныя, так і неапублікаваныя крыніцы. Да першых адносяцца ўсе з пералічаных вышэй гербоўнікаў.

Першым гербы ваўкавыскай шляхты ўзгадаў у сваім творы "*Herby rycerstwa polskiego*" (Кракаў, 1584 г.) Б.Папроцкі. Былі гэта герб "*Пагоня*" Рэплінськіх, уласныя гербы Лопатаў, Быкоўскіх і князёў Масальскіх, герб "*Газдава*" Трызнаў (памылкова пададзеныя як "*Dryznowie*") і г.д. Праўда, Б.Папроцкі не заўсёды пазначаў з якога павету паходзіць той ці іншы род, часта проста выводзячы іх "*з Літвы*". Толькі пра Рэплінськіх ён піша дакладна: "*Replińscy w wołkowiskim powiecie w księstwie litewskiem*", ды пра аднаго з Юндзілаў пад гербам "*Лебедзь*" згадвае, што "*był jeden podkomorzym wołkowiskim, mężem znacznem*" [1, s.726, 851]. У цэлым, гербы ваўкавыскай шляхты ў "*Гербоўніку*" Б.Папроцкага прадстаўлены даволі сціпла. Тое ж можна сказаць і пра гербоўнік "*Orbis Polonus*" (Камянец, 1641–1645 г.) Ш.Акольскага. Пра гербы ваўкавыскай шляхты з яго можна даведацца няшмат.

Затое багата прадстаўлены гербы шляхты Ваўкавыскага павета ў рукапіснай працы "*Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego tak zwany Compendium*" (Вільня, 1658 г., выдадзены ў Варшаве ў 1897 г.) В.Каяловіча. Мы налічылі 30 ваўкавыскіх родаў з гербамі, з якіх 22 былі польскімі і толькі 8 – так званымі ўласнымі. Апошнімі карысталіся Карпы, Глінскія, Пукшты, Дольскія, Калантаі, Агінскія, Голубы і Вайніловічы. Сярод польскіх шляхецкіх гербаў найбольш распаўсюджанымі былі "*Лебедзь*" (Юндзілы, Шэметы, Гарадзельскія) і "*Лявіва*" (Дарагастайскія і Тышкевічы). Асаблівасцю працы В.Каяловіча з'яўляецца тое, што кожны згаданы ў гербоўніку род мае прывязку да канкрэтнага гербу. Пры гэтым большасць гербаў аўтар бачыў на ўласныя вочы, што значна падвышае вартасць "*Кампендыуму*". Тэрытарыяльная прапіска згаданай В.Каяловічам шляхты ВКЛ не заўсёды дакладна вызначана – называюцца і ваяводствы, і паветы. Магчыма, гэта было звязана з тым, што шмат хто меў свае ўладанні ў розных паветах. Так, напрыклад, пра Мінеўскіх гербу "*Нячуя*" В.Каяловіч піша: "*Miniewscy w kraju Wołkowyskim y Mozyrskim...*", але пра Якімовічаў гербу "*Дуброва*" адназначна сцвярджае, што яны жывуць у Ваўкавыскім павеце: "*Iakimowicze w Wołkowyskim powiecie*" [3, s.36, 182].

Характэрнай рысай гербоўніка В.Каяловіча з'яўляецца амаль поўная адсутнасць апісанняў уласных, пераважна клейнавых, гербаў шляхты ВКЛ, у тым ліку ваўкавыскай. Гэта сведчыць аб нераспрацаванасці мовы блазавання клейнавых гербаў у ВКЛ у сярэдзіне XVII ст. Так, пра герб Агінскіх аўтар піша: "*Ma być charakter takim kształtem, iako widzisz wyrażony...*" і такіх прыкладаў шмат [3, s.189, 249, 308, 320].

К.Нясецкі ў сваім гербоўніку Рэчы Паспалітай "*Korona Polska przy złotey wolności starożytnemi wszystkich kathedr, prowincyi i rycerstwa kleynotami ozdobiona...*" (Львоў, 1728–1743 г., перавыдадзены як "*Herbarz polski*" у Ліпску ў 1839–1845 г.) значна пашырыў веды пра ваўкавыскую шляхту, дадаўшы шмат новых родаў, якіх няма ў В.Каяловіча: Алендскіх, Ашмянцаў, Адамовічаў і іншых. Аднак, і ён з-за вялікага аб'ёму працы шмат каго прапусціў. Істотны недахоп працы К.Нясецкага – сярод узгаданых родаў даволі значная колькасць была пададзена нават без гербаў. Як, напрыклад, род Ашмянцаў: "*Ośmianiec, w powiecie Wołkowiskim*" [4, T.7, s.146]. Аўтар больш звяртаў увагу на інфармацыю гістарычнага і генеалагічнага характару, а не на гербы малавядомай яму павятовай шляхты.

Варта адзначыць таксама нешматлікія публікацыі аб гербах ваўкавыскай шляхты, якія абапіраліся на сфрагістычны матэрыял. Перш за ўсё гэта – праца польскіх даследчыкаў Віктара Вітыга і Станіслава Дзядулевіча "*Herby nieznaney szlachty polskiey*" (1908 г.) [10], дзе ўпершыню былі пададзены гербы Фёдара Лукашавіча (1614 г.) і Фёдара Грыгоравіча (1605 г.) Адамовічаў, Кандрата Ільіча Махайлы (1592, 1594 г.), Юрыя Масальскага (1616 г.), Яна Багданавіча Угліка (1604 г.) і інш. Праўда, малюнкі, якія пададзены там, не заўсёды дакладна перадаюць некаторыя гербавыя выявы. Часам пераблытаны і прозвішчы ваўкавыскай шляхты [11, s.146, 147].

Адзінкавыя гербы з пячатак ваўкавыскіх шляхцічаў друкавалі Юзаф Пузына [12], Уладзіслаў Сэмковіч і Станіслаў Кутшэба [13], Анатоль Цітоў [5], Аляксей Шаланда [14; 15].

Пры складанні павятовага гербоўніка важнае значэнне мае пытанне: каго можна лічыць ваўкавыскай шляхтай, бо, як ужо адзначалася вышэй, шмат хто меў свае маёнткі ў некалькіх паветах ВКЛ. Мы кіраваліся некалькімі крытэрыямі. Першы – адбыванне вайсковай службы пад ваўкавыскай павятовай харугвай і валоданне тут маёнткамі. Склад шляхты Ваўкавыскага павета ў XVI–пачатку XVIII ст. даволі поўна перадаюць: рэестры попісаў войска ВКЛ 1528 [16], 1565 і 1567 г. [17], попіс 1621 г. (гл. с.44–51), крыжапрыводная кніга 1655 г. [18] і падымны попіс 1690/1715 г. [19]. Ужо іх простае параўнанне дазваляе меркаваць, што па-першае, ваўкавыскую шляхту складалі нашчадкі княжацкіх дынастыяў, мясцовых баяраў і польскіх шляхецкіх родаў. Па-другое, даволі вялікую групу складалі ў павеце прышлыя роды, якія атрымалі тут землі з наданняў вялікіх князёў літоўскіх. Па-трэцяе, сталыя шляхецкія прозвішчы замацаваліся сярод мясцовага набілітэту толькі ў другой палове XVI–першай палове XVII ст. Другі крытэрый – ужыванне пасадаў і тытулаў звязаных з Ваўкавыскім паветам: намеснікаў, дзяржаўцаў, старостаў, гараднічых, харужых, лоўчых, стольнікаў і г.д.

З неапублікаваных крыніцаў у працы намі выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіву Беларусі ў Менску [20], Нацыянальнага гістарычнага архіву ў Горадні [9] і фондаў Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея [21]. У іх зборах намі была зроблена вялікая праца па выяўленню сфрагістычна-геральдычных помнікаў, іх абмеру, замалёўцы і апісанню. Да галоўных цяжкасцяў, з якімі пры гэтым прыйшлося сутыкнуцца, трэба аднесці: вялікую расцярушанасць ваўкавыскіх матэрыялаў[7], непрафесійную рэстаўрацыю дакументаў у архівах ў савецкі і ў наш час, калі адбіткі пячатак заклейваліся кавалкамі паперы, што зрабіла іх сёння невідочнымі і недаступнымі для даследчыкаў, ненавуковыя, а часам і памылковыя, назвы справаў, якія прыводзілі да вялікіх стратаў часу

[7] Гл., напрыклад: Брэгер Г., Лінская Л. Дакументальныя матэрыялы XVI–XVIII стст. у фондах Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі.// Беларускі археаграфічны штогоднік.– Мн., 2001.– Вып.2.– С.102–116. Пячаткі ваўкавыскай шляхты, якія там захоўваюцца (сярод іншых – Андрэя Адынца, Тамка Андрушковіча, Мацея Янавіча Вайніковіча, Лукаша Адамовіча і інш.), нам засталіся недаступныя.

на прагляд непатрэбных для нашай тэмы дакументаў. Выкарыстаныя намі крыніцы ўмоўна можна падзяліць на некалькі групаў:

1) *прыватныя лісты павятовай шляхты* (асабістыя, прадажныя, застаўныя, умацаваныя, дароўныя, падцвярджальныя, вяноўныя, зрачоныя, улеўковыя, квітацыйныя, кантракты і інш.) і *тэстаменты*. Гэта – найбольш каштоўныя для вывучэння шляхецкай геральдыкі Ваўкавыскага павета дакументы, бо ў другой палове XVI–першай палове XVII ст. яны маглі ўтрымоўваць ад 1 да 7 і нават болей адбіткаў гербавых пячатак выстаўцаў і сведкаў.

2) *лісты павятовых ураднікаў* – харужых, возных, генералаў, паборцаў (рэляцыйныя, інтрамісійныя, пабаровыя, абвяшчальныя і інш.). Як правіла, мелі адбіткі пячатак выстаўцаў і сведкаў (на лістах возных).

3) *выпісы з судовых кніг* (земскіх, гродскіх, каптуровых, сурагатарскіх, трыбунальскіх). Мелі адбіткі пячатак суддзі і падсудка (земскіх), старосты, падстаросты, суддзі і пісара (гродскіх), маршалка і суддзяў (каптуровых), сурагатара, пісара (трыбунальскага).

4) *інвентары* і *акты візытацыяў*. Мелі адбіткі пячатак выстаўцаў і сведкаў.

Прагляд згаданых вышэй дакументаў сведчыць, што пячаткі да іх прыкладаліся або адразу пасля іх складання, або – на раней падрыхтаваныя бланкі. У сувязі з гэтым, на практыцы магчымымі былі выпадкі, калі выстаўца мог прыкласці сваю пячатку некалькі разоў – за сябе і за сведкаў, або сведка мог зрабіць тое ж самае за выстаўцу, за сябе і за іншых сведкаў, або за выстаўцаў прыкладаў сваю пячатку нават атрымальнік дакументу. Нярэдка таксама жонка прыкладала да сваіх лістоў пячатку мужа. Асобна адзначым пячаткі войта і падстаросты на лістах мяшчанаў з Мсцібогава. Бланкі, якія рыхтаваліся заранёў, маглі быць запячатаны пячаткамі так званых "*прыяцеляў*". Характэрна, што апошнія часта нават не згадваюцца ў тэксце і сярод падпісантаў! Усё гэта робіць значна цяжэйшай ідэнтыфікацыю ўладальнікаў адбіткаў пячатак з гербамі. Некаторых, без вывучэння дадатковых крыніцаў, высвятліць на сённяшні дзень нам не ўдалося.

Усе знойдзеныя намі гербавыя пячаткі падзяляюцца на прыватныя і ўрадовыя (земскія, гродскія, трыбунальныя). Асаблівасцю апошніх у XVIII ст. з'яўляецца спалучэнне дзяржаўнай "*Пагоні*" з гербамі пісараў (земскага ці трыбунальнага) [5, с.50], або гербаў старосты і падстаросты, або гербаў старосты і пісара (на гродскіх пячатках).

***Метад выканання малюнкаў.***

Малюнкі гербаў ваўкавыскай шляхты зроблены намі з аўтопсіі з арыгінальных адбіткаў. Яны не з'яўляюцца дакладнымі прамалёўкамі (копіямі) адбіткаў з захаваннем усіх памераў (апошнія толькі падаюцца пры характарыстыцы пячатак), у сувязі з чым гэты бок працы не адпавядае патрабаванням публікацыі сфрагістычных помнікаў. Тлумачыцца гэта як аўтарскім правам архіваў і бракам адпаведных сродкаў, так і тым, што нашай мэтай было стварэнне менавіта гербоўніка, а не сфрагістычнага каталага. Увесь ілюстрацыйны матэрыял працы ўяўляе сабой аўтарскія рэканструкцыі гербаў. Іх якасць залежыць ад якасці адбіткаў, што адзначалася. Пры апісанні гербавых выяў выкарыстоўвалася як традыцыйная, так і распрацаваная намі тэрміналогія[8].

***Структура гербоўніка.***

Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ў другой палове XVI–XVIII ст. складзены ў алфавітным парадку па наступнай схеме:

[8] Гл.: Шаланда А. Польска-лацінскія моўныя ўплывы на беларускую геральдычную тэрміналогію.// Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: Гісторыя і сучаснасць: Зб.арт.– Гродна: ГрДУ, 1998.– С.419–423; яго ж: Да пытання класіфікацыі клейнавых гербаў шляхты ВКЛ.// Герольд Litherland.– Горадня, 2001.– №1.– С.34–37; яго ж: Паганскія вытокі клейнавых гербаў шляхты ВКЛ.// Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Мат-лы рэспуб. навук. канф.: У 4 ч.– Гродна: ГрДУ, 2003.– Ч.1.– С.190–196.

а) прозвішча і імя шляхціча, пасада або прыналежнасць да павета, год узгадкі ў дакуменце (калі падаюцца гербы некалькіх прадстаўнікоў аднаго роду, то выкарыстоўваўся храналагічны прынцып);

б) апісанне гербу, ініцыялаў і надпісаў у атоках пячатак;

в) апісанне самой пячаткі ці яе адбітка з пазначэннем крыніцы; калі знойдзена некалькі адбіткаў – крыніцаў з пазначэннем у дужках даты дакументу;

г) кароткая характарыстыка дакумента з адзначэннем уласнаручных подпісаў, калі такія былі (меньшым шрыфтам і курсівам);

д) дадатковая і дапаможная інфармацыя.

Прозвішчы ўсіх асобаў, гербы якіх падаюцца ў гербоўніку, вылучаны ў тэксце тлустым шрыфтам.

***Спіс скаротаў.***

У гербоўніку былі выкарыстаны наступныя скароты:

*адб.* – адбітак на кустодзеі,
*адб.н/п* – адбітак на паперы без кустодзеі,
*адв.пк* – адваротная прамакутная кустодзея,
*№1* – месца адбітка ў дакуменце з некалькімі пячаткамі,
*б/н* – без нумару (папка №1 з дакументамі Брыгіцкага гарадзенскага кляштара ў ГДГАМ),
*в* – выдатная захаванасць адбітка, якая дазваляе зрабіць поўную рэканструкцыю герба,
*вак* – выразаная ў аркушы кустодзея,
*вк* – вуглавая кустодзея,
*д* – добрая захаванасць адбітка, якая дазваляе зрабіць дакладную рэканструкцыю гербавай выявы,
*к* – кепская захаванасць адбітка, якая патрабуе праверкі зробленай рэканструкцыі гербавай выявы на больш якасным сфрагістычным матэрыяле,
*КП* – кніга паступлення,
*нак* – накладная адрэзаная кустодзея,
*пак* – паміжаркушовая кустодзея,
*пк* – прамакутная кустодзея,
*фк* – фігурная кустодзея,
*чрв/в* – адбітак на чырвоным воску,
*чрв/с* – адбітак на чырвоным сургучы,
*чрн/с* – адбітак на чорным сургучы.

# А.

## (1). **Агінскі Марцыян Аляксандр** з Казельска, ваявода троцкі, староста радашкоўскі, мсцібаўскі, рагачоўскі, дарсунішскі і сідрычынскі, 1675.



**Герб**: авальная картушовая тарча падзелена на пяць частак, у 1-ай у цэнтры на шчыце клейнавы знак накшталт нізкай “*П*”-падобнай падставы, на якой стаіць просты крыж з раздзёртым у котвіцу верхнім канцом (“*Агінец*”), у 2-ой – арол з раскіданымі крыламі, на грудзях якога падкова канцамі дагары з простым крыжам паміж імі, у 3-яй – два наканечнікі стрэлаў вастрыямі ўверх і ўніз, якія датыкаюцца канцамі (“*Багорыя*”), у 4-ай – падвойны крыжастрэл (“*Ліс*”), у 5-ай – месяц рагамі ўверх, паміж імі шасціпраменная зорка (“*Ляліва*”), над тарчай тры гелмы, у кляйноце сярэдняга тры пёры стравуса, правага – хвост паўліна, на тле якога арол з узнятымі крыламі трымае ў левай лапе падкову канцамі дагары з крыжам паміж імі, левага – паўлін трымае ў дзюбе пераламаную пасярэдзіне стралу, вакол тарчы намёт, надпіс у атоку: “+ *MARTIAN Z KOZIELSKA OGINSKI PALATIN TROCKI RADO: MSCIBO: DORS: ROHA: CA*”.

Пячатка: адб., пак, 40х45 мм, д [9, ф.128, воп.1, спр.13, а.3].

24 верасня 1675 г. у Росі Марцыян Аляксандр Агінскі, ваявода троцкі выдаў падцвярджальны ліст Андрэю Станіславу Шышмановічу, генералу Ваўкавыскага павета на пажыццёвае валоданне 2 валокамі грунту ў маёнтку Рось. Падпісаўся: "*Marcian Oginsky wda Trocky mp*".

Марцыян Аляксандр Агінскі (*1632 г., † 26 студзеня 1690 г.) быў сынам Аляксандра, ваяводы менскага і Кацярыны з Палубінскіх. У 1-м полі яго асабістага герба быў родавы "*Агінец*", у 2-м – герб маці "*Ястрабец*" зменены, у 3-м – герб бабкі Раіны (Рэгіны) Валовіч "*Багорыя*", у 4-м – герб "*Ліс*" бабкі па маці Зоф'і Сапегі. Па правілах у 5-м полі выява месяца з зоркай ("*Ляліва*") павінна была належаць да прабабкі па бацьку. Ёю была Кацярына Іванаўна Юрлоўна [25, s.293]. Герб перабежчыкаў з Масквы Пляшчэевічаў Юрловых у ВКЛ невядомы [26, T.VI, s.125; 27, T.IX, s.118; 28, с.195–197]. Наўрад ці ім была польская "*Ляліва*". Магчыма, не ведаючы гербу сваёй прабабкі па бацьку М.А.Агінскі ў 5-м полі змясціў герб сваёй жонкі – Марцыбэлы Ганны Глябовіч [25, s.300–301]. У гэтым выпадку яго асабісты складаны герб набываў характар шлюбнага гербу крэўнасці. Сярэдні кляйнот – тры пёры стравуса – адпавядаў родаваму гербу Агінскіх, правы – гербу маці з Палубінскіх, левы – гербу бабкі з Валовічаў.

Сучаснік Марцыяна Аляксандра В.Каяловіч у сваім гербоўніку герб князёў Агінскіх называў "*Агінец*" і размяшчаў гербавую клейнавую выяву ў чырвоным полі. Аднак, які быў колер самой выявы ён не згадвае. Верагодна, срэбны. У кляйноце В.Каяловіч верна змяшчаў тры пёры стравуса [3, s.189].

Выхадцы са Смаленскай зямлі князі Агінскія з'яўляюцца ў Ваўкавыскім павеце ў XVII ст. Галоўнымі іх уладаннямі тут былі Вялікая Лапеніца, Шурычы і Крапіўніца [30, с.78]. Адзін з іх – ***Грыгоры Антоні з Казельска Агінскі***, харужы вялікі ВКЛ у 1685–1691 г. быў ваўкавыскім судовым старостай [19, s.200].

У сваю чаргу, Марцыян Аляксандр Агінскі валодаў у Ваўкавыскім павеце Россю. Апошняя адышла да яго па 1674 г. пасля смерці ***Юрыя Караля Глябовіча*** на Дуброўне і Заслаўі, генеральнага старосты княства Жамойцкага і княжны Кацярыны Радзівіл Глябовічавай – бацькоў жонкі: "*...Tedy Ja zostawszy teraz possessorem po zeysciu oboyga Jchm tey Maiętnosci Rosi...* " [9, ф.1664, воп.1, спр.13, а.3; 31, с.515]. 15 мая 1684 г. стаў канцлерам ВКЛ [25, s.301]. Вядомы тым, што ў 1686 г. як прадстаўнік ВКЛ падпісаў мірны дагавор Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай. Герб "*Агінец*" канцлера Марцыяна Аляксандра Агінскага быў змешчаны нават на маестатавай пячатцы ВКЛ, вырабленай у тым жа годзе спецыяльна для падпісання "*трактата Грымултоўскага*" [35, s.64]. Не ўжываў княжацкага тытулу, затое пісаўся з 1684 г. "*графам на Дуброўне*" [25, s.300–301].

## (2). **Агінскі Марцыян Міхал** з Казельска, ваявода віцебскі, маршалак Генеральнай канфедэрацыі правінцыі ВКЛ, барысаўскі, перавальскі, вярбоўскі староста, 1734.



**Герб**: на авальнай картушовай тарчы клейнавы знак накшталт "*П*"-падобнай падставы на выгнутых ножках з вострымі канцамі, на якой стаіць просты крыж з раздзёртым у котвіцу верхнім канцом ("*Агінец*"), тарча ляжыць на княжацкім плашчы пад княжацкай мітрай.

Пячатка: адб. №1, чрв/с, 25х26 мм, в [9, ф.1664, воп.1, спр.594, а.1].

10 жніўня 1734 г. у абозе на Ваўкавышчыне Марцыян Міхал Агінскі, маршалак Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ і ***Антоні Пацей***, стражнік вялікі і генеральны войскаў ВКЛ выдалі ліст, паводле якога маёнтак Лыскаў ксяндза ***Яна Быхаўца***, каноніка віленскага, плябана лыскоўскага, пробашча воўпенскага вызваляўся ад усіх жаўнерскіх пабораў. Падпісаўся: "*Marcian Oginski wda Wbski Marszałek Gen Konfed WXLitt*".

Марцыян Міхал Агінскі (*1672 г., † 2 красавіка 1750 г.) быў сынам Шымана Караля Агінскага, мечніка ВКЛ, падкаморыя віцебскага і Тэадоры з Корсакаў. У сваю чаргу Шыман Караль прыходзіўся згаданаму вышэй ***Марцыяну Аляксандру Агінскаму***, ваяводзе троцкаму і канцлеру ВКЛ стрыечным братам [25, s.304, 322].

Сучаснік Марцыяна Міхала К.Нясецкі апісваў герб Агінскіх так: "*Павінна быць абозная брама, а на яе версе крыж раздзёрты, над гелмам княжацкая мітра*" [4, T.7, s.48]. Пры гэтым ён спасылаўся на рукапіс В.Каяловіча, але той нічога не пісаў пра "*браму*". Перад намі тыповы прыклад натуралізацыі і міфалагізацыі гербавай клейнавай выявы. Магчыма, К.Нясецкі быў адным з аўтараў гербавага міфа Агінскіх, падзяліўшы клейнавы знак на "*браму*" і раздзёрты крыж. Тэма "*брамы*" была ім далей развіта так: "*Герб гэты набыты з той аказіі, што, калі татары браму ў абозе праламалі, продак гэтага дому спрычыніўся да перамогі, бо з ім князі рускія татараў выгналі і збілі*" [4, T.7, s.48–49]. Цікава, што К.Нясецкі падае і варыянт натуралізацыі раздзёртага крыжа. Так, ён прыводзіць меркаванне "*некаторых*", што замест яго павінна быць белая лілія "*w cyrkule złotym listki*" [4, T.7, s.49]. "*Herbowna Oginskich Brama*", ужо як устойлівы зварот, згадваецца ў казанні ксяндза Міхала Пашкевіча на смерць трэцяй жонкі Марцыяна Міхала Крыстыны Абрамовіч († 14 ліпеня 1738 г.), выдадзеным у Вільні ў 1739 г. [36, a.A].

Больш важнае значэнне мае інфармацыя К.Нясецкага пра колеры гербу Агінскіх: "*Як мне прыйшлося бачыць на розных месцах, брама павінна быць чырвоная, крыж белы, поле тарчы блакітнае*" [4, T.7, s.49]. Такім чынам, у XVIII ст. адбылася змена колераў родавага гербу князёў Агінскіх, а замест пёраў у кляйноце

замацавалася княжацкая мітра. Апошняя сімвалізавала княжацкае паходжанне роду (у творы ксяндза М.Пашкевіча продкам Марцыяна Міхала Агінскага называецца кіеўскі князь Уладзімір Святаслававіч: “*...sladem Wielkiego Włodzimierza protoplasta...*” [36, а.А адв.], тым самым князі Агінскія адносіліся да дынастыі Рурыкавічаў). Цікава, што сам Марцыян Міхал не ўжываў княжацкага тытулу [25, s.322–323].

## (3). **Адамовіч Грыгоры**, шляхціч Ваўкавыскага павета, 1589.



**Герб**: на тарчы клейнавы знак накшталт літары “*Д*” або лігатуры “*АД*”, над тарчай ініцыялы: “*ГРN[горий]*”.

Пячатка**:** адб. №2, вак, 13х15 мм, в [9, ф.1664, воп.1, спр.572, а.1 адв.; 15, с.190, мал.2].

8 сакавіка 1589 г. Грыгоры Адамовіч, як сведка і печатар, прыклаў два разы сваю пячатку на вызнаным квіце вознага Ваўкавыскага павета ***Аляксея Кобызя***. Другім сведкай быў Ілля Адамовіч, відаць, нейкі крэўны Грыгора, што тлумачыць падвойнае прыкладанне апошнім сваёй пячаткі. Цікава, што Грыгоры і Ілля Адамовічы згадваюцца разам як сведкі ўжо ў 1556–1557 г. у справе Малгарэты Чыжоўны з ваўкавыскімураднікам Войцехам Карэйвічам [32, T.21, c.193]. Сталы сумесны іх удзел у розных справах дазваляе думаць, што гэта былі родныя браты. У попісе войска ВКЛ 1567 г. 3 лістапада запісаўся “*Илья Адомовичъ з Лопеници з дыму кляча, кор.[д]*” [31, с.62].



Вельмі падобны на герб Грыгора Адамовіча быў, калі верыць В.Вітыгу і С.Дзядулевічу, герб з пячаткі 1596 г. нейкага Няхведковіча Фёдара Адамавіча, ваўкавыскага зямяніна [10, s.215]. Здаецца, аднак, што польскія даследчыкі памыліліся ў вызначэнні прозвішча Фёдара. Быў ён з роду Адамовіч, а па бацьку – Няхведкавіч. Так, 1 студзеня 1570 г. сярод сведкаў у прадажным лісце Юрыя Янавіча Баглаевіча на чалавека для Марціна Стэцкевіча, пісаным у Межырэчы, згадваецца Лянько Адамовіч і “*...брат его Мехведко и з сыном своим Михайлом...*” [9, ф.1664, воп.1, спр.498, а.1]. Згаданы Мяхведка (Няхведка, Няфед, Мяфед) быў бацькам не толькі Міхайлы, але і Фёдара. У сувязі з гэтым, звяртае на сябе ўвагу яшчэ адзін Няфёдавіч Грыгоры Адамавіч, ваўкавыскі зямянін, які, паводле тых жа В.Вітыга і С.Дзядулевіча, карыстаўся ў 1592 г. пячаткай з уласным клейнавым гербам: *на тарчы крыжастрэл вастрыём дагары, які прашывае дугу скіраваную канцамі ўніз, пры гэтым яго перакрыжаванне знаходзіцца над хрыбтом дугі* [10, s.216]. На нашу думку, быў ён братам Міхайлы і Фёдара і ідэнтычны з Грыгорам Адамовічам, сведкай з 1589 г. Пытанні выклікаюць толькі розныя яго гербы на пячатках з 1589 і 1592 г. Калі гэта не памылка В.Вітыга і С.Дзядулевіча, якія пераблыталі пячаткі Фёдара і Грыгора Няхведкавічаў Адамовічаў, падобную з’яву можна патлумачыць толькі клейнавым характарам гербавых выяваў. Справа ў тым, што пры жыцці бацькі нявыдзеленыя сыны маглі карыстацца толькі яго кляйном (пячаткай). Калі яны выдзяляліся, тады яны павінны былі ўзяць уласны знак (пячатку) [5, с.111].



Рэдкае імя бацькі Міхайлы, Фёдара, Грыгора і Іллі Мяхведкавічаў Адамовічаў дазваляе выказаць меркаванне, што іх дзедам быў запісаны ў попісе войска ВКЛ 1528 г. разам з Марцінам Адамовічам “*Мефедко Кузмичъ самъ*” [16, с.98]. Лянько Адамовіч, баярын гаспадарскі ваўкавыскі, першы раз згадваецца як сведка ў справе братоў Яна і Мікалая Вайцяшковічаў са Станіславам Збожным, намеснікам зэльвенскім у 1540 г. [33, s.164].

Цяжка сказаць, каго мелі на ўвазе В.Вітыг і С.Дзядулевіч пад Фёдарам Грыгоравічам Адамовічам гербу “*Вагі*”, які ў 1605 г. быў каморнікам Ваўкавыскага павета [10, s.19]. Ці быў гэта сын згаданага вышэй Грыгора Адамовіча з уласным гербам, ці гэта зноў нейкая памылка. На карысць апошняй сведчыць факт, што ваўкавыскім каморнікам у 1592–1607 г. быў ***Фёдар Лукашавіч Адамовіч*** [15, с.187].

## (4). **Адамовіч Фёдар Лукашавіч**, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, 1614.



**Герб**: на тарчы месяц рагамі дагары, над ім шасцікутная зорка (“*Ляліва*”), над тарчай ініцыялы: “*F[iedor] A[damowicz]*”.

Пячатка: адб. №2, вак, 13х14 мм, в [9, ф.1664, воп.1, спр.328, а.4; 15, с.190, мал.3].

30 мая 1614 г. Настазыя Аляксандраўна Адамовіч і яе муж Крыштаф Пятровіч Калупайла Рудзеўскі прадалі Фёдару Лукашавічу Адамовічу за 9 копаў грошаў літоўскіх яе частку маёнтка Стокі (Істокі). Да свайго прадажнага ліста яны два разы прыклалі пячатку з гербам “*Ляліва*”, якая належала ...пакупніку! Апошні прыходзіўся Настазыі родным дзядзькам [15, с.187], што і тлумачыць выкарыстанне яго пячаткі, а хутчэй бланку з раней адбітымі пячаткамі. Сярод сведкаў былі ваўкавыскія зямяне: ***Геранім Андрэйковіч***, ***Эразмус Зелянеўскі***, Марцін Кінтаўт, ***Адам Лопат***, Якуб Ракоўскі і ***Мікалай Цывінскі***.



Польскія даследчыкі В.Вітыг і С.Дзядулевіч на дакуменце Фёдара і Рамана Лукашавічаў Адамовічаў з 1614 г. бачылі зусім іншы герб: *на тарчы месяц рагамі ўніз, праз які праходзіць доўгі лацінскі крыж вяршыняй дагары з заламаным у левы бок ніжнім канцом* [10, s.19]. Быў гэта ўласны клейнавы герб Фёдара Лукашавіча Адамовіча, які нечым нагадваў герб Грыгора Няфёдавіча Адамовіча.

Бацька Фёдара – Лукаш Адамовіч, акрамя яго меў яшчэ дзвух сыноў: Рамана, Аляксандра і дачку Марыну. Раман Адамовіч з невядомай жонкай меў пяць дачок: Марыну Дзярэўніну, Гальшку Яскольдаву, Крыстыну Дружкевічаву, Зоф'ю, Ганну і пяць сыноў: Мікалая, Лукаша, Яна, Паўла і Андрэя. Аляксандр – сына Яна і пяць дачок: Апалонію замужам за Янам Багушэвічам, Марыну – за Мацеям Кулешам, Настазыю – за Крыштафам Калупайлам Рудзеўскім, Раіну і Зоф'ю [15, с.187].

Фёдар Лукашавіч Адамовіч першы раз згадваецца ў попісе ваўкавыскай харугвы войска ВКЛ 1565 г.: "*Фёдор Адамовичъ конь в пан[ыри]., в пр[илбицы]., з шаблею*" [17, с.94–97]. 20 лістапада 1615 г. разам з жонкай Ганнай Стэфанаўнай Ванькевіч ён падараваў сыну ***Андрэю Фёдаравічу Адамовічу*** свой маёнтак у Манцяках, які яны купілі ў братоў Мацея і Войцеха Вайнікевічаў (Вайнікаўшчызну) [9, ф.1664, воп.1, спр.328, а.1]. 10 мая 1617 г. Фёдар у Істоках (Стоках) напісаў тэстамент, у якім прасіў жонку пахаваць яго або пры царкве Чэснага Крыжа "*на Истоце*", або пры царкве ў Лыскава. Сваю частку маёнтка "*отчизного*" на Істоку ў Ваўкавыскім павеце, а таксама грунты Баглаеўскай зямлі – Мінцоўшчыну, "*...которая то земля от пана Яна и пана Жикгимонта Пукштов за земли наши отчизные в Петухове отменою нам зостала...*", запісаў пажыццёва жонцы, а пасля яе смерці – сынам. Меў іх чатыры: Яна, Грыгора, Паўла і Андрэя, "*...который тепер при нас мешкает, а тых трех нет, бо от часу немалого ехали служить и не слыхамы о них где ест...*". Менавіта першым траім, "*...як явятся з службы...*" і павінен быў перайсці са згоды маці ў роўны падзел маёнтак Істокі (Стокі), а Андрэю – купны маёнтак Ялава ў Манцяках. Апошняму перадавалася і апека над часткай маёнтка ў Істоку дзяцей брата Фёдара – Аляксандра Лукашавіча Адамовіча – дачок паннаў Раіны, Зоські і "*...сына одного Яска, который за навеженем Божим на всем упал ани розуму, ани здоровя на очи не мает...*". Акрамя гэтага, у апеку Андрэю перадаваўся і маёнтак у Манцяках Юрыя Адамавіча Аляхновіча – унука сястры Фёдара Марыны Ленартавай Аляхновічавай. Акрамя сыноў Фёдар пакінуў чатыры дачкі: Раіну замужам за Андрэям Дароўскім з Наваградскага павета, Алену – за Фёдарам Перавалоцкім са Слонімскага павета, Марыну – за Паўлам Мізгірам з таго ж павета і панну Ганну, якой запісаў пасагу 40 копаў грошаў літоўскіх. Падпісаўся: "*Федор Адамович своею рукою подписал*" [9, ф.1664, воп.1, спр.310, а.1–2 адв.].

Захаваўся дакумент, які дазваляе аднавіць нават партрэтныя рысы Ф.А.Адамовіча. 5 кастрычніка 1585 г. ён падаў скаргу ў Ваўкавыскі земскі суд "*…иж дей дня нинешнего [5.X] в суботу тут в месте ... Волковыйском стоял есми з людми добрими шляхтою на ринку розмовячи а пан Станислав Еронимович Пукшта Клявзкгелович хоружий повету Волковыйского бывши на обеду в его млсти пана Крыштофа Волского дворанина Его королевское млсти и на учту в господе тут в месте Волковыйском в дому мещанки Рудское и оттул вышедши з господы пан хоружий ... где я з оными людми добрими напротив дому ... стоячому межы тыми людми ... ся рутил и рукою на губу мою киваючи мовил похвалку чинечи ведай о том же ся будеш в руках моих крутил як вехер сломанный а за тыми словы его зараз слуга его при нем стоячи до мене и до бороды моей бы хотячи мя бит рутил я дей будучи небезпечон за такою похвалкою от пана хоружого здоровя своего тое на врад ... оповедане свое доношу…*" [9, ф.1664, воп.1, спр.497, а.1]. Відаць, барада закрывала пакалечаную губу – шнар ад удару шаблі.

Першым перайшоў да карыстання польскім гербам "*Ляліва*", пра што сведчыць ўжыванне Фёдарам Лукашавічам Адамовічам у адзін год дзвух пячатак – з уласным клейнавым гербам і польскім. Падобная дзвухгербавасць дазваляе меркаваць аб гербавай адопцыі, якая адбылася ў гэты час. Яе механізм у пэўным сэнсе раскрывае радавод гэтай галіны роду Адамовічаў. Справа ў тым, што праз шлюб роднай сястры Фёдара – Марыны Лукашаўны з ***Ленартам Марцінавічам Аляхновічам***, Адамовічы парадніліся з Аляхновічамі гербу "*Ляліва*", якія вялі свой радавод ад крэўнага ваяводы віленскага Альберта Манівіда – Рымавіда[9] [15, с.188]. Сам Альберт Манівід, як вядома, атрымаў "*Ляліву*" ў 1413 г. у Горадлі [34, s.14]. Цікава, што ў першай палове XVII ст. узнікла нават легенда аб тым, быццам бы заснавальніку роду Адамовічаў – Адаму за рыцарскія заслугі згаданы Манівід дазволіў карыстацца сваім гербам і нават сам кароль Уладыслаў Ягайла нібыта падцвердзіў гэты акт адопцыі [15, с.187]. Упершыню гэтае паданне сустракаецца ў гербоўніку Ш.Акольскага (1643 г.) [2, T.2, s.92]. Пасля яно было паўтарана ў творах В.Каяловіча пры Адамовічах Старавольскіх[10] [3, s.136] і К.Нясецкага [4, T.2, s.13–14]. На нашу думку, гэта сведчыць аб тым, што Адамовічы паходзілі з мясцовага ваўкавыскага баярства.

## (5). Адамовіч Андрэй Фёдаравіч*[11], зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага і Вількамірскага паветаў, 1650.



**Герб**: на тарчы месяц рагамі дагары, зорка над ім зацёртая ("*Ляліва*"), над тарчай ініцыялы: "*D[A?]*".

Пячатка: адб. №1, вак, 14x17 мм, к [9, ф.1664, воп.1, спр.722, а.1].

20 лютага 1650 г. у Манцяках Андрэй Фёдаравіч Адамовіч і яго жонка Гальшка Янаўна Краеўская выдалі ўмацаваны ліст свайму сыну Яну Адамовічу, паводле якога ён павінен быў прадстаўляць бацьку (цяжка хворага апошнія 10 гадоў) у судзе земскім Вількамірскага павета па справе аб

[9] Ад яго паходзілі Забярэзінскія і Монвіды Дарагастайскія гербу "*Ляліва*" [34, s.22–23].

[10] Да гэтага роду ім быў аднесены і вядомы культурны дзеяч Рэчы Паспалітай Шыман Старавольскі [3, s.136].

[11] Зорачкай пазначаны асобы, якія карысталіся пячаткамі з чужымі ініцыяламі.

падзеле маёнткаў Падракішкі, Людзіны і Панядзель нябошчыка цесця Яна Краеўскага з Кацярынай Янаўнай Краеўскай Станіслававай Туроўскай і Ганнай Янаўнай Краеўскай Крыштафовай Левальт Язерскай. Ліст падпісаў разам з жонкай па-польску (захавалася толькі "*Moc ...do prawa ...własnq*" і "*Halzbieta Kraiewska Andrzeiowa Adamowiczowa do tey mocy potpisała rekę swą własnq*"). Сярод сведкаў згадваюцца Станіслаў Бутаўт Андрэйковіч і Марцін Пацкевіч.

Каму належалі кепска захаваныя на пячатцы ініцыялы – цяжка вызначыць. Адназначна толькі трэба выключыць з ліку прэтэндэнтаў на іх згаданых у лісце сведкаў. Відаць, зноў мела месца ўжыццё раней падрыхтаванага бланку з ужо адбітымі на ім пячаткамі. Звяртае на сябе ўвагу тое, што першая з іх была з гербам "*Ляліва*". На нашу думку, гэта не выпадкова. Андрэй Фёдаравіч Адамовіч выкарыстаў пячатку нейкага свайго сукляйнотніка – прадстаўніка аднаго з ім гербавага роду.

А.Ф.Адамовіч быў удзельнікам паходу ў Інфлянты ў 1621 г. (гл.с.47) і, як вынікае з атэстацыйнага ліста польнага гетмана ВКЛ Крыштафа Радзівіла, князя на Біржах і Дубінках ад 4 лютага 1622 г., з'яўляўся таварышам роты пана Дыянізыя Цыртаўта [9, ф.1664, воп.1, спр.308, а.1–2]. Як скарбовы дваранін згадваецца ў лісце ад 18 ліпеня 1637 г. Стэфана Паца, земскага падскарбія і пісара ВКЛ [9, ф.1664, воп.1, спр.849, а.1].

13 снежня 1650 г. у Манцяках напісаў тэстамент (актыкаваны ў кнігах земскіх ваўкавыскіх 25 студзеня 1651 г.). Быў спачатку праваслаўным, пасля перайшоў у каталіцтва, "*...według wiary mey prawdziwey katholickiey w ktorey umieram...*", прасіў жонку пахаваць сябе ў царкве Чэснага Крыжа ў Зельдзіне пры бацьках. Маёнткі свае Манцякі Яловыя, Ленартаўшчызну і Майкаўшчызну ў Ваўкавыскім павеце запісаў пажыццёва жонцы, а пасля яе смерці – сынам Яну (у 1655 г. склаў прысягу маскоўскаму цару: "*Ян Ондреев сын Адамовичь*" [18, с.84], у 1685 г. – гараднічы Ваўкавыскага павета), Казімеру (жонка Аляксандра Ўрачынская), Андрэю і Паўлу ў роўны падзел, а 1/3 частку маёнтка Падракішкі ў Вількамірскім павеце раіў прадаць, а грошы выдаць на пасаг для дачкі Цэцыліі. Акрамя апошняй меў яшчэ чатырох дачок: Кацярыну замужам за Францішкам Снарскім, Марыну – за Марцінам Пацкевічам (сведкай), Еву – за Андрэям Яцкевічам з Лідскага павету і панну Ганну. Падпісаўся: "*Ten testament moy Andrzey Adamowicz ręką własną podpisał*" [9, ф.1664, воп.1, спр.310, а.3 адв.–5 адв.]. Нашчадкі А.Ф.Адамовіча пісаліся "*Адамовічамі Ялоўскімі*" [9, ф.1664, воп.1, спр.691, а.1 адв.; 15, с.189].

## (6). **Алендскі Януш**, цівун гінтылішскі Жамойцкай зямлі, 1575.



**Герб**: на тарчы мядзведзь, які ідзе, на ім сядзіць панна з узнятымі рукамі ("*Равіч*"), над тарчай гелм без кароны, вакол тарчы намёт, над гелмам ініцыялы: "*I[anusz] ◦ O[lendski]*".

Пячатка: адб. №2, вак, 11х16 мм, в [20, ф.694, воп.4, спр.823, а.52].

24 сакавіка 1575 г. у Ваўкавыску Януш Алендскі, як сведка і пячатар, прыклаў сваю пячатку да дароўнага ліста Ганны Себастыянаўны Дыбоўскай.

Мазавецкі род Алендскіх спачатку перасяліўся на Падляшша, а пасля – у Ваўкавыскі павет. Паводле Б.Боўфала, яшчэ бацька Януша – Станіслаў у 1527 г. атрымаў за свае заслугі ад Жыгімонта Старога маёнтак Хруства ў Ваўкавыскім павеце, які складаўся з вёсак Шэйбакоўскае, Дворац, Яманты, Калоны і Лапеніца, а ў 1529 г. фундаваў алтарыю ў Мсцібогаве. Памёр Станіслаў Алендскі недзе да 1533 г., пакінуўшы дзвух дачок і чатырох сыноў: Станіслава, Крыштафа, згаданага Януша і Юрыя. Ад Януша і пайшла галіна Алендскіх гербу "*Равіч*" у ВКЛ [22, s.249].

Януш Алендскі, староста судовы браньскі (1565 г.), цівун плятэльскі на Жамойці (да 1575 г.), пан на Хруставе ад 1574 г. трымаў заставаю ад князя Шчаснага Яраславіча Галаўчынскага і яго жонкі Альжбеты Хадкевіч маёнтак Мачульна ў Ваўкавыскім павеце з дваром Гнезна, а ў 1578 г. набыў яго ва ўласнасць. Вызнаваў кальвінізм. З Ганнай Грыгораўнай Трызнай пакінуў дзве дачкі Кацярыну, Галену і дзвух сыноў Яна († 1614 г., без нашчадкаў) і ***Крыштафа Янушавічаў Алендскіх*** [22, s.257].

Здзіўляе адсутнасць у гербе Януша Алендскага кароны і кляйноту. Б.Папроцкі апісваў герб "*Равіч*" так: "*Ma być panna rozczesana w koronie, ręce rozszerzone mając, na niedźwiedziu czarnym siedzi w polu żołtem*" [1, s.539], а ў кляйноце – паміж рагамі аленя палова чорнага ўзнятага мядзведзя з чырвонай ружай у лапе [37, s.135].

## (7). **Алендскі Крыштаф Янушавіч**, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, 1597.



**Герб**: на тарчы мядзведзь, які ідзе, на ім сядзіць панна ў кароне з разведзенымі ў бакі рукамі ("*Равіч*"), над тарчай гелм з каронай, у кляйноце два сцягі, якія трымае лапамі скіраваная ўлева палова мядзведзя ў ашыйніку (?), вакол тарчы намёт, па баках сцягоў ініцыялы: "*K[rzysztof] O[lendski]*".

Пячатка: адб. №3, вак, 15х18 мм, д [21, КП б/н, а.2].

12 чэрвеня 1597 г. у Крамяніцы Крыштаф Алендскі, як сведка і пячатар, прыклаў сваю пячатку да дароўнага ліста ***Крыштафа Мікалаевіча Вольскага*** на Крамяніцы, падстолія ВКЛ, цівуна паюрскага і падпісаўся: "*Kryszthoff Olendski Ręką swą*".

Яшчэ 12 лістапада 1580 г. падзяліў з братам Янам[12] бацькоўскія маёнткі, атрымаўшы Гнезна, Хрустава і пляц у Ваўкавыску. Акрамя гэтага на падставе прывілеяў Стэфана Баторыя ад 1585 г. і Жыгімонта III Вазы ад 1593 г. меў пэўныя ўладанні ў Ваўкавыскім старостве. У 1602 г. ад таго ж Жыгімонта Вазы за заслугі перад Айчынай атрымаў прывілей на вёскі Дзякі і Жылічы ў тым жа Ваўкавыскім старостве пажыццёвым правам. 22 кастрычніка 1602 г. напісаў тэстамент, пасля чаго хутка памёр. З жонкай Ганнай Есьман пакінуў дзве дачкі і чатырох сыноў: Яна († 1649 г.), ***Крыштафа***, ***Юрыя*** і Мікалая ***Крыштафавічаў Алендскіх*** [22, s.257–258; 40, с.145].

У гербе К.Я.Алендскага адразу звяртае на сябе ўвагу адмысловы кляйнот: палова мядзведзя ў ашыйніку (?), які трымае два сцягі. Наколькі можна меркаваць (клейнот захаваўся на адбітку пячаткі горш за фігуру на тарчы), згаданая выява была перароблена з клясічнага кляйноту "*Равіча*". Мядзьведзь згубіў ружу, зніклі рогі, затое з'явіліся два сцягі і ашыйнік. Магчыма, гэта быў жамойцкі мядзведзь. Паводле Б.Папроцкага ў 1578–1584 г.: "*Зямля Жамойцкая ўжывае чорнага мядзведзя ў белым ашыйніку на чырвоным полі*" [1, s.919]. Характар кляйноту не пакідае сумненняў, што ён быў нададзены або непасрэдна К.Я.Алендскаму, або каму іншаму з яго рода, як ганаровае адрозненне ў родавы герб за нейкія заслугі.

## (8). Алендскі Крыштаф Крыштафавіч, суддзя земскі Ваўкавыскага павета, 1638.



**Герб**: тарча падзелена на чатыры часткі, у 1-ай відаць толькі галаву мядзведзя ("*Равіч*"), у 2-ой – выява зацёртая, ў 3-яй – падвойная лілія ("*Газдава*"), у 4-ай – тры ўрубы ("*Карчак*"), над тарчай гелм, у кляйноце палова льва трымае лапамі два сцягі, вакол тарчы намёт, надпіс у атоку: "* *KRZYSZTOF [O]LENDSKI ◦ SED[ZIA] ZIEMSKI ◦ WOLKOWYSKI*".

Пячатка: адб. №1, вак, 24x30 мм, к [21, КП б/н, а.6; 9, ф.1664, воп.1, спр.335, а.1 адв. (1649)].

8 чэрвеня 1638 г. у Ваўкавыску земскі суд у складзе: Крыштаф Алендскі, суддзя, ***Юры Алендскі***, падсудак і Даніэль Аўсяны, пісар, выдаў відымус з кніг вячыстых земскіх Ваўкавыскага павета выпісу з тых жа кніг за 18 студзеня 1601 г. з тэстаментам ***Крыштафа Мікалаевіча Вольскага*** на Крамяніцы, падстолія ВКЛ, цівуна паюрскага.

Сын ***Крыштафа Янушавіча Алендскага*** і Ганны Есьман. У 1648 г. быў паслом на элекцыйны сойм, дзе прагаласаваў за Яна Казмера Вазу, ужо ў 1617 г. згадваецца як стольнік, а ў 1650 г. – як падкаморы ваўкавыскі, староста дзяцкі і жыліцкі. На попіс ваўкавыскай шляхты ў 1621 г. ставіў 8 коней, з якіх 3 "*...з жадання і з міласці да Бацькаўшчыны...*" (гл.с.45). У 1655 г. "*Хриштоп Хриштопов сын Оленской, подкоморье Вол[ков]иц[кий]*" прысягнуў у ліку ваўкавыскай шляхты маскоўскаму цару Аляксею Міхайлавічу Раманаву [18, с.76]. Яшчэ ў 1646 г. Крыштаф Крыштафавіч Алендскі набыў у Ганны Зарэмбы Юрынай Мінеўскай маёнткі Сяркі, Жалтаўшчызна і Мілеўшчызна. 2 снежня 1669 г. напісаў тэстамент, з невядомай жонкай не пакінуў нашчадкаў. Усе свае маёнткі запісаў сыну брата ***Юрыя Крыштафавіча Алендскага*** – Тэафілу [22, s.258; 40, с.145].

У другім полі яго складанага герба павінны быць тры ўрубы ("*Карчак*") – герб маці (гл.ніжэй). Зноў здзіўляе кляйнот гербу. Як можна было спадзявацца, там павіненна была быць між сцягоў бацькава палова мядзьведзя ў ашыйніку. Але замест яе бачым палову льва. Такі ж кляйнот быў і ў гербе яго роднага брата Юрыя.

## (9). Алендскі Юры Крыштафавіч, падсудак земскі Ваўкавыскага павета, 1638.



**Герб**: тарча падзелена на чатыры часткі, у 1-ай – "*Равіч*", у 2-ой – "*Карчак*", у 3-яй – "*Газдава*", у 4-ай – зноў "*Карчак*", над тарчай гелм з каронай, у кляйноце палова льва трымае лапамі два сцягі, вакол тарчы намёт, па баках кляйнота ініцыялы: "*I[erzy] O[lendski]*"

Пячатка: адб. №2, вак, 25x30 мм, д [21, КП б/н, а.6; 9, ф.1664, воп.1, спр.335, а.1 адв. (1649), спр.587, а.1 (1650)].

Разам з ***Крыштафам Крыштафавічам Алендскім*** прыклаў сваю пячатку да відымусу ад 8 чэрвеня 1638 г. з тэстаментам ***Крыштафа Вольскага*** на Крамяніцы, падстолія ВКЛ, цівуна паюрскага.

Сын ***Крыштафа Янушавіча Алендскага*** і Ганны Есьман, родны брат Крыштафа Крыштафавіча Алендскага, суддзі земскага ваўкавыскага. Разам з апошнім ставіў на попіс войска ВКЛ у 1648 г. 50 коней па-

[12] Ян Алендскі атрымаў у спадчыну Дворац пад Мсцібогавым, Яманты, Калонны, Лапеніца, пляц і дом у Мсцібогаве. Паміраючы без нашчадкаў адпісаў усе свае маёнткі сынам брата Крыштафа [22, s.257; 40, с.144–145].

казацку. Пасол на сойм 1646 г., пасля намінацыі брата на ваўкавыскае падкаморства, 20 верасня 1650 г. быў прызначаны на пасаду суддзі земскага Ваўкавыскага павета [22, s.258–259]. У 1655 г. разам з братам "*Юрье Хриштопов сын Оленский, судья земский волковицкий*" прысягнуў маскоўскаму цару Аляксею Міхайлавічу Раманаву [18, с.76]. З жонкай ***Юстынай Быхавец*** меў дзве дачкі: Марыяну замужам за Янам Храпковічам, Кацярыну – за Казімерам Сцыпіёнам дэль Кампа, і пяць сыноў: Мікалая, Крыштафа, Тэафіла († у пачатку 1708 г.), Дыяніза і Юрыя [22, s.261, 264; 40, с.146].

Складаны чатырохчастковы герб Юрыя Алендскага, як і яго брата Крыштафа Крыштафавіча Алендскага, меў: у 1-ай частцы – родавы "*Равіч*" зменены, у 2-ой – "*Карчак*" маці Ганны Есьман, у 3-яй – "*Газдаву*" бабкі па бацьку Ганны Трызны, у 4-ай – зноў "*Карчак*" невядомай бабкі з маці [22, s.257–258]. Кляйнот быў ідэнтычны братаваму. Верагодна, леў у кляйнот быў нададзены за Смаленскую вайну 1632–1634 г., у якой Юры браў актыўны ўдзел. Менавіта пад час Смаленскага паходу ён атрымаў ад Уладыслава IV Вазы прывілей на ваўкавыскае падсудкоўства (1633 г.) [40, с.145].

## (10). **Алендскі Крыштаф**, староста судовы ваўкавыскі і войт поразаўскі, дзяржаўца навадворскі, 1712.



**Герб**: на тарчы мядзведзь, які ідзе, на ім сядзіць панна з разведзенымі ў бакі рукамі з каронай на галаве, над тарчай шляхецкая карона, у кляйноце палова панны ў кароне[13] з разведзенымі рукамі, вакол тарчы арматура са сцягоў, дзідаў, гарматаў, надпіс у атоку захаваўся часткова: *"+ KRZISTOPH ◦ OL[ENT]SKI ◦ STAROSTA ◦ P ◦ WOŁKOWYSKIEGO ◦ 1710"*.

Пячатка: адб., фк, 45х50 мм, д [9, ф.1664, воп.1, спр.873, а.11; спр.835, а.2 (1714)].

9 чэрвеня 1712 г. пад пячаткай Крыштафа Алендскага быў выдадзены відымус з кніг гродскіх Ваўкавыскага павету са справай Людвіка Заблоцкага, ваўкавыскага скарбніка і адміністратара з ксяндзом ***Янам***, канцлерам віленскай дыяцэзіі, пробашчам і плябанам воўпенскім, ***Уладзіславам***, Міхалам і ***Людвікам Быхаўцамі***, старосцічамі люцінскімі аб невыплаце чопавага і шэлежнага падаткаў за 1707 г. з жыдоў арандатараў места Лыскава.

Крыштаф Алендскі быў унукам ***Юрыя Крыштафавіча Алендскага***, а сынам Тэафіла, спярша харужага, потым падкаморыя, нарэшце, маршалка Ваўкавыскага павета, старосты дзяцкага і жыліцкага, уладальніка Хрустава, Ваўкаўшчызны, Харошкаўшчызны, Калантаеўскага, Гнезна, Нявераўшчызны і Вілеўшчызны, заснавальніка старэйшай галіны Алендскіх на Мачульне. Маці Крыштафа была Галена Маклок. Вядомы тым, што падпісаў элекцыі Яна III Сабескага і Аўгуста II, быў пaслом на сойм 1704 г., 9 мая 1710 г. атрымаў староства ваўкавыскае і поразаўскае вайтоўства [22, s.259, 261; 40, с.146–147].

Тады ж, у 1710 г. была выраблена гербавая пячатка Крыштафа Алендскага, як аб гэтым сведчыць дата на ёй. Пры гэтым, кляйнот яго герба "*Равіч*" зноў быў зменены. Замест паловы льва і сцягоў з'явілася палова панны ў кароне. Гэты варыянт таксама не адпавядаў клясічнаму кляйноту. Такім чынам, можна сцвярджаць, што дзякуючы адметным кляйнотам, ваўкавыскія Алендскія ў канцы XVI–пачатку XVIII ст. карысталіся "*Равічам*" зменeным. Тым больш, што паводле В.Каяловіча ў ВКЛ поле тарчы ў гербе "*Равіч*" было не залатое, а чырвонае [3, s.260].

## (11). **Аляхновіч Ленарт Марцінавіч**, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, 1567.



**Герб**: на тарчы месяц рагамі дагары, над ім шасціпраменная зорка, над зоркай галінка з пяццю адросткамі ("*Ляліва*" зменeная).

Пячатка: адб. №1, вак, 15х18 мм, в [9, ф.1664, воп.1, спр.493, а.1; 14, с.262, мал.2].

27 (месяц страчаны) 1567 г. у Стоках (на Істоку) Ленарт Марцінавіч Аляхновіч выдаў вяноўны ліст сваёй жонцы Марыне Лукашаўне Адамовіч. Сведкамі былі ***Вадзіслаў Казловіч*** і *NN*.

Род Аляхновічаў паходзіў ад старэйшага сына літоўскага баярына Рымавіда – Алехны, намесніка гарадзенскага ў часы Казімера Ягайлавіча. Апошні меў сына Мікалая, той – Юрыя, а Юры – зноў Мікалая "*po którym syn Lenart, sterilis*" [24, s.50]. Аднак, на самой справе Юры пакінуў сына Марціна[14], а не Мікалая, і род Аляхновічаў не згас на Ленарце [14, с.76–77]. Ленарт Марцінавіч Аляхновіч да 27.?.1567 г. узяў шлюб з

[13] Карона і частка надпісу ў атоку відаць на адбітку пячаткі К.Алендскага, старосты Ваўкавыскага павета на дакуменце з 1714 г.

[14] У попісе войска ВКЛ 1528 г. сярод ваўкавыскіх баяраў згадваецца: "*Мартинъ Олехновичъ самъ*" [16, с.97]. Магчыма, быў гэта бацька Ленарта.

Марынай Лукашаўнай Адамовіч. 20 лютага 1572 г. ён напісаў тэстамент і, відаць, хутка пасля гэтага памёр, аднак, жонка "*...от него плодом была запала...*" і выйшла другі раз замуж за Дзмітра Акуліча (яна † 1613 г.). Такім чынам, Ленарт Марцінавіч Аляхновіч пакінуў адзінага сына Адама († да 1613 г.) [14, с.76]. У сваю чаргу Адам Ленартавіч Аляхновіч з невядомай жонкай пакінуў трох малых дзяцей – дзвух дачок Гальшку (пазней замужам за Марцінам Чыкам), Галену (за Крыштафам Станіслававічам Раманоўскім) і сына Юрыя, апекунамі якіх былі ***Фёдар Лукашавіч Адамовіч***, а потым яго сын ***Андрэй Фёдаравіч Адамовіч***. Юры Адамавіч Аляхновіч ужо ў 1636 г. згадваецца як небошчык. Пры гэтым гаворыцца, што адзіны "*...сын Адама Олехновича Юри Олехнович з сего света у летех молодых зышол...*" [9, ф.1664, воп.1, спр.321, а.1]. Ён не пакінуў нашчадкаў і толькі цяпер гэтая галіна роду Аляхновічаў згасла [15, с.188]. У Ваўкавыскім павеце яна валодала маёнткам Ленартаўшчызна ў Манцяках, які пасля смерці Юрыя Аляхновіча праз куплі ў 1627 і 1629 г. ад яго сясцёр адышоў да Андрэя Фёдаравіча Адамовіча [15, с.188].

Герб "*Ляліва*" ўпершыню фіксуецца ў 1501 г. на пячатцы старэйшага сына Алехны – Пятра Аляхновіча, кухмістра вялікага літоўскага: *на тарчы месяц рагамі дагары, над ім васьміпраменная зорка*, надпіс у атоку: "*Печать Петра Олехъновича*" [34, s.23]. Менавіта ад яго пайшоў род Монвід Дагарастайскіх гербу "*Ляліва*" ў ВКЛ [24, s.50–51]. Аляхновічы, якія ішлі ад малодшага брата Пятра – Мікалая, відаць, на знак прыналежнасці да малодшай галіны роду, да сваёй "*Лялівы*" дадалі галінку, стварыўшы тым самым сабе адметны герб.

## (12). Андрэйкевіч Бутаўт Пётр, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, 1637.



**Герб**: на картушовай тарчы клейнавы знак у выглядзе перавернутага трохканцовага крыжа, накшталт літары "*T*", верхні канец якога перакрыжаваны касым прамяністым крыжам, над тарчай ініцыялы: "*P.[iotr] I[endrzejkiewicz]*".
Пячатка: адб. №3, вак, 11x13 мм, д [9, ф.1664, воп.1, спр.653, а.1адв.].

Пётр Бутаўт Андрэйкевіч, як сведка і пячатар, прыклаў сваю пячатку да дароўнага ліста ад 6 кастрычніка 1637 г. ***Ядзвігі Мацеяўны Андрэйковіч*** для дачкі Зузанны Манькоўскай і зяця ***Шымана Калусоўскага*** на 1/3 частку яе маёнтка ў Манцяках Стасеўшчызне. Падпісаўся: "*Piotr Andrzeykiewicz Butołt ręką swą własną*".

Прыдомак "*Буталт*" ці "*Бутаўт*" дазваляе думаць, што род Андрэйкевічаў *vel* Андрэйковічаў у Ваўкавыскім павеце паходзіў ад жамойцкага баярына Бутаўта Мантыгайлавіча, які на Гарадзельскім з'ездзе ў 1413 г. быў адаптаваны да польскага гербу "*Грыф*". На яго тагачаснай пячатцы была змешчана выява грыфа ўлева, надпіс у атоку Ў.Сэмковіч прачытаў як: "*[s ◦ bu]towd m[on]ti[ga]lowycz*" [34, s.98]. Андрэйке(о)вічы Бутаўты гербу "*Грыф*" у гербоўніках ВКЛ і Рэчы Паспалітай XVI–сярэдзіны XVII ст. не згадваюцца. Нічога не ведалі пра іх ні Б.Папроцкі, ні Ш.Акольскі. Нават В.Каяловіч не ведаў нашчадкаў Бутаўта [3, s.61].

Як гэта не дзіўна, але праўдзівасць паходжання Андрэйке(о)вічаў ад Бутаўта падцвярджае клейнавы герб на пячатцы Пятра Андрэйкевіча. Для фальсіфікатара важным было б выкарыстоўваць разам з прыдомкам і польскі герб "*Грыф*". Тым болей, што апошні значна раней фіксуецца на пячатках Андрэйковічаў (гл.ніжэй).

Паводле А.Банецкага, бацькамі Пятра былі Герман Казімер Паўлавіч Андрэйковіч, карэннічы і спіжарнічы ЯКМ (1633 г.) і Раіна Краеўская († 1638 г.) [27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.40]. 1 мая 1627 г. Станіслаў Лукашавіч Шчавінскі з жонкай Раінай Крыштафаўнай Харашэўскай спісалі для Германа Андрэйковіча і Раіны Краеўскай інвентар маёнтку Сядзельнікі і Манцяцкіх грунтоў, якія ляжалі паміж грунтамі Казімера і Размуса Андрэйковічаў [9, ф.1664, воп.1, спр.726, а.1]. У 1634 г. Геранім Андрэйковіч у Смаленску склаў тэстамент, у якім Пётр называецца паўналетнім сынам, у адрозненне ад яго родных братоў – Мікалая (у 1669 г. быў ваўкавыскім каптуровым суддзёй [9, ф.1663, воп.1, спр.852, а.1], яго нашчадкі даволі поўна падаюцца ў А.Банецкага) і Паўла. Скарыстаўшы з малалецтва братоў Пётр загарнуў для сябе ўсе бацькавы маёнткі: Манцякі, Камарэвічы, Шырковічы і Мялехавічы, у выніку чаго ў 1650 г. Мікалай ад свайго імя і ад імя Паўла склаў скаргу ў суд [27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.256]. Сам Пётр яшчэ раз згадваецца як сведка ў 1646 г. у лісце Пятра Янавіча Ляскевіча Навіцкага, дзе падпісаўся: "*Piotr Andrzejkowicz*" [9, ф.1664, воп.1, спр.351, а.1 адв.]. Магчыма, ён у 1655 г. склаў прысягу маскоўскаму цару: "*Петр Ондрейковичь*" [18, с.80]. Нашчадкі Пятра Андрэйковіча нам невядомы.

## (13). Андрэйковіч Мацей Паўлавіч, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, 1611.



**Герб**: на тарчы грыф, над ёй гелм з каронай, вакол тарчы намёт, над гелмам ініцыялы: "*M[aciej] P[awłowicz] A[ndrzejkowicz]*".
Пячатка: адб. №4, вак, 13x16 мм, д [9, ф.1664, воп.1, спр.658, а.2 адв.].

Мацей Паўлавіч Андрэйковіч, як сведка і пячатар, прыклаў сваю пячатку да вызнанага ліста ад 18 студзеня 1611 г. ***Станіслава Пукшты Кляўзгеловіча***, ваўкавыскага харужага. Падпісаўся: "*Maciey Andrzeykowicz własną ręką*".

Бацькам Мацея быў Павел Янавіч Андрэйковіч, які згадваецца ў 1592 г. як сведка ў заставым лісце Войцеха Янавіча Вайніковіча [9, ф.1664, воп.1, спр.664, а.1 адв.]. Жыў яшчэ ў 1600 г. [27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.39] і нават у 1609 г., бо 13 студзеня гэтага году на Паўла Андрэйковіча скардзіліся ў суд Геранім Снарскі і ***Павел Стрыга***, ваўкавыскі возны [9, ф.1664, воп.1, спр.373, а.1; спр.434, а.1 адв.]. Пакінуў акрамя Мацея яшчэ шэсць сыноў: Амброжыя, ***Гераніма***, ***Жыгімонта***, Размуса (Эразмуса)[15], Германа (гл.вышэй) і ***Давыда Паўлавічаў Андрэйковічаў***, якія 9 ліпеня 1620 г. падзялілі між сабой бацькоўскі маёнтак [9, ф.1664, воп.1, спр.374, а.1; 27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.39].

Дзедам Мацея быў Ян Андрэйковіч, які з жонкай Даротай Барткоўнай меў акрамя Паўла Янавіча Андрэйковіча яшчэ дзвух сыноў Яна, Мацея і дачку Зоф'ю замужам за Каспарам Грыбоўскім [9, ф.1664, воп.1, спр.373, а.1]. Ён памёр да 1564 г., бо ў гэты год яго ўдава Дарота Барткоўна падаравала сынам 1/3 частку Манцякоў, Кузьмікаўшчызны і Юр'еўшчызны [27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.39]. Цалкам магчыма, што адзін з дзвух згаданых ў попісе ваўкавыскай харугвы 1528 г. Янаў: "*Ян Анъдреиковичъ 3 кони… Ян Анъдрейковичъ конь*" [13, с.97] ёсць ідэнтычны з дзедам Мацея Паўлавіча Андрэйковіча. Нейкі Ян Андрэйковіч, баярын гаспадарскі ваўкавыскі, згадваецца як сведка ў справе братоў Яна і Мікалая Вайцяшковічаў са Станіславам Збожным, намеснікам зэльвенскім у 1540 г. [33, s.164].

У 1604 г. М.П.Андрэйковіч з жонкай Кацярынай Янаўнай Залескай набылі ў Аляксандра Янавіча Ляўковіча і яго маці Зоф'і Астафеяўны Тышкевіч маёнтак Цяхлевічы Ляўкаўшчызну [27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.40]. Сынамі яго былі Крыштаф і Юры Андрэйковічы, якія згадваюцца разам у 1653 г. у судовай справе іх стрыечнага брата Станіслава Ярашавіча Бутаўта Андрэйковіча са Станіславам Сегенем [9, ф.1664, воп.1, спр.690, а.1 адв.]. Яшчэ адным сынам Мацея быў Казімер. Разам з братам Крыштафам ён прысягнуў у 1655 г. маскоўскаму цару: "*Хриштоб Матвеев сын Ондрейковичь. Казимер Матвеев сын Ондрейковичь*" [18, с.84]. З-за стану свайго здароўя і здароўя сваіх дзяцей ў 1621 г. Мацей Паўлавіч не прымаў удзелу ў выправе ў Інфлянты. За яго ставіў каня па-казацку яго брат Герман (гл.с.47).

Паводле Б.Папроцкага герб "*Грыф*" выглядаў так: "*Ma być Gryf biały w polu czerwonem, nos i nogi przedne złote*" [1, s.115], а ў кляйноце – палова грыфа ўлева без лапаў з залатой трубой з левага боку [37, s.60]. В.Каяловіч для ВКЛ падае трошкі іншы кляйнот: "*W hełmie puł gryfa między trąbami*" [3, s.61]. Аднак, ні ў М.П.Андрэйковіча, ні ў яго братоў і крэўных кляйнота ў гербе не было.

## (14). **Андрэйковіч Геранім Паўлавіч**, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага і Гарадзенскага паветаў, 1614.



**Герб**: на тарчы грыф, над ёй гелм з каронай без кляйноту, вакол тарчы намёт, над гелмам ініцыялы: "*H[ieronim] P[awłowicz] A[ndrzejkowicz]*".

Пячатка: адб. №8, вак, 14х15 мм, к [9, ф.1664, воп.1, спр.328, а.4].

Геранім або Яраш Андрэйковіч, як сведка і пячатар, прыклаў сваю пячатку да прадажнага ліста ад 30 мая 1614 г. Крыштафа Пятровіча Калупайлы Рудзеўскага і яго жонкі Настазыі Аляксандраўны Адамовіч. Падпісаўся: "*Heronym Andrzeykowicz Ręką swą*".

Першы раз Яраш Паўлавіч Андрэйковіч згадваецца 3 верасня 1606 г. у скарзе Дзмітра Акуліча і яго жонкі Марыны Лукашаўны Адамовіч за напад на іх дом у Манцяках і збіццё самых гаспадароў [21, КП 15111, а.1]. У 1620 г. разам з братамі ўдзельнічаў у дзяльбе бацькоўскага маёнтку, але на выправу ў Інфлянты 1621 г. ад яго і іншых братоў каня па-гусарску ставіў Герман (гл.с.47). 8 чэрвеня 1628 г. у ваўкавыскім земскім судзе Яраш Андрэйковіч узяў копію (выпіс) інтэрцызы аб падзеле бацькоўскага маёнтку ў 1620 г. [9, ф.1664, воп.1, спр.374, а.1 адв.].

У 1641 г. у Манцяках ён разам з жонкай Ганнай Марцыянаўнай Макрэцкай, "*зямяне ЯКМ Гарадзенскага і Ваўкавыскага паветаў*" выдалі свой заставы ліст на фальварак "*айчысты*" Манцякі Тумашэўшчызну за 300 копаў грошаў літоўскіх на 3 гады Пятру Людвікавічу Стравінскаму і яго жонцы Еве Абраслікоўскай. Падпісаўся: "*J[a]rosz Jendrzeyko[wicz] ręnko swo*" [9, ф.1664, воп.1, спр.666, а.1, 2, 3–3 адв.]. Згадка пра сябе як пра гарадзенскага зямяніна сведчыць аб напрамку міграцыі ваўкавыскіх Андрэйковічаў. Паводле А.Банецкага, Ярашу Андрэйковічу ў Гарадзенскім павеце належаў маёнтак Старыя Гумнішчы [27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.42]. Як можна меркаваць – па жонцы. У 1647 г. Яраш Андрэйковіч згадваецца ўжо як нябожчык [9, ф.1664, воп.1, спр.666, а.4].

Сынамі Яраша былі Станіслаў і Лукаш Андрэйковічы [27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.42]. Верагодна, яшчэ адным яго сынам быў згаданы ў крыжапрыводнай кнізе прысягнуўшых маскоўскаму цару ў 1655 г. "*Ондрей Ерошеев сын Ондре[йк]евич*" [18, с.83].

У 1647 г. Станіслаў Бутаўт Андрэйковіч з жонкай Кацярынай Ябланеўскай "*зямяне ЯКМ Гарадзенскага і Ваўкавыскага паветаў*" аддаў пазычаныя бацькам грошы і вярнуў Манцякі Тумашэўшчызну назад [9, ф.1664, воп.1, спр.666, а.4]. 9 верасня 1651 г. як сведка падпісаўся на заставым лісце Ганны Валовіч жонкі Самуэля Пукшты Кляўзгеловіча, маршалка ваўкавыскага: "*Stanisław Andrzeykowicz Butowt manu Propryia*" [9, ф.1664, воп.1, спр.667, а.4 адв.]. У 1653 г. з ім судзіўся Станіслаў Сегень за беспраўнае парубанне гаю Пабоішча Хойна,

[15] У 1634 г. Размус ("*Еразмус*") Андрэйковіч быў ваўкавыскім намеснікам [9, ф.1783, воп.1, спр.6, а.20 адв.]. Жонкай яго была Аўдоцця Гальшка Лопат [9, ф.1664, воп.1, спр.695, а.13].

якое належала да маёнтку апошняга Манцякі Грыбаўшчызна [9, ф.1664, воп.1, спр.690, а.1 адв.]. Стала выкарыстоўваў прыдомак "*Бутаўт*" ("*Butow*", "*Butałt*", "*Butowt*"). З першай невядомай жонкай пакінуў нашчадкаў [27, Uzupełnienia i sprostowania do Cz.I, s.42–43].

Наконт Лукаша звесткі адсутнічаюць. У 1674 г. Лукаш Андрэйковіч пазычыў на свой аблігацыйны ліст у Казімера Адамовіча, сына ***Андрэя Фёдаравіча Адамовіча*** 7 злотых. Але яго імя па бацьку было "*Krzysztophowicz*", што робіць яго сынам Крыштафа, а ўнукам ***Мацея Паўлавіча Андрэйковіча***. Падпісаўся: "*Łukasz Andrzeykowicz Renko swą*" [9, ф.1664, воп.1, спр.344, а.1–1 адв.].

## (15). Андрэйковіч Жыгімонт Паўлавіч, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, 1619.



**Герб**: на тарчы грыф, над тарчай гелм без кароны, па баках тарчы намёт, над гелмам ініцыялы: "*Z[ygmunt]:A[ndrzejkowicz]*".

Пячатка: адб. №1, вак, 15x17 мм, д [9, ф.1783, воп.1, спр.11, а.1].

Жыгімонт Андрэйковіч, як сведка і пячатар, прыклаў два разы сваю пячатку за выстаўцу і за сябе да прадажнага ліста (пачатак якога не захаваўся) Мацея Забагоньскага для Крыштафа Вольскага, кашталяна віцебскага на сяляніна і грунты. 1 кастрычніка 1619 г. згаданы ліст быў актыкаваны ў Ваўкавыскім земскім судзе, а значыць ён быў напісаны да гэтай даты. Падпісаўся: "*Zygmont Andrz[e]ykowicz*".

У 1620 г. разам з братамі падзяліў бацькоўскі маёнтак. У 1621 г. ужо не жыў, бо ў попісе ваўкавыскай харугвы яго брат Герман ставіў каня па-гусарску "*ад удавы братавай пані Жыгімонтавай Андрэйковічавай*" (гл.с.47). Жонкай Жыгімонта Паўлавіча Андрэйковіча была Раіна Крыштафаўна Харашэўская, якая пасля смерці першага мужа выйшла замуж за С.Л.Шчавінскага, зямяніна Слонімскага павету. Як вынікае з улеўковага ліста апошняга ад 1 мая 1627 г. Жыгімонт Андрэйковіч склаў свой тэстамент 16 верасня 1621 г., запісаўшы жонцы на айчыстым маёнтку Сядзельнікі і грунтах Манцяцкіх 200 копаў грошы літоўскіх. З яго таксама даведваемся, што Ж.П.Андрэйковіч пакінуў непаўналетнюю дачку Крыстыну [9, ф.1664, воп.1, спр.729, а.1]. Пазней (да 1641 г.) яна выйшла замуж за Фёдара Дзянісавіча Мізгіра [9, ф.1664, воп.1, спр.666, а.1; спр.690, а.4].

## (16). Андрэйковіч Давыд Паўлавіч, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, 1627.



**Герб**: на авальнай картушовай тарчы грыф, над ёй ініцыялы: "*D[awyd] P[awłowicz] A[ndrzejkowicz]*".

Пячатка: адб. №1, вак, 15x16 мм, к [9, ф.1664, воп.1, спр.331, а.2].

9 студзеня 1627 г. у Манцяках Давыд Андрэйковіч выдаў прадажны ліст для ***Андрэя Фёдаравіча Адамовіча*** на тры моргі сенажаці Вітаўшчызна "*наврочышчу у черемшычышчах у концы села Мелехович*" свайго маёнтку ў Манцяках. Да ліста ён тры разы прыклаў сваю пячатку і падпісаўся: "*Dawid Andrzeikowicz Ręką swą*". Сярод сведкаў былі зямяне гаспадарскія Ваўкавыскага павета: Шчасны Гедройць, Юры Ашмянец і Андрэй Драздоўскі.

У 1620 г. удзельнічаў разам з братамі ў дзяльбе бацькоўскага маёнтку, у 1621 г. і за яго таксама ставіў на выправу ў Інфлянты каня брат Герман (гл.с.47). Апошні раз Давыд Паўлавіч разам з ***Пятром Андрэйкевічам*** згадваецца як сведка ў 1646 г. у лісце Пятра Янавіча Ляскевіча Навіцкага, дзе падпісаўся: "*Dawid Andrzeykowicz*" [9, ф.1664, воп.1, спр.351, а.1 адв.]. Невядома ці пакінуў нашчадкаў.

## (17). Андрэйковіч Ядзвіга Мацеяўна*, зямянка гаспадарская Ваўкавыскага павета, 1637.



**Герб**: на тарчы грыф, над ёй гелм без кароны, вакол тарчы намёт, над гелмам ініцыялы: "*MP*".

Пячатка: адб. №1, вак, 13x15 мм, к [9, ф.1664, воп.1, спр.329, а.2].

1 кастрычніка 1637 г. Ядзвіга Мацеяўна Андрэйковіч выдала свой прадажны ліст ***Андрэю Фёдаравічу Адамовічу*** на дзве часткі Стасеўшчызны і "*...в селе Мелеховичах подле Урбановичов части две называемые Галеровщызна...*" у маёнтку Манцякі. Яна была непісьменнай, таму за яе падпісаўся Крыштаф Жукоўскі: "*Jako od pisma nieumieietney Pani Jadwigi Andrzeikowiczowny Stanisławowey Mankowskiey Zukowski Krzysztof Ręką własną*". Як сведкі згадваюцца зямяне ваўкавыскія Пётр Ардынец і Станіслаў Эйсымонт.

Бацькам Ядзвігі быў брат Паўла Янавіча Андрэйковіча – Мацей, які ўжо ў 1604 г. згадваецца як нябошчык. З невядомай жонкай пакінуў акрамя Ядзвігі яшчэ адную дачку Зоф'ю (замужам у 1604 г. за Серафінам Мацеявічам Моцевічам) і сыноў – Шымана і Яна. Сама Ядзвіга першы раз выйшла замуж недзе да 1604 г. за Яна Ябланоўскага, аднак, шлюб гэты быў недоўгі, бо ўжо ў 1607 г. яе другім мужам згадваецца

Станіслаў Манькоўскі († да 1637 г.) [9, ф.1664, воп.1, спр.361, а.1; спр.377, а.1, 3, 4; спр.665, а.1]. Ад другога мужа мела дзве дачкі: Зузану і Ганну. У 1637 г. абедзьве былі замужам – першая за ***Шыманам Калусоўскім***, другая – за Янам Ілейкам [9, ф.1664, воп.1, спр.329, а.1].

Цікава, што Я.М.Андрэйковіч для дзвух сваіх лістоў, выстаўленых у даволі кароткі тэрмін – 1 і 6 кастрычніка 1637 г., выкарыстала два раней падрыхтаваныя бланкі з адбіткамі не сваёй пячаткі. У лісце 6 кастрычніка ўсе чатыры адбіткі былі зробленыя пячаткай ***Пятра Андрэйкевіча*** (гл.вышэй). У прадажным лісце 1 кастрычніка зноў чатыры разы была адбітая пячатка з ініцыяламі "*МР*". Выглядае на тое, што непісьменная Ядзвіга не мела ўласнай пячаткі, хаця і адзначала "*...под печатью моею...*", таму карысталася бланкамі з адбітымі пячаткамі сваіх крэўных. Магчыма, ініцыялы на пячатцы з другога дакумента належалі ***Мацею Паўлавічу Андрэйковічу*** ("*M[aciej] P[awłowicz]*") і гэта была яго ўжо другая гербавая пячатка. Аднак, пра яго няма ніякіх звестак пасля 1621 г. Нельга выключыць і такі варыянт, што насамрэч ініцыялы чытаюцца як "*Ма*", толькі апошняя літара пададзена ў люстраным адбіцці. Тады пячатка магла належаць нават бацьку Ядзвігі – Мацею Янавічу Андрэйковічу ("*M[aciej] a[ndrzejkowicz]*" ці "*Ма[тей]*").

## (18). Аніхімовіч Мікалай*, зямянін Ваўкавыскага павета, 1602.



**Герб**: на картушовай тарчы крыжастрэл выстрыём уніз, канцы якога заламаныя накшталт літары "*М*", над тарчай ініцыялы: "*М[К?]*".

Пячатка: адб. №5, вак, 13х15 мм, д [9, ф.1783, воп.1, спр.4, а.7 адв.].

5 мая 1602 г. Мікалай Аніхімовіч, як сведка і пячатар, прыклаў сваю пячатку да прадажнага ліста ***Мікалая Янавіча Шэмета*** і яго жонкі ***Барбары Шыманаўны Калусоўскай***. Падпісаўся: "*Mykołay Onychymowicz...*".

18 студзеня 1601 г. як сведка на лісце Адама Аляхновіча сына ***Ленарта Марцінавіча Аляхновіча*** Мікалай Аніхімовіч падпісаўся інакш: "*Миколай Онихимовский рукою власною*" [9, ф.1664, воп.1, спр.317, а.2]. Выкарыстанне формаў Аніхімовіч *vel* Аніхімоўскі сведчыць аб неўнармаванасці напісання родавага прозвішча Мікалая. У сувязі з гэтым, ініцыялы на пячатцы маглі належаць і яму непасрэдна: "*M[ikołaj] K[?]*". Зацёртая другая літара ініцыялу магла адносіцца да імя па бацьку. Заслугоўвае ўвагі інфармацыя Севярына Ўрускага са спасылкай на зборы С.Дзядулевіча, што ў 1613 г. нейкі Мацей Аніхім, ваўкавыскі зямянін карыстаўся гербам "*Kруцыні*", у аснове якога ляжыць крыж [26, T.XII, s.346; 4, T.5, s.392, 422]. Сам С.Дзядулевіч на інвентары вёскі Лапеніца 1650 г. бачыў пячатку Лукаша Аніхімоўскага з гербам "*Котвіца*" [10, s.225]. На нашу думку, пад "*Kруцыні*" і "*Котвіцай*" крыецца іх уласны клейнавы герб. Магчыма, такі, які быў на пячатцы, прыкладзенай Мікалаем Аніхімовічам.

Род Аніхімовічаў *vel* Аніхімоўскіх дакладна фіксуецца ў Ваўкавыскім павеце з другой паловы XVI ст. – у попісу войска ВКЛ 1565 г. пад ваўкавыскай харугвай згадваюцца: "*Стефанъ Онихимовичъ конь въ кафъ[тане]. з още[пом]. ...Федько Онихимовичъ конь въ пан[цыри]., въ пр[илбицы]., з ощепомъ*" [17, с.94–97]. Магчыма, з апошнім можна атаясаміць Фёдара Аніхіма, які ў 1570 г. быў возным ЯКМ Ваўкавыскага павету [9, ф.1664, воп.1, спр.576, а.1 адв.]. Варыянты прозвішча Аніхім-Аніхімовіч-Аніхімоўскі ўжываліся амаль адначасова. Так, у попісе ваўкавыскай харугвы 1621 г. запісаны: "*Панове Аніхімаўцы*" (гл.с.49). У 1655 г. маскоўскаму цару прысягнулі сярод ваўкавыскай шляхты: "*Пётр Криштов сын Ал[н]ехимовской ...Иван Иванов сын Онисимовский, Василей Матвеев сын*[16] *Онисимовский ...Юрьи Остафьев сын Онисимовский ...Павел Констентий Анисимовский ...Вдова Варвара Ондреева жена Анифомовская Петрова дочь Черновская*" [18, с.79, 84–85]. Як бачым, маскоўскі пісар адное і тое ж прозвішча запісаў у пяці (!) варыянтах, бо пісаў яго так, як чуў ад складаўшых прысягу прадстаўнікоў Аніхімоўскіх. Паводле падымнага рэестру 1690 г. у Ваўкавыскім павеце ў родавым маёнтку Аніхімы Эліяш, Пётр і Сімон Аніхімоўскія мелі па 1 дыму кожны [19, s.185].

## (19). Ардынец Даніэль Казімер, стражнік смаленскі, падстароста ваўкавыскі, 1690.



**Герб**: у полі пячаткі зацёртая выява, над ёй фрагменты кароны, па баках яе дзве галінкі перавязаныя ўнізе, вакол гербу ініцыялы: "*D[aniel] [Kazimierz] O[rdyniec] P[odstarości] P[owiatu] W[ołkowyskiego] S[trażnik] S[moleński]*".

Пячатка: адб., пк, 25х32 мм, к [9, ф.1664, воп.1, спр.589, а.1 адв.].

28 ліпеня 1690 г. у Ваўкавыску Даніэль Казімер Ардынец, падстароста разам са Станіславам Вярэнкам, скарбнікам і суддзёй, а таксама з Дыянізам Алендскім, пісарам – ураднікамі судовымі гродскімі ваўкавыскімі – выдаў выпіс з кніг ураду гродскага староства ваўкавыскага з юрамэнтам і атэстацыяй ***Самуэля Дабрагоста Быхаўца***, старосты люцінскага з яго маёнтка Лыскава. На пасаду падстаросты быў прызначаны ***Грыгорам Антоніям Агінскім***, старостай ваўкавыскім.

[16] Магчыма, сын Мацея Аніхіма з 1613 г.

Род Ардынцаў вядомы ў Ваўкавыскім павеце з першай паловы XVI ст. Леў, Матвей, Пётр і Станіслаў Грыгоравічы Ардынцы, баяры ваўкавыскія павінны былі ставіць на ваенныя патрэбы ў 1528 г. па 1 каню [26, T.XII, s.377]. Сапраўды, у попісе войска ВКЛ 1528 г. пад ваўкавыскай харугвай запісаны: “*Матьфеи Ордынецъ конь. Лопотъ [Леў?] Оръдынецъ конь. Петръ Оръдынецъ конь*” [16, с.96]. У 1565 г. у войска ВКЛ “*Григорей Гордынецъ выслалъ конь въ пан[цыри]., въ пр[илбицы]., з ощепомъ*”. Відаць, сынамі незгаданага ў попісе 1528 г. Станіслава, двараніна ЯКМ у 1566 г. [26, T.XII, s.377] з’яўляліся запісаныя пасля Грыгора Ардынца: “*Павелъ и Жданъ Станиславовичъ 2 кони въ пан[цыри]., въ пр[илбицы]., з ощепомъ*” [17, с.94–97]. На выправу ў Інфлянты ў 1621 г. нейкі “*Пан Ардынец выслаў сына дарослага на кані па-гусарску*” (гл.с.47). У 1655 г. прысягу маскоўскаму цару склалі ваўкавыскія шляхцічы: “*Степан Ордынец ...Хриштоб Яковлев сын Ордынец*” [18, с.80, 84].

Герб і род Ардынцаў не згадваецца ў гербоўніку В.Каяловіча. Паводле польскіх даследчыкаў В.Вітыга і С.Дзядулевіча, у 1605 г. Грыгоры Ардынец, ваўкавыскі зямянін карыстаўся пячаткай з гербам “*Касцеша*” [10, s.225]. К.Нясецкі памылкова пад Адынцамі гербу ўласнага падае такую інфармацыю: “*Падобна ёсць Адынцы гербу Ляліва. Даніэль стражнік Смаленскі 1674 у павеце Ваўкавыскім*” [4, T.7, s.48]. Такім чынам, Даніэль Казімер Ардынец, падстароста ваўкавыскі, стражнік смаленскі карыстаўся польскім гербам “*Ляліва*”. Цяжка праверыць гэтую інфармацыю, бо выява на тарчы з яго гербавай пячаткі 1690 г. не захавалася. Пазнейшыя гербоўнікі адносілі Ардынцаў да гербу “*Астоя*” [26, T.XII, s.377].

Даніэль Казімер Ардынец († пасля 1706 г.) паводле падымнага рэестру 1690 г. меў 4 дымы ў маёнтку Стокі (Істокі) Лашэвічы і 1 дым у фальварку Якушоўка [19, s.197]. Жонкай яго была Крыстына Альшэўская [26, T.XII, s.377]. Верагодна, яна была ўжо другой жонкай, бо пад час намінацыі на стражнікоўства смаленскае ў 1672 г. Даніэль Казімер Ардынец, суддзіч гродскі ваўкавыскі быў жанаты на Ганне Міленькай [41, s.203].

## (20). Аўсяны Астоя Дамінік, войскі ваўкавыскі, 1766.

**Герб**: меч паміж дзвух жоўтых месяцаў у чырвоным полі, у кляйноце пяць пёраў стравуса (“*Астоя*”) [3, s.204].

Крыніца: [9, ф.1664, воп.1, спр.376, а.1].

23 красавіка 1766 г. Дамінік Аўсяны, войскі ваўкавыскі пазычыў на свой ліст аблігацыйны ў Юзафа Антоніевіча Бутаўта Андрэйковіча 330 злотых польскіх. Падпісаўся: “*Dominik Ostoja Owsiany Woyski Wołkowyski*”.

Род Аўсяных паходзіў з Наваградскай зямлі. Першым згадваецца ў 1521–1522 г. Аляксей Фёдаравіч Аўсянік, дваранін ЯКМ [26, T.XIII, s.134; 39, s.240]. Магчыма, пра яго гаворыцца у попісе войска ВКЛ пад наваградскай харугвай: “*Овъсянинъ 2 кони*” [16, с.65]. Сынам яго быў Богуш Аляксеявіч Аўсяны. Яму і яго сыну Івану ***Ян Хадкевіч***, староста жамойцкі заставіў у 1573 г. за 3 000 копаў грошаў літоўскіх Межырэч у Ваўкавыскім павеце на 2 гады [9, ф.1664, воп.1, спр.604, а.1]. Іван ці Ян Аўсяны, сакратар ЯКМ (1595 г.) узяў шлюб з Гальшкай Мацеяўнай Клочкай, з якой пакінуў сыноў: Адама, Самуэля, Даніэля, Міхала і дзве дачкі: Галену (замужам за Філонам Сапоцькам) і Базылію (за Міхалам Храптовічам) [21, КП 15111, а.1]. Паводле В.Каяловіча, Аўсяныя гербу “*Астоя*” у Ваўкавыскім павеце вялі свой радавод ад Даніэля, ваўкавыскага земскага падсудка [3, s.206]. Даніэль Аўсяны, спачатку ваўкавыскі земскі пісар (1637 г.), потым падсудак (1651 г.) [9, ф.1783, воп.1, спр.17, а.13; ф.1664, воп.1, спр.310, а.3] з N Магільніцкай пакінуў сыноў: Уладзіслава, Багуслава, Казімера[17], Яна і Гераніма, Дамініка, Станіслава – малодшых іх братоў [3, s.206–207].

Хто быў бацькам Дамініка Астоі Аўсянага невядома, бо радавод Аўсяных гербу “*Астоя*” не распрацаваны [40, с.391–393]. Сам ён, спярша капітан ЯКМ коннага рэгімэнту Булавы Польнай ВКЛ (1741 г.), потым падстолі (1752 г.) [9, ф.1664, воп.1, спр.674, а.1; спр.652, а.1], нарэшце, войскі ваўкавыскі памёр у 1766 г., бо аддаваў пазыку ў наступным 1767 г. Юзафу Андрэйковічу ўжо яго сын Уладзіслаў Астоя Аўсяны, вайсковіч Ваўкавыскага павета [9, ф.1664, воп.1, спр.376, а.1]. Жонкай Дамініка была Схалястыка Ванькові [9, ф.1664, воп.1, спр.242, а.2].

## (21). Ашмянец Павел Мацеявіч, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, 1564.



**Герб**: на тарчы падкова канцамі ўніз, унутры яе просты крыж (“*Тупая падкова*”), над тарчай ініцыялы: “*.P[aweł]◦O.[szmieniec]*”.

Пячатка: адб. №3, вак, 14x16 мм, в [21, КП 8732, а.1].

У чэрвені (дзень невядомы) 1564 г. Павел Мацеявіч Ашмянец, як сведка і пячатар, прыклаў сваю пячатку да прадажнага ліста Яна Пятровіча Эйсымонтавіча, зямяніна Гарадзенскага павета і яго жонкі Ягнешкі Пацкоўны для Шчаснага Навіцкага Эйсымонта на палянку грунта ў маёнтку Эйсымонты Гарадзенскага павета.

Як можна меркаваць па прозвішчу, род Ашмянцаў выйшаў з Ашмянаў. У Ваўкавыскім павеце ён дакладна фіксуецца ўжо ў другой палове XV ст. 30 красавіка 1451 г. у прадажным лісце Яна Карэйвы Ядугавіча

[17] У 1655 г. склаў прысягу маскоўскаму цару: “*Казимер Данилов сын Овсян*” [18, с.80].

сярод сведкаў-“*магарычнікаў*” згадваюцца: “*Пашко и Митко Ошеменцы*” [38, с.106, дадатак]. Верагодна, згаданы ў попісе 1528 г. “*Янко Пашъковичъ самъ*” [16, с.97] быў сынам першага. У попісе войска ВКЛ 1565 г. быў запісаны сярод ваўкавыскай шляхты: “*Михайло Якубовичъ Ошъменецъ на мер[ине]. З ощепом*” [17, с.94–97]. Невядома кім ён прыходзіўся Паўлу Мацеявічу Ашмянцу. Аднак, на попіс 1567 г. 3 кастрычніка ставіўся менавіта апошні: “*Павелъ Ошменецъ з Ошменцовъ клячи 2, каф[тан]. 1, прил[бица]. 1, согой[дак]. 1, рогати[ны] 2*” [31, с.61]. Невядома ці пакінуў ён нашчадкаў.

В.Каяловіч ні Ашмянцаў, ні іх гербу не ведаў. К.Нясецкі толькі адзначыў, што такі род быў у Ваўкавыскім павеце, але якога гербу – не падаў [4, T.7, s.146]. Ашмянцы, між тым, карысталіся рознымі гербамі, пра што сведчыць пячатка ***Мацея Ашмянца*** (гл. ніжэй).

## (22). Ашмянец Мацей, возны Ваўкавыскага павета, 1606.



**Герб**: на тарчы тры ўрубы з роўнымі краямі (“*Карчак*”), над тарчай ініцыялы: “*M[aciej] O[szmieniec]*”.

Пячатка: адб. №1, вак, 13х14 мм, д [9, ф.1783, воп.1, спр.8, а.28].

8 красавіка 1606 г. у Рагозніцы Мацей Ашмянец, ваўкавыскі возны тры разы прыклаў пячатку да свайго вызнанага квіта па справе гарадзенскіх бернардынак. Сведкамі былі: Ян Ашмянец і Крыштаф Катовіч.

Тое, што Мацей Ашмянец, возны ваўкавыскі карыстаўся гербам “*Карчак*” падцьвярджае С.Урускі са спасылкай на В.Вітыга. Апошні бачыў такі герб на пячатцы Мацея з 1610 г. [26, T.XIII, s.122]. Звяртае ўвагу тое, што сваю пячатку на дакуменце 1606 г. ваўкавыскі возны прыклаў тры разы: за сябе, за Яна Ашмянца[18] і за Крыштафа Катовіча. Апошні паходзіў з роду, які таксама належаў да “*Карчакаў*” [4, T.5, s.329]. Магчыма, змена гербу тлумачыцца адопцыяй Мацея да гербу “*Карчак*” праз Катовічаў. З невядомай жонкай пакінуў два сына: Мікалая і Адама. Абодва ў 1655 г. склалі прысягу маскоўскаму цару: “*Микулай Матфеев сын Ошме[н]ичь ...Адам Матвеев сын Ошменец*” [18, с.76, 87]. Нейкі Крыштаф Ашмянец, які ў 1620 г. быў дэпутатам ад Ваўкавыскага павета ў Галоўным Трыбунале ВКЛ [26, T.XIII, s.122], у 1621 г. на выправу ў Інфлянты ад сябе і братоў ставіў каня па-гусарску (гл.с.47).

## Літаратура і крыніцы:


1. Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego 1584.– Kraków, 1858.– 964 s.
2. Okolski S. Orbis Polonus.– Cracoviae, 1640–1645.– T.1–3.
3. Kojałowicz Wijuk W. Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego tak zwany Compendium.– Kraków, 1897.– 527 s.
4. Niesiecki K. Herbarz polski.– Lipsk, 1839–1846.– T.1–10.
5. Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі.– Мн.: Полымя, 1993.– 239 с.
6. ЭГБ.– Мн.: БелЭн, 1993–2003.– Т.1–6.
7. Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута.– М., 1892.
8. Biblioteka Narodowa w Warszawie, Rps. BN III, 9100.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) ў Горадні.
10. Wittyg W., Dziadulewicz S. Nieznana szlachta polska i jej herby.– Kraków, 1908.– 436 s.
11. Rachuba A. W sprawie nieznanych Wittygowi nazwisk i herbów szlacheckich.// Heraldyka i okolice./ Red. A.Rachuba, S.Górzyński, H.Manikowska.– Warszawa, 2002.– S.143–154.
12. Puzyna J. Niektóre pieczęcie litewskie z XVI i XVII w.// Magazyn heraldyczny.– Warszawa, 1933.– R.XII.– Nr4.– S.55–58; Nr5.– S.73–77.
13. Akta Unii Polski z Litwą 1385–1791./ Wyd. S.Kutrzeba, W.Semkowicz.– Kraków, 1932.– 570 s.
14. Шаланда А. Удакладненні да гербу і радаводу Аляхновічаў.// Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей.– Ваўкавыск, 1997.– С.75–77.
15. Шаланда А. Гербы і род Адамовічаў у другой палове XVI–XVII ст.// Наш радавод.– Горадня, 1996.– Кн.7.– С.187–190.
16. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн.523. Кн. Публічных спраў 1./ Падрыхт. А.Груша, М.Спірыдонаў, М.Вайтовіч.– Мн.: Бел. навука, 2003.– 444 с.
17. РИБ.– Пгд, 1915.– Т.33.– 1378 с.
18. Крестоприводная книга шляхты Великого княжества Литовского 1655 г.: Памятники истории Восточной Европы: Источники XV–XVII вв./ Сост. Е.Е.Лыкова, М.Кулецкий.– М.: Древлехранилище, 1999.– Т.IV.– 264 с.
19. Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo nowogródzkie 1690 r./ Oprac. H.Lulewicz, A.Rachuba.– Warszawa, 2002.– 290 s.


[18] Магчыма, сынам Яна Ашмянца быў Якуб Янавіч Ашмянец, які згадваецца ў адной судовай справе ў 1637 г. [9, ф.1783, воп.1, спр.17, а.2].

20. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) ў Менску.
21. Гарадзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей (ГДГАМ).
22. Bouffałł B. Olędzcy herbu Rawicz.// Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej.– Poznań, 1891.– R.XIII.– S.247–267.
23. Пластыка Беларусі XII–XVIII ст.– Мн.: Беларусь, 1983.– 231 с.
24. Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej.– Poznań, 1891.– R.XIII.– 405 s.
25. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku.– Warszawa, 1895.– 698 s.
26. Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej.– Warszawa, 1904–1931.– T.I–XV.
27. Boniecki A. Herbarz Polski.– Warszawa, 1899–1913.– T.1–16.
28. Зимин А.А. Формирование боярской аристократии в России во второй половине XV–первой трети XVI в.– М.: Наука, 1988.– 350 с.
29. Шаланда А., Фёдараў І. Палацава-паркавы комплекс у вёсцы Ябланова і яго ўладальнікі ў канцы XVIII–пачатку XIX ст.// Сядзібы і паркі Гродзеншчыны.– Гродна, 2004.– Ч.II.– С.54–58.
30. Окуневский Г.А. Родословная князей Огинских в Волковысском повете.// Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей.– Ваўкавыск, 1997.– С.78–82.
31. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ваўкавыскага раёна.– Мн.: БЕЛТА, 2004.– 528 с.
32. АВАК.– Вильно, 1865–1915.– Т.1–39.
33. Lietuvos Metrika (1528–1547).– Vilnius, 1995.– Kn.6.– 488 s.
34. Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413.// LSP.– Poznań, 1989.– Studia Historica III.– S.7–139.
35. Gumowski M. Pieczęcie królów polskich.– Kraków, 1910.– 94 s.
36. БРК ГДГАМ, № 01929/3: Paszkiewicz M. Ślady bez zawady JW.JP.Krystyny z Abramowiczów Oginskiey...– Wilno, 1739.
37. Górzyński S., Kochanowski J. Herby szlachty polskiej.– Warszawa, 1992.– 175 s.
38. АЮЗР.– СПб., 1865.– Т.2.– 287 с.
39. Boniecki A. Poczet rodów w Wielkim księstwie Litewskiem w XV i XVI wieku.– Warszawa, 1887.– 425 s.
40. Гербоўнік беларускай шляхты./ Т.Капіца, А.Леўчык, С.Рыбчонак і інш.– Мн.: БелНДІДАС, 2002.– Т.1.– 493 с.
41. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. Ziemia Smoleńska i województwo Smoleńskie XIV–XVIII wiek./ Pod red. A.Rachuby. Oprac. H.Lulewicz, A.Rachuba, P.Romaniuk.– Warszawa, 2003.– T.IV.– 412 s.


*Аляксей Шаланда*
*(працяг будзе).*

## Пячаткі менскага біскупа Якуба Дэдэркі
## ў фондах НГАБ у Менску.


In article "*The Seales of Miensk bishop Jakub Dederka in funds of National historical archive of Belarus in Miensk*" **Andrej Leŭčyk** are considered by six personal seales of Miensk bishop Jakub Dederka for 1798-1813 years. It is marked, that their basis was the patrimonial arms "*Dederka*".


Паводле Ўказу расійскага імператара Паўла I ад 28 красавіка 1798 г., які 5 мая быў выданы і абвешчаны Сенатам, на абшарах Расійскай Імперыі зацвярджаліся шэсць рымска-каталіцкіх дыяцэзіяў, у тым ліку "*Епископство Минское въ Губерніи того же названія*". На апошняе біскупам прызначылі "*...Прелата Іакова Дедерка... Епіскопам Каменецкому і Минскому производить по содержаніе іхъ съ домами и катедрами по шести тысячъ рублей...*" [1, а.20; 13, с.89].

Мы не будзем разглядаць гісторыю Менскай дыяцэзіі, а толькі пячаткі першага яе біскупа. Прычынай для гэтага паслужыў артыкул Андрэя Шпунта "*Невядомыя пячаткі*", які быў надрукаваны ў часопісе "*Наша вера*" [2]. Аўтар зрабіў добрую справу, падаўшы ў сваёй працы дзве пячаткі Якуба Ігната Дэдэркі (1751–1829). Аднак, іх вольныя прамалёўкі не перадаюць дакладныя прапорцыі згаданых сфрагістычных помнікаў, што можа прывесці даследчыкаў да памылковых высноў. Справа ў тым, што часам пячаткі мелі дублікаты вельмі падобныя на арыгінал, якія адрозніваліся незначнымі элементамі (кропкамі, зоркамі, ружамі і г.д.), а магчыма, нават выраблялiся адным і тым жа майстрам. Дублікаты выраблялiся ў розных выпадках: з-за страты або механічнага ізносу пячаткі і г.д. Часам пячаткі ўтрымлівалі аднолькавы гербавы матыў з пэўнай колькасцю элементаў і адрозніваліся менавіта па прапорцыях, што будзе бачна ніжэй на прыкладзе пячатак біскупа Я.Дэдэркі.

Пячаткі менскага біскупа Я.Дэдэркі адпавядаюць яго поўнаму тытулу, які змяняўся пасля надання чарговага ордэна, і падаюцца ў нашым артыкуле згодна тытулу на афіцыйных дакументах (загадах, перадшлюбных экзаменах і інш.) на лацінскай і польскай мовах:

"*IACOBUS IGNATIUS DEDERKO DEI ET APOSTOLICÆ SEDIS GRATIA ECCLESIARUM ROMANO–CATHOLICARUM EPISCOPUS MINSCENSIS ORDINUM AQUILÆ ALBÆ ET SANCTI STANISLAI EQUES*" і "*JAKUB IGNACY DEDERKO RZYMSKO–KATALICKICH KOSCIOŁOW MINSKI BISKUP ORDEROW ORŁA BIAŁ: I S. STANISŁAWA KAWALER*" (да 1808 г.). ("*Якуб Ігнат Дэдэрка Божай і Апостальскае Сталіцы Міласцю Рымска-каталіцкіх касцёлаў біскуп менскі ордэнаў Белага Арла і Святога Станіслава кавалер*").

**Пячатка № 1.**

У полі пячаткі на ордэнскай зорцы французская тарча з каймой шафіраваная пад пурпур з выявай родавага гербу біскупа "*Дэдэркала*".[19] Над тарчай карона з пяццю зубцамі аздобленымі лісцем сельдэрэя. З правага боку мітра, з левага – пастараль (бікупская ляска).



На стужцы пад тарчай вісяць ордэны Святога Станіслава і Белага Арла. Над гербам святарскі капялюш са шнурамі і кутасамі, які адпавядае стану арцыбіскупа.[20] З капялюша на ланцужку над каронай звісае святарскі крыжык. Легенда па колу: "**IACOBUS. IGNATIUS: DEDERKO: DEI: ET APOSTOLICÆ: SEDIS: GRATIA: PRIMUS MINSCENSIS: EPISCOP,*" ("*Якуб Ігнат Дэдэрка Божай і Апостальскае Сталіцы Міласцю першы менскі біскуп*"), Ø 67 мм. Воск чырвоны (1798–1806).

[19] Герб "*Дэдэркала*" ўяўляе сабой у полі невядомага колеру залатую фігуру накшталт літары "*Y*". Над тарчай каранаваны гелм [3, s.98].

[20] Тут і на пячатках № 4–6 памылкова, бо стану біскупа адпавядаў зялёны капялюш на шнурах з абодвух бакоў па шэсць кутасоў (лікам 1:2:3), адпаведна арцыбіскуп меў дзесяць кутасоў (1:2:3:4) зялёнага колеру [4].

Пячатка № 1 мела дублікат, на якой легенда выглядае крыху інакш: “*: IACOBUS. IGNATIUS: DEDERKO: DEI: ET: APOSTOLICÆ: SEDIS: GRATIA: PRIMUS: MINSCENSIS: EPISCOP,*”. Акрамя таго, шафіроўка тарчы і стужак была на дублікаце больш шчыльная, а пастараль крыху шырэй і з пункцірам [5, а.73 адв.; 6, а.5, 7].

**Пячатка № 2.**

У полі пячаткі чатырохчастковая тарча з выявамі гербаў: у 1-ай – “*Дэдэркала*”, у 2-ой – “*Бродзіц*” (герб маці Кляры Міравіцкай), у 3-яй – “*Трубы*” (герб бабкі па бацьку Ружы Войны), у 4-ай – “*Равіч*” (герб невядомай бабкі па маці). Авальны сэрцавы шчыт мае манаграму “*ID*” (“*Iacobus Dederko*”). Над тарчай шляхецкая карона. З правага боку мітра, з левага – пастараль. На стужках унізе пад тарчай вісяць ордэны Святога Станіслава і Белага Арла. Над гербам капялюш са шнурамі і кутасамі, які адпавядае стану біскупа.[21] 28x30 мм. Сургуч чырвоны (1804) [5, а.75] .

**Пячатка № 3.**

На васьміканцовай ордэнскай зорцы французская тарча падзелена ў пас, верхняе поле, у сваю чаргу, падзелена ў слуп. У 1-ым полі – герб “*Дэдэркала*”, у 2-ім – “*Бродзіц*”, у 3-ім ніжнім вялікім вензель “*ID*”, над зоркай – шляхецкая карона. Вакол зоркі стужкі з ордэнамі Святога Станіслава і Белага Арла, між якімі на ланцужку вісіць святарскі крыжык. 18x20 мм. Сургуч чырвоны (1804) [7, а.13, 35 адв.].

**Пячатка № 4.**

У полі пячаткі французская тарча, якая мае чатырохчастковы герб (гл.пячатку № 2), над якім шляхецкая карона. З левага боку мітра, з правага – пастараль.[22] Вакол тарчы стужкі з ордэнамі Святога Станіслава і Белага Арла. Над гербам святарскі капялюш са шнурамі і кутасамі, які адпавядае стану арцыбіскупа. З капялюша на ланцужку звісае над каронай святарскі крыжык. 28x32 мм. Сургуч буры [8, а.5], курадымная [9, а.34, 36 адв., 38 адв.] (1803–1807).

**Пячатка № 5.**

Адрозніваецца ад пячаткі № 4 толькі тым, што тут далучаны ордэн Святой Ганны. 28x32 мм. Курадымная (1810) [9, а.43, 62].

**Пячатка № 6.**

У полі пячаткі чатырохчастковая ромбавая тарча[23], на якой змешчаны гербы: у 1-ай частцы – “*Дэдэркала*”, у 2-ой – “*Бродзіц*”, у 3-яй – “*Равіч*”, у 4-ай – “*Трубы*”.[24] Авальны сэрцавы шчыт мае манаграму “*ID*”. Пад тарчай на ланцужках вісяць два ордэнскія крыжы.[25] Тарча знаходзіцца пад гарнастаевым плашчом са шляхецкай каронай. Над плашчом з правага боку мітра, з левага – пастараль. З правага боку на стужцы з дэвізам “*INCITAT PRÆMIANDO*” вісіць ордэн Белага Арла, на на другой – з дэвізам “*PRO FIDE REGE ET LEGE*” – ордэн Святога Станіслава.[26] З левага боку на стужцы з дэвізам “*AMANT (IBUS) IUSTIT (IAM) PIETATEM FIDEM*”[27] вісіць ордэн Святой Ганны I ступені, на другой – з дэвізам “*ПОЛЬЗА, ЧЕСТЬ И СЛАВА*” – ордэн Святога Ўладзіміра II ступені. Пераплеценыя ў падвойную васьмёрку стужкі ў трох нішах зверху ўніз з правага боку маюць аднагаловага арла (Карона), “*Пагоню*” (ВКЛ) і ордэнскую васьміканцовую зорку. З левага боку – дзвухгаловага арла (Расійская імперыя), выяву кароны і такую ж самую зорку. Акрамя таго, над стужкамі змешчаны яшчэ дзве васьміканцовыя зоркі. Над гербам – капялюш са шнурамі і

---

[21] Адзіная з шэрагу пячатак, на якой капялюш адпавядае сапраўднаму стану Я.Дэдэркі.

[22] Памылка майстра, які вырабляў матрыцу пячаткі.

[23] Такая форма тарчы ў геральдыцы была больш уласцівая жанчынам.

[24] Гербы “*Равіч*” і “*Трубы*” параблытаны месцамі.

[25] Хутчэй за ўсё, гэта – ордэны Святога Станіслава і Белага Арла, якія памылкова былі пакінуты пад тарчай (гл.пячаткі № 1–4). Але гэта маглі быць і ордэнападобныя знакі, якія існавалі ў Польшчы ў XVIII–XIX ст. для ўзнагароды вузкага кола канонікаў. Некаторыя з іх нагадвалі па форме ордэн Белага Арла.

[26] Ордэны Святога Станіслава і Белага Арла вісяць не на сваіх стужках. Дэвіз першага выглядаў так: “*PRÆMIANDO INCITAT*” [10; 11].

[27] Дэвіз ордэну Святой Ганны быў такі: “*AMANTIBUS IUSTITIAM PIETATERET FIDEM*” [12].

кутасамі, які адпавядае стану арцыбіскупа. З капялюша на ланцужку звісае над каронай святарскі крыжык. Ø 42 мм. Воск чырвоны (1812–1813) [9, а.46, 50, 51 адв.].

Першая пячатка Я.Дэдэркі з бікупскімі кляйнотамі з'явілася на працягу першых месяцаў пасля яго прызначэння на пасаду. Апошняя, якая траплялася нам, датуецца 1813 г. Пазнейшыя дакументы з яго тытулам (шлюбныя экзамены) ідуць пад пячаткамі з дзвухгаловым арлом Расійскай імперыі. 24 лютага 1814 г. Вышэйшым Рэскрыптам на імя Мітрапаліта С.Богуша Сестранцэвіча было прапанавана менскага біскупа ад кіравання адхіліць і адклікаць ў С.-Пецярбург для разгляду спраў аб ім. Дакументы аб дзеяннях Я.Дэдэркі падчас вайны 1812 г. былі дастаўлены Мітрапаліту з Галоўнага ўпраўлення Духоўных Спраў іншаземных веравызнанняў. Яго прыхільнасць да Напалёна I і прадузятасць у адносінах да праваслаўнай царквы выклікалі адмоўную рэакцыю расійскага імператара Аляксандра I. 16 мая 1816 г. Я.Дэдэрка быў пазбаўлены пасадаў і адпраўлены з Менску на Валынь пад нагляд луцкага біскупа. На яго месца да адпаведнага Ўказа быў прызначаны С.Богушам Сестранцэвічам і зацьверджаны імператарам пралат Пазьняк. Я.Дэдэрку на ўтрыманне было выдаткавана 2 000 руб., якія ён атрымліваў да канца свайго жыцця. Памёр ён 24 снежня 1829 г. [13, с.89].

### Літаратура і крыніцы:


1. НГАБ у Менску, ф.1781, воп.26, спр.2.
2. Шпунт А. Невядомыя пячаткі.// Наша вера.– 1988.– № 2.
3. Polska encyklopedja szlachecka.– Warszawa, 1935.– T.2.– 470 s.
4. Warnecke F. Heraldisches Handbuch.– Görlitz, 1880.
5. НГАБ у Менску, ф.1781, воп.27, спр.103.
6. НГАБ у Менску, ф.937, воп.4, спр.119.
7. НГАБ у Менску, ф.1781, воп.27, спр.287.
8. НГАБ у Менску, ф.1781, воп.27, спр.276.
9. НГАБ у Менску, ф.1547, воп.1, спр.2.
10. Тройницкий С.Н. Гербовые девизы русского, польского, финляндского, прибалтийского дворянства.– СПб., 1910.
11. Спасский И. Иностранные и русские ордена до 1917 г.– Л., 1963.
12. Дуров В.А. Ордена России.– М., 1993.
13. Рэлігія і царква на Беларусі: Энц. давед.– Мн.: БелЭн, 2001.– 368 с.


*Андрэй Леўчык.*

## Жодзішкі Ашмянскага павета і яго ўладальнікі ў XVI–пачатку XX ст.


In article "*Žodziški of Ašmiana region and its owners in 16th-beginning 20th centuries*" **Herman Brehier** investigate a history at first manors, and then miastečka Žodziški from the first mention it in sources in 1511 to the beginning 20th centuries. The author restores a circuit of events naming among the owners of Žodziški Mordas, Oscik, princes Višniaviecki, Čartaryjski, Komar familes and others. In the beginning 20th centuries Žodziški belonged Bakšanski family.


Першая згадка пра старажытнае паселішча Жодзішкі паходзіць з 1511 г., калі вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт I сваім прывілеем дазволіў маркаўскаму намесніку Мордасу Мішкавічу[28] арганізоўваць таргі і будаваць корчмы ў сваім маёнтку Жодзішкі [1, с.208, № 184; 15, с.371]. У наступным, 1512 г., Мордас са сваёй жонкай Уллянай запісаў замак Жодзішкі троцкаму ваяводзе, дворнаму маршалку Грыгорыю Станіслававічу Осцікавічу (Осціку), што падцвердзіў кароль Жыгімонт I [1, с.196, № 39]. Пасля смерці Мордаса, у 1515 г., Осцік атрымаў ад караля яшчэ адное пацвярджэнне на запіс яму Мордасам двара і горада Жодзішкі з таргамі, кірмашамі, корчмамі і перавозам на рацэ Вялля [1, с.209, № 200].

[28] Мордас Мішкавіч таксама фігуруе ў дакументах пад поўным імем Станіслаў Мішкавіч Мордас і згадваецца з канца XV ст.

Пазней, ужо ў 1530-я г., маёнткам Жодзішкі валодалі луцкі і берасцейскі біскуп Юры Фальчэўскі і ваявода Гурынскі, якія яго прадалі каля 1540 г. чачэрскаму і прапойскаму дзяржаўцы князю Івану Міхайлавічу Вішнявецкаму. Вішнявецкі адразу ж запісаў маёнтак сваёй жонцы Магдалене (Марыі) Дэспатаўне, на якой ажаніўся (ў другі раз) у 1538 г. Хутка Вішнявецкі памёр (у 1542 г.), а Магдалена выйшла замуж за князя Аляксандра Фёдаравіча Чартарыйскага, будучага валынскага ваяводу (з 1566 г.). 18 снежня 1551 г. Магдалена (у дакуменце – Марыя) Дэспатаўна падаравала свайму мужу Чартарыйскаму замак і горад Жодзішкі з дварамі Аўрамаўскім і Занорацкім [2, s.25–27, 563–564].

17 снежня 1569 г. князь А.Ф.Чартарыйскі напісаў тэстамент, у якім горад і замак Жодзішкі запісаў у пажыццёвае валоданне жонцы Магдалене Дэспатаўне, пасля смерці якой маёнтак павінен быў перайсці ў спадчыну іх сыну князю Міхалу Аляксандравічу Чартарыйскаму [3, Ч.7, Т.1, с.17–19]. Перад сваёю смерцю, 13 ліпеня 1571 г., Магдалена напісала тэстамент, але ў ім Жодзішкі не згадваюцца, відаць, маёнтак ужо трымаў сын князь Міхал. У тэстаменце згадваецца яе запіс 10 копаў грошаў праваслаўнай царкве ў Жодзішках [3, Ч.7, Т.1, с.28–31].

Невядома якім чынам, але маёнтак Жодзішкі пазней вярнуўся да сына былога ўласніка князя І.М.Вішнявецкага – валынскага ваяводы князя Андрэя Іванавіча Вішнявецкага (памёр у 1584 г.). Пасля смерці яго жонкі Яўфіміі Вярбіцкай (памёрла ў 1589 г.), 5 студзеня 1593 г. іх дочкі падзялілі бацькоўскія маёнткі, прычым двор і мястэчка Жодзішкі з фальваркамі Абрамаўскім і Занорацкім дасталіся Гальшцы Яўфіміі Андрэеўне Вішнявецкай і яе мужу троцкаму ваяводзе Мікалаю Крыштафу Радзівілу, князю на Алыцы і Нясвіжы [2, s.567–568; 4, № 208].

У пачатку XVII ст. Жодзішкамі валодаў Геранім (Яраш) Мацеявіч Комар, пасля смерці якога маёнтак адзедзічыў яго брат каралеўскі ротмістр Крыштаф Комар[29]. Апошні заснаваў у Жодзішках касцёл Святой Тройцы і 12 верасня 1612 г. выдаў яму фундацыйны дакумент, а 20 снежня таго ж года фундаваў пры касцёле плябанію і школку [6, s.814]. Пасля яго смерці маёнткам валодала яго ўдава Агнешка Ярашаўна Чарніцкая (яшчэ ў 1631 г.). Пазней Жодзішкі атрымаў у спадчыну іх малодшы сын Уладзіслаў Комар, ашмянскі земскі суддзя [5, Т.10, s.357–358]. У 1677 г. паводле "*Тарыфы пагалоўнага*" Ашмянскага павета ў яго маёнтку Жодзішкі налічвалася 50 чалавек падданых [7, а.50 адв.]. З жонкай княжной Ізабэляй Дольскай Уладзіслаў Комар пакінуў дачку Барбару, жонку Казімера Мінкевіча, ашмянскага падстаросты, пазней ашмянскага падстолія (ажаніліся каля 1684 г., ён памёр у 1698 г.). Паводле "*Тарыфы падымнага*" Ашмянскага павета 1690 г. у іх маёнтку налічваўся 101 сялянскі дым [5, Т.10, s.358; 8, s.145].

У Казімера Мінкевіча і Барбары Камароўны ў 1685 г. нарадзіўся адзіны сын Адам Мінкевіч, які ў 1700 г. уступіў у манаскі ордэн езуітаў. Ён, як адзіны спадкаемца бацькоўскіх маёнткаў, угаварыў маці падараваць Жодзішкі езуіцкаму ордэну. 9 кастрычніка 1703 г. яны выдалі фундушавы дакумент на заснаванне ў мястэчку езуіцкага калегіюма з запісаннем яму ў фундуш маёнтка Жодзішкі з навакольнымі фальваркамі [9, а.1794–1803]. З-за ваенных дзеянняў і моравых пошасцяў на тэрыторыі ВКЛ езуіты з'явіліся ў Жодзішках толькі ў 1708 г., калі 15 снежня фундатары падпісалі ўзноўлены фундушавы дакумент [10, Т.4, cz.4, s.1666].

У 1709–1762 г. езуіцкі калегіюм у Жодзішках узначальвалі віцэ-рэктары, а пазней – рэктары. У 1709 г. спачатку была адчынена рэзідэнцыя, якой у 1710 г. быў нададзены статус калегіюма. Яго насельнікі спачатку размясціліся ў старым панскім двары, які складаўся з трох драўляных будынкаў, злучаных арачнымі пераходамі, дзе яны заснавалі дамовую капліцу. Першым віцэ-рэктарам стаў Антоні Шыпіла, які пры калегіюме адкрыў школку з выкладаннем паэтыкі і рыторыкі. У 1709 г. акрамя віцэ-рэктара ў калегіюме жылі міністр Уладзіслаў Дзягілевіч, прафесар рыторыкі і прэфект школкі Ян Фрэйндт, прафесар паэтыкі і граматыкі магістр Казімер Чарнеўскі і эканом маёнтка Станіслаў Залескі. У 1756 і 1772 г.

---

[29] Усе аўтары называюць апошняга сынам Гераніма, але А.Банецкі спасылаецца на каралеўскі судовы вырак 1631 г., адкуль робіць выснову, што Крыштаф таксама сын Мацея Комара [5, Т.10, s.357].

таксама выкладалі філасофію [10, T.4, cz.4, s.1666]. Паводле “*Тарыфы падымнага*” Ашмянскага павета 1717 г. у езуіцкім маёнтку Жодзішкі налічваўся 101 сялянскі дым [11, а.28 адв.].

Трохпавярховы мураваны будынак калегіюма будаваўся напрацягу шмат гадоў. Драўляны касцёл пры калегіюме быў пабудаваны ў 1722–1725 г. пры віцэ-рэктары Юрыі Палубінскім, а асвячоны ў 1727 г. віленскім біскупам Каралем Пятром Панцажынскім. Літоўскі правінцыял езуітаў Багушэвіч ахвяраваў у вялікі алтар касцёла абраз Божай Маці італьянскага мастака, прыгожы арган і іншае.

Пасля смерці караля Аўгуста ІІ, у 1734–1735 г. разгарэлася вайна паміж рознымі палітычнымі групоўкамі за ўладу. Ашмянская шляхта, а таксама і жодзішскія езуіты падтрымалі літоўскую канфедэрацыю на чале з князем Марцыянам Агінскім і Людвікам Пацеям, якія высоўвалі на каралеўскі прастол Станіслава Ляшчынскага. Процілеглую групоўку, якая высоўвала на трон будучага караля Аўгуста ІІІ, падтрымала Расія і яе войскі ўварваліся на тэрыторыю ВКЛ, пустошачы ў тым ліку і Ашмянскі павет. Ратуючыся, віцэ-рэктар Жодзішскага калегіюма Антоні Вайніловіч з 12-ю манахамі схаваліся ў Наваградскім езуіцкім калегіюме. Расійскія войскі спустошылі калегіюм у Жодзішках, яго маёнткі і вёскі. Пасля вайны пабудовы і гаспадарка калегіюма зноў пачалі ўзнаўляцца, і ў 1755 г. віцэ-рэктар Ян Корсак распачаў пабудову вялікага мураванага касцёла, на што былі выкарыстаны ахвяраванні як самога віцэ-рэктара, так і 105 000 злотых, размешчаныя на вёсцы Ралаўцы троцкага кашталяна Тадэвуша Агінскага, і 3 000 злотых ашмянскага падстаросты Тызенгаўза. На гэтыя грошы былі набытыя 160 000 штук цэглы і пачата муроўка фундамента. Наступны віцэ-рэктар Віктар Шчуцкі (1 студзеня 1762 г. быў прызначаны на пасаду рэктара калегіюма), у 1760 г., атрымаўшы ад палкоўніка Розэнфельда 2 000 злотых і ад шляхціча Матушэўскага 1 500 злотых, закончыў мураванне фундамента і пачаў выводзіць сцены касцёла. Але неспакойныя часы для Рэчы Паспалітай 1766–1770 г. пад час грамадзянскай вайны і маскоўскай экспансіі перапынілі будаванне касцёла назаўсёды. Калегіюм і яго маёнткі былі зноў спустошаны войскамі расійскага генерала Апраксіна.

У 1770 г. рэктар калегіюма Станіслаў Жаба дадаткова ўвёў у мясцовай школцы курсы французскай і нямецкай моваў і матэматыкі, а з 1772 г. аднавіў выкладанне філасофіі. Таксама ў калегіюме жылі два казнадзея, а з 1727 г. – місіянер на Ашмянскі павет.

Віцэ-рэктарамі Жодзішскага калегіюма былі наступныя ксяндзы-езуіты: Антоні Шыпіла ў 1709–1716 г., Ян Ярашовіч да 1719 г., Казімер Матэлякоўскі да 1722 г., Юры Палубінскі да 1728 г., Антоні Вайніловіч да 1736 г., Ян Зржэльскі да 1739 г., Адам Мінкевіч, фундатар калегіюма, да сваёй смерці 18 сакавіка 1740 г., Міхал Качаноўскі да 1744 г., Юры Сулістроўскі да 1752 г., Казімер Вярбіцкі да 1755 г., Ян Корсак да 1759 г., Віктар Шчуцкі да 1761 г. Рэктарамі былі: Віктар Шчуцкі з 1 студзеня 1762 да 1766 г., Ігнат Жаба да 1769 г., Станіслаў Жаба да 1772 г., Казімер Прэцішэўскі да 1773 г.

Па скасаванні езуіцкага ордэна ў 1773 г. будынкі і маёнткі Жодзішскага калегіюма былі перададзены ў фундуш новастворанай Адукацыйнай камісіі ВКЛ, якая з дазволу караля перадала маёнтак у трыманне Шчаснаму Патоцкаму. Той хутка перадаў правы валодання маёнткам графу Тэадору Ляскарысу, палкоўніку войск ВКЛ. За карыстанне маёнткам ён выплочваў у фундуш Адукацыйнай камісіі 22 000 злотых штогод. Ляскарыс з будынка калегіюма ўтварыў палац, які выкарыстоўваўся пад жыллё толькі часткова. Драўляныя будынкі былой школкі выкарыстоўваліся пад чалядню [10, T.4, cz.4, s.1666–1669].

Паводле “*Тарыфы падымнага*” Ашмянскага павета 1790 г. у паезуіцкім маёнтку Жодзішкі, які трымала ўжо ўдава графа Ляскарыса, налічвалася 93 сялянскія дымы і 2 карчмы, выплочвалася 558 злотых падымнага падатку штогод у Скарб ВКЛ [12, а.14].

Паводле некаторых аўтараў у канцы XVI ст. у Жодзішках панамі Кішкамі быў заснаваны мураваны кальвінскі збор, які заняпаў ужо ў пачатку XVII ст., і яго будынак прастаяў паўразбураным да пачатку XIX ст., калі мясцовы каталіцкі пробашч Станевіч разабраў яго муры і з яго цэглы пабудаваў (або перарабіў з яго рэштkaў) новы мураваны каталіцкі касцёл Святой Тройцы замест старога драўлянага [10, T.4, cz.4, s.1668; 6, s.814].

Але існаванне кальвінскага збора ў Жодзішках пакуль не падцвярджаецца дакументальна, а таксама вядомыя даследчыкі гісторыі кальвінізму ў ВКЛ і Польшчы Ю.Лукашэвіч і Г.Мерчынг увогуле не згадваюць пра факт існавання гэтага збора [13].

Як гаварылася вышэй, каталіцкі касцёл Святой Тройцы ў Жодзішках быў фундаваны ў 1612 г. і паводле розных аўтараў згадваецца або драўляным, або мураваным. З-за немагчымасці вывучэння інвентароў касцёла XVIII ст., якія захоўваюцца ў Бібліятэцы Віленскага універсітэта, даць дакладнае апісанне касцёла таго часу пакуль не можам. У 1731 г. да Жодзішскай каталіцкай парафіі належала 2 125 парафіян. Пры касцёле ў 1781–1798 г. існавала парафіяльная школка. У 1781 г. яе наведвалі навучэнцы: 4 шляхціча, 5 мяшчанаў і 7 сялянаў. У 1904 г. коштам ксяндза Дзібеля і парафіянаў да касцёла былі прыбудаваны бакавыя капліцы. У 1912 г. у парафіі налічвалася 3 000 парафіянаў. У 1815 г. у Жодзішках на могілках была пабудавана драўляная капліца, якая не існавала ўжо на пачатку XX ст. [14, s.207–208, 291, 495].

У XIX–пачатку XX ст. маёнтак Жодзішкі належаў Бакшанскім. Мястэчка Жодзішкі адносілася да Дубатоўскай воласці Свянцянскага ўезда Віленскай губерні. У 1859 г. у мястэчку было 39 дамоў, 222 жыхара; у 1865 – 124 рэвізскія душы (мужчынаў). У канцы XIX ст. у мястэчку 527 жыхароў, мураваны каталіцкі касцёл Святой Тройцы, яўрэйскі малітоўны дом. У каталіцкай парафіі 4 115 парафіянаў. У фальварку Жодзішкі былі адзін жылы дом, 18 жыхароў, бровар і цагельня [6, s.814]. У 1897 г. у маёнтку генеральскай удавы Наталлі Іванаўны Бакшанскай Жодзішках згадваецца бровар з 8-ю рабочымі [10, T.4, cz.4, s.1669]. У 1905 г. у мястэчку было 516 жыхароў (245 мужчынаў і 261 жанчына), 716 дзесяцінаў зямлі; у маёнтку – 26 жыхароў (14 мужчынаў і 12 жанчынаў), 1 011 дзесяцінаў зямлі.

### Літаратура і крыніцы:


1. Описание документов и бумаг, хранящихся в Московском архиве Министерства Юстиции.– М., 1915.– Кн.21.
2. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku.– Warszawa, 1895.– 698 s.
3. Архив ЮЗР.– Киев, 1859–1911.– Ч.1–8.
4. АЮЗР.– СПб., 1863.– Т.1.
5. Boniecki A. Herbarz Polski: W 16 t.– Warszawa, 1899–1913.
6. Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich.– Warszawa, 1895.– T.14.– 938 s.
7. ЛДГА, ф.СА, спр.3723.
8. Rejestry podymnego WkL. Wojewodstwo Wileńskie 1690 r.– Warszawa, 1989.
9. ЛДГА, ф.СА, спр.50.
10. Załęski S. Jezuici w Polsce.– Kraków, 1905.
11. НГАБ у Менску, ф.1776, воп.1, спр.77.
12. ЛДГА, ф.СА, спр.3368.
13. Łukaszewicz J., M[erczyng] H. Dzieje kościołów wyznania helweckiego w Litwie.– Poznań, 1842.
14. Kurczewski J. Biskupstwo wileńskie od jego założenia do dni obecnych.– Wilno, 1912.
15. Шаблюк В. Жодзішкі.// ЭГБ.– Мн.: БелЭн, 1996.– Т.3.– С.371.


*Герман Брэгер.*

## Матэрыялы да генеалогіі і эпіграфікі ў гарадзенскім Фарным касцёле.


In article “*The Materials on genealogy and epigraphic in Fara Church in Horadnia*” **Jury Hardziejeŭ** are described by two tomb plate – Francišak Boŭfał (has died in 1805) and Kryštaf Kazimier Flaryjan Micuta (has died after 1750). The author makes attempt to restore the biographies of these people, results the facts of their participation in political and public life of Great Duchy of Lithuanian, restores them genealogies.


У гарадзенскім Фарным касцёле знаходзіцца памятная пліта, прысвечаная прадстаўніку аднаго са славутых гарадзенскіх шляхецкіх родаў – Францішку Боўфалу. Пачынальнікам гэтага рода лічыцца гаспадарскі пісар Васька Дарашкевіч, якому Аляксандар Ягайлавіч у 1504 г. надаў права на кавалак леса над рэчкай Ласасянкай пад Горадняй. У кнігах гарадзенскага земскага суда XVI ст. захавалася шэраг згадак пра сыноў Ваські: Боўфала і Пракопа Хваліміра, ўладальніка маёнтку Ласосна.

Дакладна вядома, што ў першай палове XVI ст. Боўфалы былі праваслаўнымі. Аб гэтым сведчыць факт пахавання ў праваслаўнай царкве на гарадзенскім Падоле Пракопа Боўфала, які ў сваім тэстаманце запісаў: "*...тогды жона моя Ганна мает тело мое грешное поховати почстиве, яко то належыт, у церкви, у Городне на Подоле у Чесного Хреста...*" [1, с.438]. Невядома, калі Боўфалы пачалі змяняць сваю канфесійную прыналежнасць і перайшлі на каталіцызм. Паводле даных Браніслава Боўфала, яшчэ ў XVIII ст. некаторыя прадстаўнікі роду былі праваслаўнага і ўніяцкага веравызнання [2, s.8, 21].

На працягу XVI–XVIII ст. Боўфалы займалі пасады ў цэнтральных дзяржаўных установах Рэчы Паспалітай, засядалі ў земскіх і гродскіх судах Гарадзенскага павета [3, s.90–92]. Яны валодалі маёнткамі, размешчанымі непадалёку ад Горадні, а таксама нерухомасцю ў самым месце.

Да найбольш каларытных фігураў грамадска-палітычнай сцэны рэгіёну ў другой палове XVIII ст. належаў Францішак Боўфал. З 1766 г. ён займаў пасаду стражніка і пісара Гарадзенскага павета, у 1770 г. быў падстоліям, а ў 1773 г. – ужо стольнікам гэтага ж павета. У 1774 г. ён быў намінаваны лоўчым літоўскім. У 1776 і 1778 г. абіраўся дэпутатам (паслом) на сойм. Захавалася некалькі ягоных парламенцкіх прамоваў [4, s.296–297]. У 1786 г. Францішак Боўфал прэтэндаваў на пасаду гарадзенскага старосты, а ў 1793 г. – пасля стварэння Гарадзенскга ваяводства – гарадзенскага кашталяна. Спробы гэтыя поспеху не мелі. Францішак Боўфал належаў да палітычнай партыі падскарбія надворнага літоўскага Антонія Тызенгаўза, а пасля ягонага ўпадка стаў на баку Касакоўскіх. У 1790 г. пакінуў грамадска-палітычную сцэну, каб праз чатыры гады стаць маршалкам шляхты Сакольскага павета. Францішак Боўфал памёр у 1805 г. у маёнтку Ласосна [5, s.378].

У другой палове XVIII ст. у Рэчы Паспалітай праводзіліся буйнамасштабныя палітычныя, сацыяльна-гаспадарчыя і культурныя рэформы. Пераўтварэнні закранулі таксама гарады, у мэтах добраўпарадкавання якіх засноўваліся парадкавыя камісіі. У гэты працэс актыўна ўключыўся Францішак Боўфал. У 1776–1794 г. ён прымаў актыўны ўдзел у працах гарадзенскай камісіі "*Добрага Парадку*" ("*Boni Ordinis*"), якая была заснавана ў 1776 г., а потым – Цывільна-вайсковай парадкавай камісіі, якая функцыянавала ў 1790–1792 г. Вядома, што на пачатку 1790 г. ён выконваў пасаду старшыні гэтай камісіі [6, а.1–2].

Зважаючы на заслугі Franіцішка Боўфала, нашчадкі на пачатку XX ст. вырашылі ўвекавечыць яго памяць. У гэтых мэтах у 1913 г. праўнук славутага продка – Браніслаў – атрымаў дазвол на размяшчэнне памятнай пліты ў гарадзенскім Фарным касцёле. Першая сусветная вайна перашкодзіла ажыццяўленню гэтых планаў. Доўгі час табліца з пяшчаніка знаходзілася ў склепах касцёла. І толькі ў 1924 г. адбылося яе ўмураванне ў гарадзенскай Фары, у месцы скрыжавання левага нефа з трансэптам [7, а.2, 9].

Пад партрэтам Францішка Боўфала змешчаны картуш з уласным гербам Боўфалаў, а пад ім вялікі надпіс на латыні: "*Francisco Doroszkiewicz Bouffałł Venatori Curiae M. D. Lith 1773–1790 Praefecto Wierboviensi, marschalco Socolscensi, commissionis Boni Ordinis Grodnensis Bene Merito Praesidi viro Clarissimo Humanissimo Grato Posuit proles A.D.MCMXIII*" [8, c.37].

У тым жа Фарным касцёле, ля помніка Антонія Тызенгаўза, перад алтаром з іконай Маці Боскай Студэнцкай знаходзіцца склеп прадстаўніка яшчэ аднаго старажытнага гарадзенскага шляхецкага роду – Крыштафа Казімера Фларыяна Міцуты. Побач пахавана яго жонка Эўфразына з роду Калантаяў, дачка ваўкавыскага падкаморага [9, s.384].

Упершыню Міцуты ўпамінаюцца ў крыніцах XVI ст. Гарадзенскім ляснічым у 1540 г. быў Пётр Міцута. У 1555–1560 г. ён згадваецца харужым, а ў 1551–1560 г. – земскім суддзёй [10, с.148–149, 201, 249, 401, 416, 418–419]. У дакументах 1565–1567 г. упамінаецца "*...хоружий на он час бывший Городенский...*" Богуш Пятровіч Міцута, які быў уладальнікам маёнткаў Ожа і Малышчын [11, с.346, 674].

Пра пахаванага ў касцёле гарадзенскага кляштару езуітаў Крыштафа Казімера Фларыяна Міцуту вядома наступнае. Ён быў удзельнікам Паўночнай вайны [9, s.384], у 1707–1715 г. займаў пасаду земскага падсудка Гарадзенскага павета, а ў 1721–1745 г. быў

гарадзенскім падстоліям. У 1704–1735 г. Крыштаф Казімер Фларыян Міцута згадваецца гарадзенскім падкаморыям [12, с.18, 20, 32, 37, 44, 82, 104, 107, 115–116, 157–158, 165, 167, 174, 192, 203, 211, 214, 216, 218, 234, 251, 270, 277, 183, 282–283, 297–298, 299, 304, 308, 311, 440, 505, 507, 515, 521, 526, 531, 533, 536]. Прымаў удзел ў выбарах караля ў 1733 г. У Горадні Міцута валодаў сядзібай побач бернардынскага кляштару і праўдападобна дваром на занёманскім прадмесці [13, а.65–67; 12, с.276]. У 1750 г. ён ужо не жыў [12, с.548].

Сёння надпіс на яго надмагільнай пліце моцна зацёрты. Прачытаць яго практычна немагчыма. Змест надпісу паспеў прачытаць і запісаць Юзаф Ядкоўскі, які апублікаваў яго ў сваім папулярным нарысе "*Grodno*" выдадзеным у Вільні ў 1923 г.: "*VRGITE ADIUDICI MORTUI ...UM DE DOM WIECZNOŚCI POZNYM WIEKOM GROB OTWORZI ŻE GRODZIENSKI PODKOMORZY KAZIMIERZ NA WAHANOWIE MICUTA PO ZMARŁEY GŁOWIE TU NAZNACZYL PLAC POKOIU ZAWSZE W RADACH MĘŻNY W BOIU SWIADCZĄ DZIEŁA DZIAŁA GROTY IAKIEY W WOYSKU MĄŻ OCHOTY ZA DWÓCH KRÓLÓW CNY WOIOWNIK DZIELNY ŻOŁNIERZ Y PUŁKOWNIK ZBROYNYCH HUFCOW WRAZ Z ORĘŻEM WRAZ PRZY WIERZE SŁAWNYM MĘŻEM NA SEYM POSŁEM Z WOLNYM GŁOSEM W TRYBUNAŁACH PRAWDY LOSEM SDZIA ZAMKNĄŁ WIEK ZRENICĄ Z KOŁŁĄTAIOW ŻYŁ KOTWICĄ IMIĘ SAMEY EUFROZYNA SŁAWĄ Y CNOTĄ HEROINA LEŻĄ W PARZE KTO IE MIJA PROSIM O ZDROWAŚ MARIA HOC CI US OBIIT MEN AO DIE... 17... ... ... ... ... AM SSS TRIGA... UM... UPPEDITATUR HONORE*" [14, s.93].

### Літаратура і крыніцы:


1. АВАК.– Вильно, 1894.– Т.XXI.– 118 с.
2. Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej.– Poznań, 1896.– T.XVIII.– 263, [VII] s.
3. Boniecki A. Herbarz polski.– Warszawa, 1900.– T.2.– Cz.1.– 396 s.
4. Estreicher K. Bibliografia polska.– Kraków, 1894.– T.XIII.– 502, [VI] s.
5. Mościcki H. Bouffał-Doroszkiewicz Franciszek.// PSB.– Kraków, 1936.– T.II.– S.378.
6. НГАБ у Менску, ф.1887, воп.1, спр.1.
7. ЛДГА, ф.694, воп.5, спр.828.
8. Амелька С., Шаланда А. Геральдычныя, генеалагічныя, эпіграфічныя крыніцы: Горадня [Пліта Боўфала].// Герольд Litherland.– Горадня, 2001.– № 1.– С.37.
9. Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej.– Warszawa, 1913.– T.X.– 392 s.
10. АВАК.– Вильно, 1889.– Т.XVII.– 559 с.
11. РИБ.– Петроград, 1915.– Т.33.– 1378 слп.
12. АВАК.– Вильно, 1874.– Т.VII.– 614 с.
13. НГАБ у Менску, ф.1761, воп.1, спр.9.
14. Jodkowski J. Grodno.– Wilno, 1923.– 119 s.


*Юры Гардзееў.*

## З гісторыі барацьбы жыхароў мястэчка Крынкі за свае правы ў першай палове XIX ст.


In article "*From a history of struggle of the inhabitants of miastečka Krynki for the rights in first half 19th centuries*" **Vital Karnialuk** consider poorly known events of struggle of the inhabitants of Krynki for the right to refer to as the townspeople. It was lost by them after the third units of Republic (Reč Paspalitaja) in 1795, when Krynki have come in structure of the Russian empire and from miastečka with Magdeburg Law turned to private possession, and inhabitants from the free townspeople - in the dependent peasants. The struggle for lost freedom became their main purpose in first half 19th centuries.


Барацьба прыгонных сялянаў супраць сваіх паноў – агульнае месца ў гісторыі феадальных адносінаў. Сродкі і формы яе ў Крынках не вызначаюцца чымсьці асаблівым. Тыя ж скаргі, позвы, дапісы ў розныя ўстановы ўлады. Сялянскія прашэнні траплялі ў губернатарскія канцылярыі ў вялікай колькасці. Неаднаразова сяляне накіроўвалі да губернатара "*хадакоў*". Часам звярталіся да генерала-губернатара або апелявалі намесніку цара вялікаму князю Канстанціну.[30] Але якраз з гэтай старонкі гісторыі Крынак бачыцца

[30] Чепко В.В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в.– Мн., 1972.– С.24.

важным пачаць апавяданне пра яго час пад Расіяй. Анісімовічы, Кішкелі, Міклашэвічы, Яновічы, Скроўбы, Кузьмы, Бяганскія… Прозвішчы сучасных крынкаўцаў. Ці не важна даведацца, што ў сучасных жыхароў цячэ кроў тых абываціеляў Крынак, якія мелі рашучасць кідаць у вочы match a кшталту ўладарам (аж да цара!) праўду аб жыцці і ўпарта патрабаваць годнасці для сябе. Ніжэй згаданыя падзеі стапяцідзесяцігадовай даўніны – напамін пра такія ўчынкі крынкаўцаў.

На двары быў жнівень 1862 г. Спякотны час збору ўраджаю, калі кожны дзень на ўліку. Хто, як не сяляне ведалі кошт кожнай хвіліны гэтай пары. Аднак, якраз у такі апошні жнівеньскі дзень тагачасны гарадзенскі губернатар Іван Уладзіміравіч фон Галер, які заняў гэтую пасаду чатыры месяцы назад (што было якраз праз год пасля вядомага лютаўскага маніфэсту аб скасаванні прыгону), атрымаў пасланне са штабу корпусу жандараў, у якім адзначалася: сяляне Крынкаўскага сельскага таварыства памешчыка Аляксандра Ліпхарта (і яшчэ Парэцкага) не сталі выконваць частку павіннасцяў і, ўвогуле, не слухаюць нікога з тых, хто з пазіцыі сваіх пасадаў спрабаваў "*неаднаразова растлумачыць ім "марнасць" учынку*".[31] Гэтак Крынкі, як дразга, мулялі ўжо не першаму гарадзенскаму кіраўніку.

Вось і зноў словы мясцовага прыстава, міравога пасярэдніка крынкаўскага ўчастка Г.Шантэра, таксама і хутка пасланага гарадзенскага земскага спраўніка і сваіх вясковых святароў абодвух цэркваў – нядаўна (у 1857 г.) заняўшага пасаду адміністратара касцёла – ксяндза Антонія Эйсманта і праваслаўнага папа Грыгора Пранеўскага – засталіся па-за ўвагаю сялянаў.[32] Святары звярталіся да непакорных неаднаразова. Але безвынікова. Пагрозы казакаў таксама не давалі ніякага плёну.[33]

Сяляне выказвалі нежаданне згаджацца са зместам Устаўноўчай граматы і адбываннем дадатковай павіннасці. У якасці доказу слушнасці сваёй пазіцыі паказвалі нейкі памятны медаль і гаварылі, што ён вызваляе іх ад працы.[34] Адначасова ж, як на ўласныя вочы ўбачыў сам афіцэр жандарскага корпусу Гарадзенскага губернскага штабу, сяляне не адмаўляліся ад паншчыны. Выконвалі яе цалкам, аднак тут жа ад дадатковых раздзелаў паншчыны рашуча адмаўляліся.

Сялянскі сход прасіў адное – адцягнуць час прыняцця Устаўноўчай граматы да вырашэння пытання па іх звароту ў Варшаву на імя… вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча. Аналагічныя прашэнні сяляне падалі губернатару і жандарскаму начальніку, які двойчы збіраў іх на сход.[35]

Пад паперамі сялянаў стаялі невыпадковыя крынкаўскія прозвішчы: Андрэй Дамброўскі, Антон і Іван Анісімовічы, Клеменс Касацкі, Рыгор Кузьмін, Сільвестр Міклашэвіч.[36] Антон Анісімовіч ды Сільвестр Міклашэвіч былі прадстаўлены ў паперах мясцовых начальнікаў губернатару, як мяцежнікі, што выказвалі асаблівую "*зацятую ўпартасць і незадавальненне*".[37] Таму перш, чым працягнуць разгляд справы аб згаданым хваляванні, пазнаёмімся бліжэй з яго завадатарамі.

Анісімовічы – прозвішча ў Крынках славутае. Род моцна разгалінаваны. У інвентары апісання Вірыёнаў ад 1845 г. Анісімовічы не згадваюца, аднак у такім жа інвентары Ліпхартаў за 1850 г. такіх прозвішчаў некалькі. Сярод цяглых сялянаў згадваецца сям'я Івана Анісімовіча з сямі чалавек.[38] Там жа пазначаны Антон Анісімовіч, якому было чым рызыкаваць, бо меў у доме таксама сем душ.[39] Да паўцяглых сялянаў належалі Іосіф Анісімовіч з жонкаю і Іван Анісімовіч з жонкаю і трыма дзецьмі.[40] Адзін з Анісімовічаў –

[31] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.6, спр.226, а.1; Швед В. Губернскі Гродна.– Баранавічы: БУД, 2003.– С.8.
[32] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.6, спр.226, а.2; Bielski T. Krynki i okolice.– Poznań, 1972.– S.80.
[33] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.6, спр.226, а.2 адв.
[34] Тамсама, а.2.
[35] Тамсама, а.11–12.
[36] Тамсама, а.32 адв., 35.
[37] Тамсама, а.2.
[38] НГАБ у Горадні, ф.96, воп.1, спр.367, а.48 адв.
[39] Тамсама, а.44 адв.
[40] Тамсама, а.53 адв.

Міхаіл – сустракаецца ў спісе сярод дваровых. Калі ж пагартаць старонкі рэвізскіх казак гэтак за гадоў шэсцьдзесят да разглядаемых падзеяў, то мы знойдзем Анісімовічаў і там: 1795 г., перапіс вольных людзей на чале з… Анісімовічам Іосіфам, бурмістрам мястэчка Крынкі![41] Пражываў гэты бурмістр з жонкаю, сынам, дачкою, служанкаю і жабруком, шляхціцам Ігнатам Ляўковічам на Гарадзенскай вуліцы. На другой вуліцы Свіслацкай, жылі яшчэ дзве вялікія сям'і Анісімовічаў – Лукаша і Ігната.[42]

Другі актывіст выступлення – Сільвестр Міклашэвіч, у інвентары Ліпхартаў лічыцца сярод паўцяглых сялянаў і, як яго паплечнік Антон Анісімовіч, быў чалавекам сямейным і ведаў, што і каго можа страціць у выпадку расправы.[43]

Вялікія сем'і мелі таксама цяглы Андрэй Дамброўскі і Клеменс Касацкі (у інвентары Ліпхартаў запісаны, як Кляменці Касіцкі).[44] Навачавідкі, што хвалявалася не "*галота*", а падняліся ў Крынках менавіта моцныя сяляне. Без гісторыі тут не абыйсціся. Вернемся зноў у апошняе пяцігоддзе XVIII ст., у векапомныя дні пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Раздача зямель і сялянаў расійскім памешчыкам пачалася Кацярынай II і працягвалася пры Паўле І. За 5 год (1796–1800 г.) на беларускіх землях ва ўласнасць 51-го памешчыка перайшло каля 28 170 душаў сялянаў.[45] Тады ж расійскі сенатар, тайны дарадца Павел Гаўрылавіч Дзіваў з рук тагачаснага цара Паўла І, у 1797 г. атрымаў у спрадвечнае валоданне 330 душаў крынкаўцаў. Ягоным нашчадкам праз два гады, па грамаце і перайшло "*...мястэчка Крынкі з вёскаю Парэчча ды фальваркамі, пустымі землямі, дварамі, вёскамі "харомнымі і гароднымі", пабудовамі, пашамі, залевамі, лясамі, сенажацямі і рыбнымі пасткамі, з маючымі быць наяўнымі і збеглымі сялянамі, нічога не выключаючы з таго, што да таго мястэчка Крынках і вёскі Парэчча належала*".[46] Спадкаемцамі П.Г.Дзівава сталі ягоныя дочкі – Вольга, якая ўзяла шлюб з баронам Месцнехарам і Марыя, што пайшла замуж за палкоўніка Ліпхарта. Апошні і стаў, з цягам часу, адзіным гаспадаром спадчыны Дзівава. Тады ж, у 1796 г., другая частка крынкаўцаў, каля 100 душаў, перайшла да сенатара Сакалова (трэцім гаспадаром стаў стацкі дарадца Колесаў). У Сакалова ў 1834 г. землі набыў Іван Вірыён.[47] Гэта закрэслівала 364 гады волі Крынак, узмоцненыя прывілеямі Жыгімонта Старога, Жыгімонта Аўгуста, Стэфана Баторыя, Уладзіслава IV (1633 г.), Яна Казімера (1661 г.), Міхала (1670 г.), Яна III Сабескага (1679 г.), Аўгуста III (1745 г.), Станіслава Аўгуста (1791 г.).[48] Дарэчы, спасылкі на пералічаныя прывілеі манархаў былі адной з асаблівасцяў сялянскага руху ў Беларусі першай паловы XIX ст. Жыхары шматлікіх мястэчак, раней якія знаходзіліся на становішчы "*местаў*", падчас уключэння беларускіх зямель у склад Расіі страцілі статус мяшчанаў і ператварыліся ў прыгонных сялянаў – памешчыцкіх, калі мястэчка было прыватнаўласніцкім, і дзяржаўных, калі траплялі ў скарб.[49] Страціўшы правы мяшчанскага саслоўя, сяляне Крынак, як і іншых мястэчак Беларусі – бо ўсе мястэчкі беларускіх губерняў знаходзіліся на землях памешчыцкіх – страцілі відавочныя правы. Красамоўны пералік страчанага бачны ў данясенні аднаго з мясцовых губернатараў у Вільню ў 1838 г.: "*Жыхары ўсіх [прыватнаўласніцкіх] мястэчак знаходзяцца на чыншах з правамі весці дробны гандаль, трымаць шынкі, займацца ў розных рамёствах і карыстацца зямлёю. Але правы гэтыя па* ***мясцовым звычаям*** *[заўважым, так пра сваю "парафію" можа сказаць толькі заезжы чыноўнік, каланіст!] маюць паходжанне з волі ранейшага польскага ўрада...*".[50]

---

[41] НГАБ у Горадні, ф.24, воп.7, спр.16, а.76 адв.
[42] Тамсама, а.70, 73.
[43] НГАБ у Горадні, ф.96, воп.1, спр.367, а.54 адв.
[44] Тамсама, а.48 адв.
[45] Чепко В.В.– Зг.тв.– С.24.
[46] НГАБ у Горадні, ф.92, воп.1, спр.258, а.265 адв.; ф.1, воп.6, спр.226, а.58–58 адв.
[47] НГАБ у Горадні, ф.10, воп.17, спр.445, а.72 адв.
[48] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.6, спр.226, а.61 адв.
[49] Чепко В.В.– Зг.тв.– С.88.
[50] Лютый А.М. Социально-экономическое развитие Белоруссии в к.XVIII–п.п.XIX в.– Мн.: Наука и техника, 1987.– С.17.

Аб страчанай волі ўспомніла ўжо наступнае пакаленне тых, у каго гэтую волю забралі. 10 снежня 1820 г. стацкі дарадца Міхаіл Фадзеевіч Бутаўт-Андрэйковіч, тагачасны гарадзенскі губернатар, атрымаў прашэнне на імя цара за подпісам Паўла Касацкага і Мікалая Мачэйкі ад імя грамадства мястэчка Крынкі. Павел Касацкі "*размяняў*" тады шосты дзясятак і добра памятаў і ведаў часы, калі крынкаўцы жылі ў значна іншых сацыяльных і эканамічных умовах.[51] Гэта і было ўспомнена ў тэксце прашэння:

"*Усеаўгусцейшы манарх! Усеміласцівейшы Гаспадар!*

*У гарадзенскай губерні і павеце мае быць мястэчка Крынкі, якое здаўна мела кіраванне паводле прывілеяў Магдэбурскага права, якія мы мелі на руках па ўзору места Горадні, пазбавіліся гэтых прывілеяў з-за самаўладдзя і карысці, кіруючага ў часы польскага ўрада скарбовымі маёмасцямі, літоўскага падскарбія Тызенгаўза.*

*З часоў выдання Канстытуцыі 1776 г., якая скасоўвала ў розных літоўскіх мястэчках Судовыя месцы з прычыны заўважаных Урадам беспарадкаў, але згодна з якой мяшчане абавязаны толькі да грашовага штогадовага плацяжу, Тызенгаўз абклаў усіх мяшчанаў акрамя грашовых плацяжоў і некаторымі асабістымі павіннасцямі пад назовамі талокаў, шарваркаў, пасылак, старажовак і гвалтаў для збору хлеба, робячы аднак розніцу, каб мяшчане да паншчыны прымушаны не былі. У адпаведнасці з тагачасным інвентарным вопісам, адноўленым ў 1796 г., кожны жыхар мястэчка Крынкі абавязаны адбываць праз год: 1) у зімовы час два разы адвезці хлеб у Горадню на судне; 2) у летні час выйсці з сям'ёю чатыры разы гвалту для збору хлеба; 3) для пасылак даць фурманку ў год тры разы на 6 міляў. Пры гэтым зроблена выключэнне, калі ў пасылцы дваравое начальства не мела неабходнасці, то можна выкарыстаць на іншыя работы, толькі каб збруйныя не былі ўключаны да ворыўных работаў, а таксама да абмалоту хлеба, другімі словамі, каб не адбывалі паншчыны, якую штодзень выконваюць прыгонныя сяляне.*

*Гэтымі і іншымі падобнымі павіннасцямі абкладзены розныя мястэчкі, хоць за Польскім Урадам скардзіліся каралю Станіславу і хоць атрымалі ахоўны рэскрыпт, але самаўладдзе падскарбія Тызенгаўза і безуладдзе, якое было ў Польшчы не далі скасаваць злоўжыванні...*

*Пасля падзелу Польшчы паміж трыма дзяржавамі, мястэчкі, што адыйшлі да каралеўства Прускага... не толькі вызваліліся ад асобных павіннасцяў, як Янава, Карыцін, Сухаволя, Дабраволя, Кузніца, Саколка, але аднавілі ў іх мясцовае начальства, якое пасля далучэння Беластоцкай вобласці пад скіпетр Вашай Імператарскай Вялікасці... аднавілі прывілеі... Акрамя вышэйзгаданых мястэчак па Беластоцкай вобласці засталося толькі адное, за прускім урадам ад асобных павіннасцяў не пазбаўленае, гэта Адэльск, які па прапанаваным прывілеям адстаяла сваю вольнасць па Загаду Сената 1819 года ад 14 снежня.*

*Гледзячы на аднаўленне першабытнага – нашых суродзічаў, а ў асаблівасці, у дзве толькі мілі ад Крынак – стану мястэчка Адэльск, падавалі гаспадзіну Міністру Юстыцыі прашэнне аб дазволе ў дачыненні нашых прывілеяў... Між тым, паколькі мястэчка Крынкі пасля падзелу Польшчы нададзена г-ну Дзіваву, дваровае начальства якога не прытрымліваецца таго інвентарнага вопісу, па якому атрыманы Крынкі, і насуперак гэтаму вопісу павярнула да паншчыны, ...што мяшчане трапілі ў суцэльную нэндзу і галечу, іншыя ж з-за жорсткіх пакаранняў вымушаны былі пакінуць месца жыхарства і з'ехаць без дазволу і шукаць прытулак за мяжою.*

*Дзеля таго ажыўлены мы, Усеміласцівейшая Ваша Імператарская Вялікасць выданым у 23 дзень сакавіка 1818 г. Маніфестам, які ахоўвае ўсіх, каб гасподскія работы выконваліся не больш як у адпаведныя дні згодна інвентарам. Падалі ў гарадзенскае губернскае праўленне прашэнне, каб ...член [Земскага суда] паехаў на месца і абавязаў начальства Дзівава, каб да рашэння справы аб вольнасці нашай, прытрымлівацца інвентарнага вопісу, па якой прыняў нас г.Дзіваў у Скарбовага ведамства. Па гэтаму прашэнню не толькі мы не атрымалі ніякага задавальнення, але больш таго, начальства*

[51] НГАБ у Горадні, ф.24, воп.7, спр.16, а.71 адв.

*Дзівава, калі даведалася аб нашым хаджэнні, увогуле стала ціснуць жыхароў рознымі мерамі, распаўсюдзіла па ваколіцах, каб ніхто не набываў ад нас нашых прадуктаў пад пагрозай штрафу 10 руб. срэбрам...*”.[52]

Прашэнне было дастаўлена ў Варшаву цэсарэвічу Канстанціну Мікалаевічу сялянамі Мацвеем Міклашэвічам і Лаўрэнціям Балінскім. За гэта сялянаў-кур’ераў чакаў арышт, этапіраванне дадому закаванымі ў жалеза. Мікалай Мачэйка быў прыгавораны да “*рэкрутчыны*”, а Павел Касацкі жорстка збіты салдатамі.[53]

У ліпені 1824 г. Рашэнне Сената анулявала сілу прывілеяў і Соймавай Канстытуцыі 1776 г. для Крынак.[54]

У снежні 1825 г. сяляне Крынак зноў назвалі сябе мяшчанамі ў прашэнні да гарадзенскага губернатара і скардзіліся на прымус да павіннасцяў і паншчыны, якія супярэчылі іх прывілеяванаму становішчу. Вышэй пералічаныя прывілеі манархаў былі галоўным аргументам сялянаў у патрабаванні волі.[55] Як вынік, Дзіваву было згадана ўстрымацца ад патрабавання са сваіх сялянаў дадатковых павіннасцяў акрамя тых, што пералічваліся ў прывілеях (зазначым – ужо адмененых), а сялянам, з цягам часу, пазней, у 1828 г., аб’яўлялася, што, маўляў яны адпрацоўвалі паншчыну больш за 30 год і права, на перагляд свайго стану, таму страцілі. Такі паварот справы падмацоўваўся мясцовымі ўладамі Меркаваннем Дзяржаўнай Рады, Найвышэйша зацверджаным у лютым 1814 г., якое ставіла крынкаўскія землі, што былі дадзены Дзіваву, на адную прыступку з нададзенымі дваранам.[56] Яшчэ адзін аргумент губернскага кіраўніцтва быў у тым, што жыхары мястэчка яшчэ “*падчас Польшчы абкладзены былі як сяляне асобнымі інвентарнымі павіннасцямі і падатнымі былі на той час у валоданні імі Асалінскім, і ў такім стане трапілі ў скарб [Расіі]*”.[57]

У палеміку з дзяржаўнымі ўстановамі ўключыліся 30-гадовы Лукаш Яновіч і 50-гадовы Антон Хлябіч. Яны падалі ў 1829 г. ад імя ўсіх сялянаў Крынак прашэнне аб абароне ад ціску з боку Дзівава.[58] Аднак, зыходзячы з пералічаных акалічнасцяў, павятовы суд 12 сакавіка 1834 г. чарговы раз не прызнаў ў крынкаўскіх сялянаў мяшчанскіх правоў, а словы пра паводзіны Дзівава былі разгледжаны як дзёрзкасць.[59]

За волю чарговы раз у 1843 г. Сільвестр Фядзюкевіч, Іосіф Кучэвіч, Лука Яновіч, Якаў Касацкі, Тэадор Рудзіла, Міхаіл Макарэвіч і шэраг іншых “*турбавалі*” чатырма прашэннямі расійскага цара.[60] Ці трэба гаварыць, што ў вачах палкоўніка Ліпхарта сяляне-актывісты скрадзіліся, “*без уселякіх падстаў на тое*”. Якаў Касацкі бачыўся памешчыку толькі “*астрожнікам*”, а Сільвестр Міклашэвіч разглядаўся ім, як маючы пазбегнуць усялякімі шляхамі ад “*рэкрутчыны*” (нават выбіў сабе два пярэдніх зуба).[61]

Праз шэсць год сяляне памешчыка Івана Вірыёна – Казімер Будроўскі, Станіслаў Яновіч, Казімер Скроўба, Ігнат Грыгаровіч, Максім Юрыла скардзіліся на жорсткія адносіны да іх з боку пана і спасылаліся на разыходжанне патрабаванняў Вірыёна са зместам інвентара. Безвынікова.[62]

У 1857 г. Кляменту Касацкаму, Паўлу Міклашэвічу, Івану Мічэйцы асабліва строга было ўказана на тое, што тыя “*не згодны, што правы іх былі скасаваны*”, што зацята патрабуюць свабоду і “*гэта не правільна*”.[63] За спіною гэтых трох актывістаў была значная

---

[52] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.1, спр.2005, а. 6–8 адв.
[53] Тамсама, а.1 адв., 17–17 адв.
[54] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.6, спр.226, а.61.
[55] Тамсама, а.60–61.
[56] Тамсама, а.61адв.
[57] Тамсама, а.64.
[58] Тамсама, а.63.
[59] НГАБ у Горадні, ф.96, воп.1, спр.367, а.65, 66.
[60] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.20, спр.1127, а.1.
[61] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.20, спр.1451, а.1–2 адв.
[62] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.21, спр.981, а. 1–2.
[63] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.5, спр.1912, а.7–7адв.

група ліпхартаўскіх сялянаў, якія чарговы раз падпісалі зварот аб волі. Гэта былі: Франц Міклашэвіч, Каспар Фядзюкевіч, Антон Фядзюкевіч, Іван Анісімовіч, Андрэй Царэвіч, Лаўрэн Касацкі, Іван Задароўскі, Варфаламей Шамрукевіч, Адам Анісімовіч, Даніла Міхневіч, Андрэй Дамброўскі, яго сын Лаўрэн Дамброўскі, Адам Мічэйка, Павел Міхневіч (на той час – вучань гарадзенскай гімназіі), Рыгор Кішкель, Лявон Кішкель, Рыгор Кузьма і Сямён Яновіч.[64] Сялянам было абвешчана аб тым, што ў павятовым судзе хоць і не скончана справа па заяве, заведзеная ў 1844 г., аднак яе змест "*зусім не пра свабоду, а пра падпарадкаванне сялянаў мястэчка Крынкі*".[65]

Новая хваля зваротаў да ўладаў была ў 1858 г., калі дваццаць восем сялянаў звярнуліся да гарадзенскага губернатара з аналагічным прашэннем. Ім зноў успомнілі рашэнне дваццацічатырохгадовай даўніны, дзе гаварылася, што "*крынкаўскія жыхары прызнаныя прыгоннымі і не маюць правоў на свабоду*".[66]

І вось, нарэшце, той выпадак 1862 г., з якога мы пачалі. Паказальна, як інэрцыйна рухалася прававая ментальнасць. Хада мыслення губернскіх чыноўнікаў за больш чым паўстагоддзя не змянілася. Дык што для яе год рэформы? Што, падмацаваная спадчыннай памяццю, прага некалькіх пакаленняў крынкаўцаў да свабоды? Устаноўчая грамата мястэчка Крынкі Ліпхартаў ад 27 снежня 1862 г. была ўведзена ў дзеянне без увагі на гэтыя "*дробязі*".[67] Крынкі заставаліся ў рэчаіснасці імперыі. А ў яе абывацеляў захавалася памяць пра волю. Яна яшчэ не раз будзе нагадваць пра сябе.[*]

*Віталь Карнялюк.*

## ***<u>ПАВЕДАМЛЕННІ.</u>***

### Герб мястэчка Новы Двор у Ваўкавыскім павеце.[68]



У вядомай кнізе А.Цітова герб Новага Двару з прывілею на Магдэбургскае права ад 12.08.1579 г. выглядаў так: "*у срэбным полі залаты леў на чырвоным муры*" [1, с.207]. Гэтае мястэчка знаходзілася ў Гарадзенскім павеце Троцкага ваяводства ВКЛ. У дадатках да згаданага мескага гербу аўтар змясціў фотаздымак пячаткі-матрыцы Новага Двара з фондаў ГДГАМ, апісанне якой мы даем ніжэй:

Пячатка авальная, 46х52 мм, медзь, з драўлянай ручкай 60 мм. Захаванасць добрая, маюцца нязначныя вокіслы медзі. Выява: у цэнтры пячаткі стаіць збройны арханёл Міхаіл, які правай рукой абапіраецца на меч, у левай трымае вагі. Пад нагамі ў яго ляжыць пераможаны д'ябал (чорт). Надпіс на польскай і лацінскай мове ў абтоку пячаткі падзелены лінейнымі абадкамі на дзве часткі: "+ *PIECZĘC · SĄDU · ORDYNARINEGO · PRIMAE · INSTANTIAE · MIASTA · R[zeczy] P[ospoli] TT[ej].*" і ніжэй – працяг: "+ *NOWY · DWOR · w ·*

---

[64] Тамсама, а.8–8адв., 38 адв.
[65] Тамсама, а.9.
[66] НГАБ у Горадні, ф.1, воп.6, спр.226, а.67 адв.
[67] НГАБ у Горадні, ф.96, воп.1, спр.367, а.78.
[*] З данясення гарадзенскага губернатара Міністру Ўнутраных Спраў аб масавай адмове сялянаў Гарадзенскай губерні прымаць Устаноўчыя граматы (28 лютага 1863 г.): "*Па звестках атрыманых ад міравых пасярэднікаў, земскіх іспраўнікаў, часоваабавязаныя сяляне... з 17 па 23 лютага адмовіліся ад выканання на карысць памешчыкаў павінасцяў у наступных мясцовасцях... па Гарадзенскаму павету ў валасцях: ...Крынскай... Сяляне і службовыя асобы валасцёў... Крынскай.. ужо былі мне (гарадзенскаму губернатару) прадстаўлены...*".// У кн.: Памяць: Гіст.-дакуменальная хроніка Бераставіцкага р-на. – Мн.: БЕЛТА, 1999. – С.80–81.
[68] Артыкул з'яўляецца часткай паведамлення на тэму: "*Гербы гарадоў і мястэчак Ваўкавыскага павета ВКЛ у XVI–XVIII ст.*", прачытанага 20–21 чэрвеня 2003 г. на навукова-краязнаўчай канферэнцыі з нагоды 500-годдзя надання Ваўкавыску Магдэбургскага права (1503–2003).

*P[owiecie] · W[ołkowyskim] · DO · WYDZIALU · GROD[zieńskiego]: NALEZAC[ego]: R[oku]: 1792*”. Па краю пячаткі лінейны абадок [2][69].

Як бачым, выява на пячатцы зусім не адпавядала гербу з прывілея, што сведчыць аб памылцы А.Цітова, які пераблытаў Новы Двор гарадзенскі з Новым Дваром Ваўкавыскага павета. Гэта вынікае з перакладу і расшыфроўкі надпісу ў атоку пячаткі-матрыцы: “*Пячатка суду ардынарыйнага першай інстанцыі места Рэчы Паспалітай Новы Двор у павеце Ваўкавыскім да аддзялення Гарадзенскага належачага году 1792*”. Такім чынам, выява арханёла Міхаіла належала да ваўкавыскага Новага Двара і была менавіта яго гарадскім гербам.

Аднак, узнікае пытанне ці меў Новы Двор у Ваўкавыскім павеце Наваградскага ваяводства ВКЛ Магдэбургскае права? На гэтае пытанне мы можам адказаць сцвярджальна. Па-першае, гэта вынікае са складзенага недзе ў другой палове XVIII ст. дакументу пад назвай “*Meritum Sprawy Mieszczan Nowodworskich*”. У ім падаецца петыцыя навадворскіх мяшчанаў да вялікага князя літоўскага і караля польскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага з просьбай захаваць іх пры даўніх правах, вызваліць ад павіннасцяў і пакінуць ва ўласнасці 7 валокаў. Падставай для гэтага быў прывілей Стэфана Баторыя ад 12 жніўня 1578 г., які “*...Przywodząc do lepszego porządku Miasto Nowydwor nadał im Prawo Maydeburskie y wszelkie wolnosci targowania przedawania y dalsze w Miescie dyspozycye. Tenże Król Jmc od wszelkiey władzy y powinnosci starostom dzierżawcom procz płacenia czynszu uwolnil. Mimo który warunek mieszczanie konno, pieszo y podwodami wszelką usługę Dworowi pełnić muszą. Tenże Król JMć w uroczysku Kudrawskim włok siedem nadał...*” [4, а.1].

Па-другое, захаваўся, праўда ў вельмі дрэнным стане, канфірмацыйны прывілей караля і вялікага князя Аўгуста III ад 14 лістапада 1744 г. (гл.с.55–56). Як удалося з яго даведацца, гэта было падцвярджэнне канфірмацыяў правоў і вольнасцяў Новага Двара яго папярэднікаў – Аўгуста II (28 лістапада 1718 г.), Яна III Сабескага (20 студзеня 1679 г.), Міхала Карыбута Вішнявецкага (20 сакавіка 1670 г.) і Яна Казімера Вазы (3 жніўня 1661 г.). 4 чэрвеня 1774 г. ён быў падцверджаны Станіславам Аўгустам Панятоўскім [5, а.1; 6, а.8].

Цяжка вызначыць хто з манархаў надаў такі герб Новаму Двару. Па іканаграфічных асаблівасцях геральдычнай выявы на прыведзенай вышэй пячатцы, мы схіляемся да думкі, што гэта мог быць кароль і вялікі князь Міхал Карыбут Вішнявецкі, які надаў мястэчку ў герб свайго святога заступніка і, відаць, маючы за ўзор герб ваяводскага Наваградка. Праўда, дакументы аб гэтым нічога не гавораць.

Такім чынам, у Ваўкавыскім павеце было яшчэ адное мястэчка з Магдэбурскім правам – Новы Двор[70], герб якога павінен выглядаць так: ***на тарчы збройны арханёл Міхаіл топча парамоджанага чорта, пры гэтым ён правай рукой абапіраецца на меч, а ў левай трымае вагі***. Прапануем наступную рэканструкцыю колераў: поле тарчы чырвонае, арханёл Міхаіл у срэбнай кашулі, чорт – чорны, вагі, латы і меч колеру метала, ручка ў мяча – залатая, перы на шлеме – срэбныя.

## Літаратура і крыніцы:


1. Цітоў А. Геральдыка Беларускіх местаў.– Мн.: Полымя, 1998.– 287 с.
2. ГДГАМ, КП № 24335.
3. Jodkowski J. Muzeum w Grodnie. Sprawozdanie z czynności za rok 1923.– Grodno, 1924.– 58 s.
4. НГАБ у Горадні, ф.1664, воп.1, спр.850.
5. ГДГАМ, КП № 15117.
6. НГАБ у Горадні, ф.1664, воп.1, спр.853.


[69] Пячатка-матрыца паходзіць з калекцыі штэмпеляў, сабраную першым дырэктарам гарадзенскага музея Юзафам Ядкоўскім. Яму яна была перададзена Юзафам Елінэкам, старостай наваградскім у 1923 г. [3, s.31].

[70] Частка архіва магістрату Новага Двара з дакументамі з канца XVIII–першай паловы XIX ст. захоўваецца ў ГДГАМ [5]. З яго даведваемся, што прывілей лакацыйны Новага Двару быў страчаны: “*...Przywileie Locationis Miasteczka Nowegodworu w czasie Jnkursyow Kraiowych y w czasie zdarzonego pożaru tegoż Miasteczka zaginely...*” [5, а.1; 6, а.8]. Улічваючы, што ў 1518 г. Новы Двор з воласцю ўжо існаваў [7, с.164], час заснавання мястэчка трэба аднесці на пачатак XVI ст.

7. Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута.– М., 1892.

*Аляксей Шаланда.*

## Да пытання аб колерах герба Пружанаў.[71]

Лічыцца, што Пружаны атрымалі Магдэбургскае права 6 мая 1589 г. ад караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта III Вазы. Аднак у самым пачатку яго прывілея (гл. Дадатак) гаворыцца аб тым, што ініцыятарам гэтага выступіла Ганна Ягелонка. Менавіта яна надала “*права Магдэбургскае і іншыя вольнасці*” Пружанам. Адбылося гэта, як мяркуюць, у 1588 г. Па меньшай меры на момант выдання прывілею ад 6 мая 1589 г. ужо існаваў пружанскі магістрат і быў абраны першы войт – шляхціч Барталамей Мазавецкі. Жыгімонт III Ваза падцвердзіў усе правы на самакіраванне, а таксама ў гонар сваёй цёткі дадаў, што “*места Пружаны за пячатку або герб будзе мець малога вужа звітога, з пашчы якога выходзіць напалову дзіця*” [1, s.428].

Як выглядаў гарадскі герб Пружанаў сведчаць адбіткі яго пячатак. Дзякуючы працам Анатоля Цітова і Эдмундаса Рымшы сёння вядомы два тыпы такіх пячатак, што выкарыстоўваліся ў XVI–XVIII ст. Першая “*pieczęć miescka*” ўжывалася ў 1589–1592 г.:

1) на картушы звіты вуж, з пашчы якога выходзіць палова дзіцяці, надпіс у атоку: “* SIGILLVM [CIVITATIS] [PRVZA]NENSIS * 1589” (Ø 29 мм) [2, с.220; 3, s.481–482, № 287].

Другая “*pieczęć miescka magdeburska prużańska*” выкарыстоўвалася ў 1671–1763 г.:

2) на тарчы звіты вуж, з пашчы якога выходзіць палова дзіцяці, надпіс у атоку: “* SIGILLVM * CIVITATIS * PRVZANENSIS” (Ø 27 мм) [2, с.71; 3, s.482, № 288; 4, с.226, № XXVII; 5, с.170].

Аднак, прыведзеныя як А.Цітовым, так і Э.Рымшай фотаздымкі і малюнкі гербу Пружанаў не перадаюць з-за стратаў поўны кшталт гербавай выявы. У першую чаргу гэта датычыць праблемы адсутнасці ці прысутнасці кароны на галаве вужа. Праўда, А.Цітоў на адным з адбіткаў пячаткі другога тыпу на дакуменце 1688 г. бачыў: “*шчыт з выявай вужа ў трохпялёсткавай кароне*” [4, с.226]. Аднак, адбітак той быў слабакантрасны, неякасны, а значыць патрабаваў праверкі на іншым сфрагістычным матэрыяле.

Праблема адсутнасці ці прысутнасці кароны ў гербе Пружанаў не з’яўляецца малазначнай. Ад яе вырашэння залежыць адказ на пытанне: якія колеры меў пружанскі гарадскі герб? Так, А.Цітоў, услед за меркаваннямі польскіх гісторыкаў М.Баліньскага і Т.Ліпіньскага, прымае, што апошні павінен быў выглядаць так: “*у сярэбраным полі звівісты блакітны вуж з залатой каронай на галаве, з пашчы якога відаць напалову праглынутае дзіця*” [2, с.220; 5, с.170–171]. Быццам бы з-за таго, што ён цалкам адпавядаў родаваму гербу Сфорцаў “*у блакітным полі срэбны вуж у залатой кароне, праглынае напалову дзіця*”, у гербе Пружанаў колеры былі зменены з дакладнасцю да наадварот [5, с.27–28]. Але, калі кароны ў пружанскім гербе не было, то ён і так быў адметным гербам і мяняць колеры не было прычынаў.




Для таго, каб адказаць на пастаўленыя пытанні, мы звярнуліся да матэрыялаў, якія захоўваюцца ў фондах Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Да аднаго з “*Выпісаў з кнігаў Магдэбургскіх места ЯКМ Пружанскага*” ад 10 ліпеня 1734 г. Юрыем Тавяньскім, ваўкавыскім гараднічым і войтам пружанскім, Міхалам Нічыпаровічам, бурмістрам і Ўладзіславам Мараковічам, пісарам пружанскімі была прыкладзена гарадская пячатка:

[71]Артыкул падрыхтаваны на падставе паведамлення, прачытанага на IX Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Рэспублікі Беларусь, якая адбылася 26–27 мая 2004 г. у Горадні. Гл.: Міронава В. З гісторыі герба горада Пружаны.// IX Республиканская научная конференция студентов и аспирантов Республики Беларусь “*НИРС–2004*”: Тезисы докладов: в 8 ч./ Под ред. А.И.Жука.– Гродно: ГрГУ, 2004.– Ч.1.– С.100–101.

- ***на тарчы звіты вуж у трохпялёсткавай кароне, з пашчы якога выходзіць палова дзіцяці, надпіс у атоку:*** "* SIGIL[LVM] * CIVITATIS * PRVZANENSIS" (Ø 27 мм)[72] [6, а.1 адв.].

Перад намі пячатка так званага другога тыпу, вядомая з працаў А.Цітова і Э Рымшы. Негледзячы на тое, што згаданы адбітак таксама невысокай якасці, тым не меньш ён дазваляе адназначна сцвярджаць прысутнасць кароны ў гербе Пружанаў. Такім чынам, гарадскі герб сапраўды быў ідэнтычны родаваму гербу Сфорцаў. Здавалася, што маюць рацыю тыя, хто рабіў поле тарчы пружанскага гербу срэбным, а вужа – блакітным. Аднак, ёсць падставы, каб усумніцца ў падобнай колеравай рэканструкцыі.




Усе даследчыкі, якія займаліся праблемай гарадскога гербу Пружанаў, адзначалі, што быў ён нададзены ў гонар Ганны Ягелонкі, каралевы польскай і вялікай княгіні літоўскай, дачкі Боны Сфорца і жонкі Стэфана Баторыя [2, с.71–72; 3, s.481; 5, с.27]. Але чамусьці ніхто з іх не звярнуў увагу на тое, што Ганна карысталася змененым гербам Сфорцаў, які выглядаў так: у блакітным полі чорны звіты вуж у залатой кароне, з пашчы якога выходзіць палова дзіцяці. Пра гэта сведчаць яе прыжыццёвыя партрэты – першы, каранацыйны, напісаны каля 1576 г. [7, s.79; 8, c.95][73], другі – пэндзля Марціна Кабэра, датаваны 1595 г. (гл.мал.) [9][74]. Думаем, што мастакі зафіксавалі на партрэтах менавіта тыя гербавыя колеры, якія ўжываліся непасрэдна заказчыцай – Ганнай Ягелонкай. Лагічна дапусціць, што калі герб Пружанам надаваўся ў гонар Ганны "*цёткі нашай найукаханай*", то быў ён па колерах ідэнтычны таму, якім яна карысталася ў сваёй жыццёвай практыцы.

Такім чынам, зыходзячы з вышэйзгаданых матэрыялаў і меркаванняў, гарадскі герб Пружанаў павінен выглядаць так: ***у блакітным полі чорны звіты вуж у залатой кароне, з пашчы якога выходзіць палова дзіцяці натуральнага колеру***.

У 1795 г. адбыўся трэці падзел Рэчы Паспалітай і Пружаны ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Герб, які нагадваў аб прыналежнасці места да каралеўскай сям'і, вядома, не мог задаволіць царскіх чыноўнікаў і быў адменены. Таму, 6 красавіка 1845 г. Пружаны атрымалі новы герб: на жоўтым полі зялёная елка з паляўнічым ражком на адной з верхніх галінак (з-за Белавежскай пушчы, што ўвайшла ў склад новастворанага Пружанскага павету) [10, с.40]. Пазней, у верхняй частцы згаданага гербу з'явілася дапаўненне – выява зубра, якая сведчыла аб прыналежнасці гораду да Гарадзенскай губерні. Праект такога гербу быў зроблены ў 1861 г. [2, с.276].

Вышэй апісаны герб праіснаваў 76 год, пакуль у 1921 г. паміж Савецкай Расіяй і Польшчай не быў заключаны Рыжскі мірны дагавор, паводле якога Пружаны ў ліку іншых заходнебеларускіх гарадоў адышлі да апошняй. Польскія ўлады вярнулі гораду герб наданы Жыгімонтам III Вазай, але поле гербу стала зялёным. Акрамя гэтага герб атрымаў на тарчу

[72] На іншым дакуменце ад 2 мая 1750 г. пячатка не захавалася. Аднак, у тэксце пружанскія Станіслаў Ляскоўскі, лянтвойт, Ян Банкевіч, бурмістр і Стэфан Ёпінскі, пісар сцвярджалі, што іх ліст быў пісаны "*w ratuszu Pruzanskim*" і выданы "*pod pieczęcią urzędowo Maydebursko Pruzansko*" [6, КП 8606, а.1 адв.]. Няма сумневу, што гэта была ўсё тая ж пячатка другога тыпу.

[73] Поўнае апісанне гербу: на авальнай картушовай тарчы ў блакітным полі чорны звіты вуж у залатой кароне, з пашчы якога выходзіць палова дзіцяці натуральнага колеру, над тарчай залатая карона.

[74] Тарча падзелена на пяць частак, у цэнтры на шчыце ў блакітным полі чорны звіты вуж у залатой кароне, з пашчы якога выходзіць палова дзіцяці натуральнага колеру, у 1-ай і 4-ай частках у чырвоным полі срэбны польскі арол, у 2-ой і 3-яй – срэбная "*Пагоня*".

шляхецкую карону і ўпрыгожванне вакол тарчы ў выглядзе дзвух пальмавых галінак. Вуж жа застаўся без кароны [10, с.41]. Такім ён праіснаваў да 1939 г., да таго часу, калі ў выніку аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР Пружаны ўвайшлі ў склад апошняй.

Сёння герб Пружанаў адпавядае таму ўзору, які падаецца ў кнігах А.Цітова. Аднак, калі ўлічыць нашыя заўвагі, ён патрабуе ўдакладнення сваёй колеравай характарыстыкі.

## Літаратура і крыніцы:


1. АВАК.– Вильна, 1871.– Т.5.– 450 с.
2. Цітоў А. Геральдыка Беларускіх местаў.– Мн.: Полымя, 1998.– 287 с.
3. Rimša E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystes antspaudai.– Vilnius, 1999.– 764 s.
4. Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі: нарысы сфрагістыкі.– Мн.: Полымя, 1993.– 239 с.
5. Цітоў А. Гарадская геральдыка Беларусі.– Мн.: Полымя, 1989.– 207 с.
6. ГДГАМ, КП № 8605.
7. Sucheni-Grabowska A. Spory królów ze szlachtą w złotym wieku.– Kraków, 1988.– 80 s.
8. Тананаева Л.И. Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи барокко.– М.: Наука, 1979.– 302 с.
9. Kober M. Anna Jagiellonka, olej na płótnie, 1595, Zamek Królewski w Warszawie.– http:// artyzm.com/ k/ kober/ anna.htm
10. Спаткай Л. Герб Пружан. Мифы и факты.// Гербовед.– Москва, 1997.– № 21.– С.36–43.


## Дадатак.

### "*Места Пружаны. Прывілей месцкі-locationis.*

Жыгімонт ІІІ, etc. Абвяшчаем тым нашым прывілеям, каму аб гэтым ведаць трэба, як цяперашнім, так і будучым. Што, калі ад найяснейшай Ганны, з ласкі Божай каралевы польскай, цёткі нашай найукаханай, месту Пружаны і абывацелям яго за ласку і дабрачыннасць сваю, права Магдэбургскае і іншыя вольнасці, у праве сваім рэфармаваным; далей прагнучы лепш умацаваць і асаблівейшым сваім прывілеям і кансэнсам абдараваць, прасілі нас ад імя магістрату і мяшчанаў таго ж места Пружаны; на якую просьбу ласку і дабрачыннасць нашую каралеўскую, на ўзор іншых гарадоў нашых каралеўства і в.к.Літ., права Магдэбургскае даць і належачымі да яго ліцэнцыямі ўмацаваць і дазвол цёткі нашай найукаханай дазволам нашым каралеўскім падцвердзіць хацелі на доўгія гады; а што іншыя гарады ўсялякімі вольнасцямі прывыклі цешыцца такімі, як: прывілеям, правам і іншымі ліцэнцыямі: для чаго і мы месту Пружанам і мяшчанам яго іх забараняць не хочам.

Найперш месту Пружанам і яго мяшчанам права Магдэбургскае, якое іншыя гарады нашыя каралеўскія і ў в.к.Літ. ужываць прывыклі, дазваляем, аддаляючы з гэтага моманту ад места Пружаны і яго абывацеляў усе правы земскія літоўскія, або рускія, якія самому праву Магдэбургскаму маглі б перашкодзіць, а зверх таго ўсіх абывацеляў згаданага места нашага і іх нашчадкаў ад усялякай суперінтэндэнцыі, улады і суду ўсіх ваяводаў, кашталянаў, старостаў, падстаростаў, і за іх выступаючых і іншых афіцыялістаў дыгнітарыяў такіх, як: дзецкіх, вызваляем; але гэтым згаданым мяшчанам загадваем, каб ніякім іншым судом судзіцца не думалі, а толькі Магдэбургскім; пры гэтым, якія-небудзь асобы, якога-небудзь стану і кандыцыі будучы, пры суджэнні як малых, так і вялікіх крыміналаў, як, напрыклад: злачынствы, канфляграты, пераломы суставаў і іншых выпадкаў і эксцэсаў, што здарацца, нікому ўмешвацца ў гэтыя справы не дазваляем. Адным толькі мяшчанам дазваляем радзіць і паводле заслугаў, кары прызначаць, перад войтам правам Магдэбургскім судзіцца будуць.

Войт жа аб чым спрачацца будуць, або якую-небудзь цяжкасць будуць мець, радзіць ім будзе. Што да згададанага войта, то яму належаць прыходы, як да нас і да войта належачыя, [і якія] знайсціся маглі, гатовыя прыняць. Згаданым мяшчанам дазваляем выбіраць сабе войта, які павінен мець зверхнасць над усімі крыміналамі і мяшчанскімі справамі, мець вялікую вольнасць у самым месце па пытаннях суджэння, мерання, памяншэння, пакарання і дэкрэтавання на горла, наколькі самое Магдэбургскае права ў сваіх галоўных інтарэсах патрабуе; і той жа самы войт яго наступнікі са згаданага места, бурмістра, райцаў, лаўнікаў будуць прызначаць, асабліва для збірання чыншаў, складання

падаткаў, усялякіх месцкіх пабораў, па іншаму капшчызнай названых, той жа самы войт гэтага ж места будзе настаўляць і збіраць, а сабраўшы ў рукі старосты ці эканома нашага, на той час будучага, Кобрыньскага, кожны год у цэласці аддаць павінен. А раз за аднастайнай згодай выбралі і цяпер нам прэзэнтавалі свайго войта шляхціца Барталамея Мазавецкага, якога да гэтай годнасці і гонару згодна прызначылі, таму таго ж Барталамея Мазавецкага на тое вайтоўства Пружанскае падцвярджаем і пастанаўляем. Яму і яго наступнікам за вайтоўства ў месце Пружаны дзве валокі грунту, адную вольную, здаўна фундаваную для войта, другую ж у вёсцы Мікітычах, цяперашнім нашым старостам прызначаную, у рэальнае і праўдзівае валоданне даем, і на доўгія гады трымаць дазваляем. Акрамя гэтага дазваляем яму і яго наступнікам усе правэнты ад судоў, якія на яго ісці будуць, а нам і нашым наступнікам ніякіх разлікаў з гэтага чыніць не трэба.

Хочучы акрамя гэтага тым жа мяшчанам нашым Пружанскім большую ласку нашу паказаць, дазваляем ім мець купецкія крамы або клеткі, пры іх яткі, васкабойню і васковыя вагі, акрамя гэтага меры збожа і мёду дазваляем мець, і вольныя ярмаркі пры збіранні падушнага памернага, сталбовага і лапатковага.

***У дадатак да правоў места Пружаны за пячатку або герб будзе мець малога вужа звітога, з пашчы якога выходзіць напалову дзіця.***

Дазваляем акрамя гэтага вышэйзгаданым мяшчанам нашым Пружанскім і даем вольнасць гатаваць піва, мёд, гарэлку, трымаць віно і іх прадаваць, для пажытку самых жа мяшчанаў, ад якога гатавання піва, мёду, усе, хто тым шынкуе, пабор ці кап названы ў скарб наш кожны па 60 грошаў лічбы літоўскай плаціць павінен. За віно і гарэлку арэнду 100 злотых манеты і лічбы польскай тыя ж самыя мяшчане Пружанскія нам заплацяць, якой арэнды і іншых правэнтаў складкі кожны год пад час святога Марціна войту аддадуць, войт жа ў рукі старосты ці эканома нашага Кобрыньскага ў цэласці выплаціць павінен.

Прыбыткі ж паводле даўнейшага звычаю за ардынансам нашым войтам прызначаным або бурмістрам заўсёды гатовыя будуць даць.

Аднак звальняем іх ад падводаў, да дзяржавы Пружанскай або замку, мяшчанаў ані староста ці эканом наш Кобрыньскі, ані пакінуты на яго месцы абцяжарваць не павінен.

Падобным спосабам і ад стражы, хіба што пад час непрыяцеля або вайны, або пад час прысутнасці нашай каралеўскай, згаданых мяшчанаў Пружанскіх вызваляем.

Дазваляем дрэва на абагрэў і будаванне ў лесе нашым Кобрыньскім, а асабліва на Ратушу, і лоўлю рыбаў у рацэ названай Мухавец столькі, колькі месту належыць і ў тым з дыскрэцыяй, бо з ведама старосты ці эканома нашага; акрамя гэтага тыднёвага заўсёды торгу ў пятніцу, які здаўна ўстаноўлены, будуць мець кожны год дзве ярмаркі, адная назаўтра пасля святой Троіцы, другая на святаПератварэння Хрыста; пад час якіх вольна купцам абывацелям, а таксама і іншым адкуль-небудзь прыбылым, рэчы, тавары выстаўляць, прадаваць, купляць, тавар на тавар гандляваць і іншым учцівым бавіцца гандлем.

Некаторыя са шляхты, якія маюць свае валоданні ў месце Пружаны, для таго на моцы тых валоданняў і грунтоў юрыздыкцыі і судам месцкім падлягаць павінны.

І гэтыя ўсе вышэйзгаданыя пункты, напісаныя і спецыфікаваныя, ад найбольшага аж да найменшага пункту, места Пружанаў абывацелі аглядаць павінны на доўгія гады, так як іншыя гарады нашыя, а асабліва Берасце. Для якіх усіх згаданых пунктаў і для іх лепшай веры, гэты прывілей рукой нашай падпісаўшы, пячатку в.к.Літ., прыцiснуць загадалі. Дадзены ў Варшаве, дня 6 месяца мая, года 1589, панавання ж нашага год другі.

Жыгімонт кароль".

[АВАК.– Вильна, 1871.– Т.5.– С.426–428].

*Вольга Міронава, студэнтка V курсу гістарычнага факультэта*
*Берасцейскага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна.*

## Дзейнасць дабрачынных таварystваў шляхты ў Беларусі ў канцы XVIII–сярэдзіне XIX ст.

На тэрыторыі Расійскай імперыі першае дабрачыннае таварыства ўзнікла ў пачатку

XIX ст. згодна з загадам імператара Аляксандра І. Яно было заснавана на ўзор ужо існаваўшых на Захадзе дабрачынных таварыстваў, а менавіта Гамбургскага. У аснову быў пакладзены прынцып падтрымкі тых, хто меў патрэбу ў сродках. Аднак, была ўказана і адна з галоўных прычынаў – абмежаванне вымагання грошай пад выглядам збору ахвяраванняў [2, воп.1, спр.224, а.17]. Першым такое таварыства ў Беларусі было заснавана ў Наваградку ў 1809 г., а ў Менску – у 1810 г, у Берасці і Горадні – у 1816 г., у Слуцку – у 1822 г. і г.д. Дзейнасць таварыстваў была не вельмі плённай. Адбываліся і пэўныя трансфармацыі ў іх дзейнасці, якія праяўляліся ў перазацвярджэнні статутаў, у заснаванні новых таварыстваў і г.д. [4, воп.1, спр.494, а.591].

Дзейнасць Гарадзенскага дабрачыннага таварыства рэгламентавалася наступным чынам. Гарадзенскі грамадзянскі губернатар Андрэйковіч на падставе прапановы ад 4 кастрычніка 1821 г. за № 10586 прадставіў у камісію па разгляду справы копію ўказа імператара ад 8 жніўня 1821 г. на імя Віленскага ваеннага губернатара аб зацвярджэнні ў Горадні дабрачыннага таварыства на прынятых ужо правілах, выдадзеных для падобнага таварыства ў Вільні [1, воп.20, спр.875, а.4 адв.]. Галоўнай крыніцай існавання з'яўляліся дабраахвотныя складкі. Да вайны 1812 г. іх збор праходзіў праз прыходскія камітэты і святароў, але пасля ваенных дзеянняў такая практыка прышла ў заняпад. У 1816 г. у Горадні было сабрана па губерні 139 чырвонцаў, 8 298 руб. срэбрам, 10 507 руб. асігнацыямі, прычым 47 чырвонцаў, 5 581 руб. срэбрам і 9 856 руб. асігнацыямі, а таксама невялікая колькасць прадуктаў – 34 чвэрці жыта і 8 крупаў. Астатнія сродкі падлягалі выплаце праз 3, 5, 10 год і штогодна падчас дабрачынных збораў [1, воп.1, спр.752, а.16]. Сябры таварыстваў праводзілі значную прапагандысцкую дзейнасць па збору сродкаў. Даходы Гарадзенскага дабрачыннага таварыства склалі 700 руб. асігнацыямі з працэнтаў, 20 руб. срэбрам і 15 руб. асігнацыямі з ахвяраванняў. Акрамя таго, было сабрана жонкамі Гарадзенскага грамадзянскага губернатара М.Бабяцінскага і князя Чацьвярцінскага, а таксама за тэатралізаванае прадстаўленне яшчэ 232 руб. срэбрам і 845 руб. асігнацыямі, 38 руб. асігнацыямі адпаведна. Агульная сума, якая мелася ў распараджэнні дабрачыннага таварыства, склала 398 руб. срэбрам і 3 982 руб. асігнацыямі. У некаторых выпадках тэтралізаваныя выступленні маглі ладзіцца не толькі прыезжымі артыстамі, але і самой шляхтай (дваранамі). За 1818 і 1819 г. у Берасцейскае таварыства ад 10 ахвярадаўцаў паступіла 8 665 руб. [1, воп.1, спр.1342, а.16, 122 адв.].

Шмат намаганняў прыклаў Міхал Клеафас Агінскі па арганізацыі дзейнасці Віленскага дабрачыннага таварыства, прэзідэнтам якога ён быў абраны. На яго асабістыя сродкі ў Вільні быў пабудаваны прытулак для бедных, частку сваіх сродкаў ён накіроўваў на дзейнасць таварыства, выданне літаратуры. У 1817 г. былі выдадзены два зборнікі музычных твораў. Акрамя таго, ён адкрыў павятовую школу ў Маладзечне і перадаў ёй частку сваёй бібліятэкі [11, с.15, 18].

У дзейнасці масонскіх арганізацыяў у Беларусі таксама праглядаецца накірунак працы, які заснаваны на дабрачыннасці. Грашовыя сродкі ў іх касу паступалі двумя шляхамі – праз сяброўскія складкі за ўзвядзенне ў ступень і дабраахвотныя ахвяраванні. Яны ішлі на розныя мэты: у 1817 г. 100 руб. былі ахвяраваныя мастаку Яну Дамелю, у 1817 г. – ахвяраванні Трэмбінскага – на адзенне для бедных, у 1818 г. А.Дыбоўскі абавязаўся выплочваць 100 злотых штогод на карысць бедных [10, с.4–5].

Але былі і іншыя шляхі паступленняў сродкаў. У 1814 г. па прапанове Менскага губернскага маршалка шляхты суму, якая належала за дастаўку коней у 1806 г., запатрабавалі перавесці на ўтрыманне тэатра, а даход з яго выкарыстаць на дабрачынную дзейнасць. Праз 6 гадоў на агульным сходзе павятовых маршалкаў шляхты Менскай губерні прынята рашэнне, "*...каб суму ў 36 144 руб. асігнацыямі і 7 038 руб. срэбрам, зкамплектаванай з падатку пад назвай "на рыцарскую школу" і дадзенай пад іх кіраванне, перавесці на дабрачынныя мэты...*" [8, воп.1, спр.23, а.5–17].

Дзейнасць таварыстваў ахоплівала разнастайныя бакі жыцця тагачаснага грамадства. Сярод іх – утрыманне шпіталяў і дамоў працы, дапамога ў пабудове касцёлаў і цэркваў,

раздача грошай бедным. У Наваградку з 1819 па 1830 г. утрымлівалася штогод 11–12 вучняў, якія не мелі магчымасці наведваць школу, дырэктар гэтай школы для іх, эканом з жонкай, 7 жанчынаў і 2 старых [1, воп.1, спр.1342, а.9 адв.–10, 261 адв.–262].

Дабрачынная дзейнасць знаходзіла падтрымку і заахвочванне ў Санкт-Пецярбургу, дзе з 1816 г. ведамства Савета імператарскага чалавекалюбівага таварыства займалася выданнем часопіса "*Журнал императорского человеколюбивого товарищества*". Яго задачай было паведамляць як айчыннай, так і замежнай грамадскасці гістарычныя звесткі аб усіх існаваўшых з даўніх часоў і ў найноўшы час, працуючых і зноў адчыненых дабрачынных установах, паказваць іх пераемнасць і прапагандаваць дзейнасць сучасных дабрачынцаў. Змяшчаемыя матэрыялы тычыліся дабрачыннай дзейнасці, маралі і духоўных настаўленняў, лекарскай часткі, у тым ліку медыцынскай адукацыі, лячэння, фізічных практыкаванняў і папярэджвання захворванняў. Са згоды Літоўскага ваеннага губернатара генерала Рымскага-Корсакава падобнае выданне пад назвай "*Dzieje dobroczynności*" выходзіла і ў Вільні. Асноўнае месца ў ім займалі матэрыялы па Менскай і Гарадзенскай губернях.

Пад ўплывам віленскага выдання ў Слуцку ў 1822 г. ксяндзом Шантырам быў заснаваны Слуцкі камітэт апекі бедных, вытокі дзейнасці якога ідуць з 1816 г. Штогод ахвяроўвалася 270 руб. срэбрам прыходскай школе і 210 руб. срэбрам жаночай школе манахіняў-марыявітак і г.д. У дадатак да гэтага кармілі 30 бедных, дапамагалі 20 сем'ям, пабудавалі для іх вялікі дом. Капітал камітэту складаў 14 215 руб. срэбрам, атрыманых з дабрачынных складак і сродкаў з фундацыяў. Пад апекай камітэту знаходзіліся дом міласэрнасці і дом працы. У 1816 г. усе сумы склалі 60 440 руб., падтрымка ахоплівала 760 асобаў. Яшчэ ў 1802 г. ксёндз Францішак Хайноўскі, ваўкавыскі дэкан ахвяраваў 100 злотых на бедных і шпіталь, бібліятэку і абразы ваўкавыскаму касцёлу. 25 лістапада дэкрэтам Гарадзенскага земскага суда быў павялічаны фундуш дэ Парэсаў з Межырэчча. Ён быў выдадзены Пузыні на 5 000 злотых і павялічаны на 1 666 злотых. Фундуш таксама быў разлічаны на бедных і сіротаў [5, воп.1, спр.23, а.9, 26 адв., 68]. Гарадзенскі павятовы суд у 1842 г. пастанавіў спагнаць ахвяраваную суму ў 1 000 руб. срэбрам з пана Брыена дэ Ласі на карысць Гарадзенскага дабрачыннага таварыства, якую не ўнёс яго папярэднік Януары дэ Ласі. Апошні яшчэ ў 1819 г. абавязваўся гэта зрабіць, але з-за сваёй смерці не змог. У тым жа 1842 г. з пана Караля Масевіча таксама спаганяліся грошы на гэтыя мэты [6, воп.3, спр.6, а.1]. У 1854 г. Восіп Ельскі са Слоніма перадаў суму ў 100 руб. срэбрам, якая належала яму за арэнду дома вайскоўцамі, у распараджэнне губернатара [1, воп.27, спр.1346, а.1]. У 1806, 1809, 1810, 1812, 1817, 1819 г. граф Валіцкі рабіў новыя ахвяраванні на навуку: зборы мінералаў, гербарыі, мастацкія вырабы, макеты і медалі, розныя старажытныя рэчы ў колькасці 2760 штук. Прызначыў 1 800 руб. штогод на ўтрыманне і вучобу 8 бедных дзяцей [15, № 4, s.93–96].

Паступова дабрачыннасць прымае і "*безіменныя*" рысы, бо становіцца неабавязковым пазначаць сваё імя. Рабілася гэта з мэтай яднання розных сацыяльных слаёў на шляху нацыянальнага атаясамлення. Менавіта ў гэтым закладзена доўгатэрміновасць яе існавання, безумоўна, пры адначасовай падтрымцы ўладаў. У 10–20-я г. XIX ст., адначасова з павялічэннем ананімных ахвяраванняў, практыкавалася і агучванне імёнаў ахвярадаўцаў, але ўжо болей у выпадку з прапагандаваннем таварыствамі сваёй дзейнасці. Святары прыймаюць у гэтым самы актыўны ўдзел, па-ранейшаму пад іх апекай застаюцца шпіталі і школы. Дарэчы, да 1812 г. менавіта праз іх і іх прыходы фундатарства і дабрачыннасць знаходзіла найбольшае распаўсюджанне.

Вялікай была і роля жанчынаў у дабрачыннасці. Яны займаліся зборам сродкаў і выступалі ў ролі сувязнога звяна ў паўсядзённай дзейнасці таварыстваў. У 1840 г. удава калежскага асэсара Сокарава сваім тэстаментам ахвяравала на карысць Магілёўскага і Віцебскага дабрачынных таварыстваў пэўную суму [9, воп.1, спр.12175, а.1]. У адрозненне ад расійскіх губерняў, дзе існавала "*Патрыятычнае таварыства дамаў*", на беларускіх землях яна насіла форму простага жадання дапамогі і міласэрнасці ў выглядзе аб'яднанняў дабрачынных дамаў [15, № 10, s.139–155, № 11, s.301–302]. Але ясна была акрэслена іх

стаўленне да справаў айчыны і прыклад для астатніх. Пры заснаванні дабрачынных таварыстваў у ахвяру паступала некаторая сума грошай і ад імператарскай сям'і. Слуцкі камітэт атрымаў ад яе 2 000 руб.

У 1808 г. Аляксандр I, які садзейнічаў дабрачыннай справе, прызначыў 10 000 руб. на карысць Віленскага чалавекалюбівага таварыства, адначасова даўшы дазвол на яго дзейнасць [1, воп.20, спр.875, а.32].

Такім чынам, можна меркаваць аб шырокім распаўсюджванні дабрачынных традыцыяў, жаданні дапамагчы блізкім, выратаваць ад матэрыяльнага і духоўнага заняпаду. Пры гэтым дабрачыннасць ахоплівала разнастайныя слаі грамадства і спрыяла захаванню і падтрымцы сярод іх старых традыцый.

Пэўныя крокі ў гэтым накірунку рабіла і дзяржава. У час існавання Рэчы Паспалітай спробы заканадаўчага рэгулявання статутаў аб дабрачыннай дзейнасці рабіліся на соймах 1775 і 1780 г., але яны не мелі поспеху, а пастановы чатырохгадовага сойма былі адменены. На сойме 1791 г. была створана Камісія паліцыі, у абавязкі якой уваходзіў нагляд за шпіталямі, прытулкамі, тэатрамі, месцамі адпачынку, а таксама за шпітальнымі фундушамі. У законе, прынятым у 1793 г. на Гарадзенскім сойме, гаварылася, што адказныя за захаванне фундушаў і дабрачыннай дзейнасці асобы павінны падпарадкоўвацца загадам спецыяльна створаных камісій. За становішчам справаў у прыватных уладаннях паноў ажыццяўляўся толькі агульны нагляд [14, № 1, s.1–5]. Ужо пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у 1797 г. была створана так званая Шпітальная камісія (дзейнічала да 1808 г.), да якой перайшлі вышэйзгаданыя функцыі.

У Расійскай імперыі справы аховы здароў'я, адукацыі і дабрачыннасці былі ў губернях даручаны адмысловаму органу – прыказу грамадскай апекі. Старшынёй прыказа з'яўляўся губернатар. З-за адсутнасці пастаянных сябраў прыказа на яго пасяджэннях, якія адбываліся адзін раз у год, прымалі ўдзел прадстаўнікі розных судовых органаў губерні. В.Шаўкапляс адзначае станоўчую ролю прыказаў грамадскай апекі, якія не мелі па штатнаму раскладу канцылярскіх служыцеляў. На самой жа справе ў беларускіх губернях пры іх была пастаянна дзеючая канцылярыя [12, с.47–55]. Сродкі, якія адпускаліся ўрадам на дабрачыннасць, часткова сабраныя з насельніцтва ў выглядзе ахвяраванняў, пускаліся прыказамі ў абарот пад залог маёмасці паноў. Пасля стварэння ў 1802 г. Міністэрства народнай адукацыі, падпарадкаваныя прыказам школы выйшлі з-пад іх кіраўніцтва. І толькі фінансавыя сродкі працягвалі паступаць праз іх. Пры адкрыцці кожнага з прыказаў дзяржава давала 15 000 руб., астатнія грошы паступалі з судавытворчасці і іншых крыніцаў, у тым ліку з прыватных даходаў [14, № 1, s.5]. Да 1819 г. прыказы падпарадкоўваліся Міністэрству паліцыі, а з 1819 г. – Міністэрству ўнутраных справаў.

У 1838 г., згодна з прапановамі міністра народнай адукацыі, Віленскага вайсковага і Гарадзенскага, Менскага і Беластоцкага генерал-губернатараў для паляпшэння жаночага выхавання ў губернях Беларускай навучальнай акругі была зроблена спроба заснаваць у Вільні, Віцебску, Полацку, Горадні і Беластоку па аднаму ўзорнаму прыватнаму пансіёну. Дапамога са скарбу кожнаму з іх складала 1 500 руб. у год. Кіраўнікамі ствараемых установаў са згоды міністра народнай адукацыі прызначаліся асобы, якія былі вядомы сваімі маральнымі і арганізатарскімі якасцямі і мелі пэўныя навыкі працы з моладдзю.

У Горадні гэтую пасаду заняла Соф'я Савіч, народжаная фон Бізінг. Па штату ў пансіянат залічвалася 70 дзяўчынак (з 50-ці поўных і 20-ці паўпансіянерак) з правам павялічэння іх колькасці. Акрамя таго, на сродкі ўтрымальніцы залічвалася 5 дзяўчынак з ліку беднай шляхты (дваранаў), абраных губернскім шляхецкім маршалкам без усялякіх плацяжоў, з мэтай падрыхтоўкі іх для далейшага заняцця месцаў настаўніцаў. Курс навучання падзяляўся на 4 класы (гады) і ахопліваў наступныя прадметы: 1) закон Божы, 2) расійскую, польскую, французскую і нямецкую мовы, граматыку, а таксама літаратуру на гэтых мовах, 3) расійскую і агульную гісторыю, прыродазнаўчую гісторыю і геаграфію, 4) арыфметыку, чыстапісанне, рысаванне, музыку і танцы, 5) жаночае рукадзелле, а таксама асновы хатняй гаспадаркі [1, воп.20, спр.9, а.40, 41, 412].

Вышэйзгаданая прапанова ішла ў рэчышчы шэрагу пастановаў Сенату за 1837 г., што былі ініцыяваныя міністрам унутраных справаў, аб заснаванні ў заходніх губернях установаў для адукацыі дзяцей мясцовай шляхты (дваранаў) і чыноўнікаў, якія не мелі дастатковых сродкаў. Для іх было прапанавана адкрыць пансіёны пры гімназіях ці павятовых вучылішчах, першапачаткова ў Горадні і Наваградку для Гарадзенскай, Віленскай губерняў і Беластоцкай вобласці, затым у Магілёве – для Магілёўскай, Віцебскай і Менскай губерняў. На ўтрыманне выхаванцаў сродкі адпускаліся з сумаў прыказаў грамадскага прызрэння [1, воп.20, спр.10, а.369]. Паступова рэгуляванне ўплыву шляхты (дваранства) на выхаваўчыя працэсы і яго падтрымку пераходзіць цалкам пад нагляд дзяржаўных установаў і органаў кіравання, што не заўсёды добра спалучалася з магчымасцямі і жаданнем мясцовых паноў.

Становішча вышэйшай і сярэдняй адукацыі ў Беларускай навучальнай акрузе ў плане фінансавання складвалася наступным чынам: “*Па фінансаваму каштарысу міністэрства народнай адукацыі асігноўвалася 12 869 руб. срэбрам. На стыпендыі і дапамогі вучням некаторых гімназіяў Віленскай навучальнай акругі, а менавіта на Віленскую гімназію – 1 000 руб., Гарадзенскую – 4 190 руб., Беластоцкую – 1 000 руб., Ковенскую – 2 514 руб., Менскую – 4 164 руб. У склад асігнаванняў увайшлі:*

1) *5 000 руб. былі выдзелены на падставе загадаў імператара ад 2 кастрычніка 1838 г. і 15 снежня 1843 г. па 1000 руб. на кожную з пералічаных гімназіяў;*
2) *3 150 руб. былі адпушчаны на ўтрыманне скарбовых выхаванцаў Гарадзенскай і Менскай гімназіяў (па загадах ад 28 кастрычніка 1837 г. і 15 жніўня 1854 г., а менавіта на Гарадзенскую – 1 750 руб. і на Менскую – 1 400 руб.);*
3) *4 719 руб. былі пералічаны з % ад ахвяраваных капіталаў на ўтрыманне выхаванцаў па тэстаментах, а менавіта на Ковенскую гімназію – 1 514 руб., Гарадзенскую – 1 440 руб. і Менскую – 1 764 руб.*

*Па ўсіх запісах Віленскай навучальнай акругі прыбытак склаў прыкладна 13 000 руб., на якія ўтрымлівалася 136 бедных дваранаў і было заснавана 59 асабістых стыпендыяў*” [13, с.29]. Так, у Гарадзенскай губерні ў 1838 г. дапамогу атрымлівала каля 5,6 % вучняў [1, воп.19, спр.1557, а.134–136].

15 жніўня 1801 г. у рэскрыпце Аляксандра I на імя Менскага грамадзянскага губернатара паведамлялася аб заснаванні ў Вільні шляхецкага (дваранскага) ваеннага вучылішча. Сярод іншых была запрошана і шляхта (дваранства) Менскай губерні для фінансавай падтрымкі і адпраўкі ў вучылішча сваіх прадстаўнікоў. Сабралі 36 724 руб. 30 кап. срэбрам, але сродкі былі пералічаны ў Менскі прыказ грамадзянскага прызрэння ў сувязі з тым, што адкрыццё ваеннага вучылішча не адбылося [8, воп.3, спр.77, а.1].

Падобныя спробы мелі месца і пазней. 3 ліпеня 1818 г. быў канфірмаваны даклад ад Савета па вайсковых вучылішчах аб заснаванні ваенных вучылішчаў на сродкі шляхты (дваранства) некаторых губерняў. Выкананне было ўскладзена на міністэрства ўнутраных справаў [1, воп.1, спр.1331, а.3–4]. Але ў адказе Гарадзенскага грамадзянскага губернатара на цыркуляр МУС ад 30 студзеня 1824 г. паведамлялася, што па справах канцылярыі Літоўска-Гарадзенскага дэпутацкага сходу не бачна, каб шляхта (дваранства) губерні рабіла якія-небудзь ахвяраванні на заснаванне ваенных вучылішчаў [1, воп.1, спр.441, а.3]. Згодна з зацверджанай імператарам 1 лютага 1830 г. дырэктывай аб губернскіх кадэцкіх карпусах, у Полацкім кадэцкім корпусе, адкрытым ў 1835 г. на ахвяраваныя грошы, знаходзілася 8 навучэнцаў з Менскай губерні.

У Віленскай жа губерні, значная частка якой знаходзілася ў межах сучаснай Беларусі, у 1837 г. было сабрана 7 150 руб. асігнацыямі (2 043 руб. срэбрам) на ўтрыманне 10 чалавек. Асноўнай мэтай стварэння карпусоў было выхаванне малалетніх дваранаў [1, воп.10, спр.1545, а.1]. Але недахоп грошай і вакантных месцаў прымусілі шляхту (дваранства) праз шляхецкіх маршалкаў Менскай, Віленскай і Гарадзенскай губерняў выйсці з прапановай аб заснаванні для вышэйзгаданых губерняў і Беластоцкай вобласці асобнага кадэцкага корпуса. Пры гэтым прапаноўваўся збор 6 кап. з душы [7, воп.3, спр.77, а.1, 3, 16 адв.]. На ўтрыманне 1 выхаванца штогод выдаткоўвалася 185 руб. 52 кап. срэбрам. У 1853 г. Дзяржсаветам

Расійскай імперыі быў зацверджаны каштарыс земскіх павіннасцяў на 3 гады, дзе на ўтрыманне Аляксандраўскага Берасцейскага кадэцкага корпуса трэба было сабраць са шляхты (дваранства) Гарадзенскай губерні 11 988 руб. 72 кап. срэбрам [3, воп.1, спр.29, а.1, 63].

Вядомы і асобныя ахвяраванні на ўтрыманне кадэцкіх карпусоў. У маі 1849 г. ўступіў ў моц тэстамент пана з Бабруйскага павета Восіпа Ждановіча, уладальніка маёнтку Майсеяўка аб ахвяраванні 15 000 руб. срэбрам на карысць Берасцейскага Аляксандраўскага кадэцкага корпуса для выхавання ў ім яго ж сваякоў ці бедных шляхціцаў (дваранаў) [7, воп.1, спр.20, а.1].

Такім чынам, дзяржава ўзяла на сябе функцыю кантролю за грамадскай дзейнасцю ўжо існуючых і адчыняемых пасля адпаведнага дазволу дабрачынных таварыстваў, здзяйсняючы пры гэтым кантрольна-рэвізійную праверку іх фінансавага становішча і размеркавання сродкаў. Інфармацыйна-прапагандысцкую функцыю выконвалі не толькі прыходскія святары і сябры таварыстваў, але і друкаваныя па распараджэнню ўладаў рознага кшталту перыядычныя выданні.

**Літаратура і крыніцы:**


1. НГАБ у Горадні, ф.1 “*Канцылярыя Гарадзенскага губернатара*”.
2. НГАБ у Горадні, ф.2 “*Гарадзенскае губернскае праўленне*”.
3. НГАБ у Горадні, ф.94 “*Гарадзенская дваранская апека*”.
4. НГАБ у Горадні, ф.229 “*Сіроцкі суд Беластоцкага павета*”.
5. НГАБ у Горадні, ф.332 “*Гарадзенскі губернскі дэпутацкі дваранскі сход*”.
6. НГАБ у Горадні, ф.586 “*Лідскі павятовы суд*”.
7. НГАБ у Менску, ф.299 “*Менскае губернскае праўленне*”.
8. НГАБ у Менску, ф.320 “*Канцылярыя Менскага губернскага маршалка шляхты*”.
9. НГАБ у Менску, ф.1297 “*Віцебскі прыказ грамадскай апекі*”.
10. Рыбчонак С. Менскія варштаты ў 1 чвэрці 19 стагоддзя: Нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі.// Годнасць.– Менск, 1994.– № 1(2).– С.3–14.
11. Трэпет Л. Там, дзе гучалі паланезы.– Мн.: Полымя, 1990.– 34 с.
12. Шаўкапляс В.А. Асаблівасці арганізацыі мясцовых органаў кіравання і суда ў Беларусі ў канцы XVIII–пачатку XIX ст.// Весці АН БССР. Сер. грамад. навук.– 1972.– № 2.– С.47–55.
13. Юницкий Н. Фундуши и стипендии Виленского учебного округа.– Вильно, 1884.– Ч.1.– 208 с.
14. Dzieje dobroczynności.– Wilno, 1820.– № 1, 2, 5–7, 9, 10.
15. Dzieje dobroczynności.– Wilno, 1823.– № 1, 4, 7, 10–12.


*Сяргей Амелька.*

## ***<u>КРЫНІЦЫ.</u>***

# Попіс шляхты Ваўкавыскага павета ў 1621 г.

У Расійскай Нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу ў аддзеле рукапісаў захоўваецца фонд 971 “*Збор аўтографаў П.П.Дуброўскага*”. Гэта – адзін з багацейшых збораў дакументаў па гісторыі Беларусі па-за межамі нашай краіны. Натуральна, што Беларусістыка ў Расійскай імперыі фармавалася пераважна ў XIX ст., шляхам канфіскацыі і вывазу архіўных, музейных і бібліятэчных каштоўнасцяў у расейскія навуковыя і універсітэцкія цэнтры. “*Збор П.П.Дуброўскага*” у РНБ гэта вялікая частка архіва роду Радзівілаў з дакументамі па грамадска-палітычнай, вайсковай, культурнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай XVI–XVIII ст., а таксама з эпісталярнай спадчынай шматлікіх магнацкіх родаў – Сапегаў, Хадкевічаў, Масальскіх і вядома ўласна Радзівілаў. Сярод названага багацця захоўваецца значная колькасць матэрыялаў, якія датычацца Ваўкавыскага павета XVI–XVIII ст., у прыватнасці ўнікальны “*Спіс шляхты Ваўкавыскага павета 1621 г.*” Дадзены “*Спіс...*” складаецца з дзвух частак, якія змешчаны ў дзвух асобных рукапісных зборніках. Першая частка, гэта – спіс шляхты Ваўкавыскага павета, якая з’явілася на выклік павятовага маршалка і павятовага харужага 3 лістапада 1621 г. каля вёскі Піваголі блізу мястэчка Пуня (ф.971, воп.2, аўтограф 127, стар.225–228). Другая частка – гэта

спіс шляхты, якая па розных прычынах не з'явілася на выклік вышэйшых вайсковыхураднікаў Ваўкавыскага павета (ф.971, воп.2, аўтограф 133, стар.140–141). Прычынай для чарговага попісу і выкліку шляхты на паспалітае рушанне, сталася актывізацыя ў 1621 г. Швецыі пад час шматгадовай вайны з Рэч Паспалітай. У выніку швецкае войска захапіла Рыгу і вусце Заходняй Дзвіны.

Абодзве часткі спісу складзены на польскай мове, арыгінальныя рукапісы, з подпісам тагачаснага харужага Ваўкавыскага павета Станіслава Пукшты. Праўда, у гэтай польскай мове захавалася значная частка беларусізмаў. Пададзена імя і прозвішча шляхціча, яго пасада і некаторыя маёнткі. Таксама апісаны прамыя абавязкі па колькасці выстаўленых ўзброенных ваяроў ад кожнага шляхціча. Выстаўляліся галоўным чынам *"коні па-гусарску"* і *"коні па-казацку"*. Гусарская конніца была самай баяздольнай і элітарнай у войску ВКЛ, яна з'яўлялася конным войскам цяжкага тыпу. Да тыповага рыштунку гусара ў другой палове XVI–першай палове XVII ст. належалі прылбіца (альбо шышак), панцыр (вага засцярагальнай зброі сягала 15 кг), тарча, дзіда, шабля, палаш, агнястрэльная зброя (пісталет ці лёгкая стрэльба). Дадаткам да такога ўзбраення былі крылы, якія мацаваліся да сядла ці за спіной вершніка.

Лёгкай кавалерыяй у войску ВКЛ на той час лічыліся казакі. У XVII ст. харугвы казакаў былі сярэднеўзброеннай конніцай і ўтваралі касцяк кавалерыі. Тыповым ўзбраеннем іх былі – кашуля з металічнай сеткі ці лускі, зрэдку тарча, шабля, пісталеты альбо ручніца, лук ды рагаціна.

Адзін з павета шляхціч *"Пан Мікалай Воўк з маёнтка Сядзельнікі каня па-пяцігорску"* ставіў. Гэта від лёгкай кавалерыі ў войску ВКЛ, які складаўся пераважна з людзей кабардзіна-татарскага паходжання. Паводле ўзбраення пяцігорцы амаль не адрозніваліся ад казакоў. Яны мелі дзіды, шаблі і лукі.

Прадстаўлены спіс шляхты Ваўкавыскага павета 1621 г., які захоўваецца ў РНБ у Санкт-Пецярбургу, яшчэ адна вельмі важная крыніца па гісторыі Ваўкавыскага края. Яна будзе карысна і спецыялістам і краязнаўцам, асабліва генеалогам. У спалучэнні з попісам шляхты Ваўкавыскага павета 1528, 1565, 1567 г. даследчыкі змогуць прасачыць дэмаграфічныя змены, працэсы засялення тэрыторыі рэгіёну, змены ўласнікаў тых ці іншых маёнткаў. "*Спіс...*" друкуецца ў перакладзе на беларускую мову[75].

**"*Спісанне іх мосцяў паноў абывацеляў рыцарства шляхты Ваўкавыскага павета і іншых, якія паводле канстытуцыі і сойму, што нядаўна адбыўся, былі выцягнутыя для абароны Бацькаўшчыны супраць князя Судэрманскага, які несяброўскім чынам напаў на дзяржаву Яго Каралеўскай Мосці, горад Рыгу ўзяў і далей у дзяржаву Яго Каралеўскай Мосці прасоўваецца, якія выправіліся ў Інфлянты, дзе каля сяла Піваголы, што каля Пуняў, сабраліся 3 лістапада 1621 г.***

Яго мосць Пан ***Ян Юндзіл***, маршалак Ваўкавыскага павета, будучы сам, да ўслады Бацькаўшчыны, з маёнткаў сваіх у Ваўкавыскім і іншых паветах размешчаных, ставіў тры кані ўзброеных па-гусарску.

Яго мосць Пан ***Мікалай Карп***, падкаморы ваўкавыскі, з маёнтку Навасёлкі, размешчанага ў Ваўкавыскім павеце – два кані, а з іншых маёнткаў сваіх і пані жонкі сваёй з маёнтку Дубляны, размешчанага ў Гарадзенскім павеце чатыры кані, з жадання і міласці да Бацькаўшчыны – два кані, а ўсяго восемь коней узброеных па-гусарску.

Яго мосць Пан ***Станіслаў Пукшта***, харужы ваўкавыскі з маёнткаў сваіх у розных паветах ляжачых, сам да службы Бацькаўшчыне і з харугвай, ставіў дванаццаць коней узброеных па-гусарку, а два кані ўзброеных па-казацку з маёнтку Манцякі апекі ***Яна Цывінскага***.

[75] Гл. таксама: Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ваўкавыскага раёна.– Мн.: БЕЛТА, 2004.– С.93–98.

Яго мосць Пан ***Крыштаф Алендскі***, стольнік ваўкавыскі з маёнткаў сваіх айчыстых, якія ва ўладанні Пані Маці іх мосьці ёсць – тры кані, а з жадання і з міласці да Бацькаўшчыны таксама тры кані ўзброеных па-гусарску; з Стрыяўшчызны, якая знаходзіцца ва ўладанні яго мосьці Пана ***Яна Алендскага***, ставіў два кані ўзброеных па-казацку.

Яго мосць Пан ***Геліяш Зянковіч***, суддзя наваградскі ад сябе і з часткі брата свайго з маёнтку непадзелянага – чатыры кані па-гусарску з маёнткаў сваіх у Ваўкавыскім і іншых паветах размешчаных.

Яго мосць Пан ***Крыштаф Дольскі***, суддзя ваўкавыскі, пасланы ад бацькі свайго яго мосьці Пана суддзі земскага ў гадах ужо старых, ставіў тры кані па-гусарску, а тры кані па-казацку.

Яго мосць Пан ***Багдан Масальскі***, падсудак ваўкавыскі, сам будучы ў гадах, з маёнтку Алтупаўшчызна і з часткі Сямёнаўскай у Харашэвічах выслаў сына дарослага Пана ***Юрыя*** і ад брата свайго Пана ***Януша Масальскага***, суддзі гродскага ваўкавыскага, тры кані гусараў.

Яго мосць пан ***Андрэй Трызна*** выслаў сына свайго добрадарослага і да вайсковай службы годнага, пры ім чатыры кані па-гусарску, а два – па-казацку.

Яго мосць пан ***Пётр Трызна***, староста бабруйскі з маёнткаў сваіх у Ваўкавыскім павеце і ў іншых месцах, шэсць коней па-гусарску, а таксама азнаёміў, што сына свайго з гонарам выслаў да Караля Яго мосці да Валахіі.

Ад яго мосці пана ***Сакалінскага***, старосты язерскага, пан ***Карась*** ставіў два кані па-гусарску.

Яго мосць Пан ***Прэслаў Пакаш***, будучы сам хворы, выслаў слугу свайго шляхціча праўдзівага пана ***Дыяніса Цыртольта*** і пры ім чатырнаццаць коней гусараў і чатырнаццаць коней па-казацку.

Яго мосць пан ***Крыштаф Шэмет***, суддзя ваўкавыскі, сам ставіў два кані па-гусарску.

Яго мосць пан ***Самуэль Аўсяны*** ставіў чатыры кані па-гусарску.

wszelkich/ pozytkow wynaydowac, do arędy podług … płocąc. [Z] trunkow w Miescie robiących się, czyli przywoznych … … Zydzi … … Do kohału podatek Zydowski od/ płacac maią. **5to.** Domy, mieszkania … Kamienice Sklepy piwnice Browary na placach swoich kożdemu stawiac podług upodobania wolno, … … Do[my]/ y mieszkania komu chcąc zbyc wolno, byle nie ……….. ale tylko Mieyskiey kondycyi Ludziom. **6to.** Na wygonach Mieyskich bydłu Zydowskiemu d[a]/ ne iest pastwisko, byle ogulnie Zydzi rocznego Pastwi.. … … z Chrzesciany mieli. **7timo.** Do …, wałow y mostow, tudziesz do utrzymania …/ podług dawnych zwyczaiow pociągani Zydzi [n]ie maią, a nie nadto Escypuią. Szkołe, [Dom] Szkolny y kładyszcze, z ktorych Chcąc tey roboty czynic pozwalasię/ **8vo.** Łaznią Zydom za Miastem mieć pozwalasię, bez żadney z tego płacąc płaty y w oney palic każdego czasu przed Wielkonocy, Bożego Narodzenia, …/ nych Swiąteo Bożego Ciała, y innych dni Matki Boskiey w Ktore to dni wszystkie roboty w browara[ch] y w łazni dziać powin[n]y … … Apostol:/ skie pod winą Dziesięciu Talarow bitych na Kosciol. **9no.** Pod czas aktu weselnego pozędałosię Zydom muzykow zaciągac lub z Miasta własnego lub z kąd/ inąd tak Zydow iako y Chrzescian nic do cechu niepłacąc. **10mo.** Zamkowa zwierzchność winnikow y posługaczow Zydowskich do zadnych takoz pociągac nie/ ma, a zatą w każdą sobotę winnicy Bramy y mosty wymiątac czy m…ę dla ozdoby samego Miasta. Czego starsi Zydowscy postregać maią z Woytem; Także w/ Zamku na pomycie Okien y uprzątnienia podwurza do sotni przykładaćsię maią. **11mo.** Starsi Zydowscy dway z iedney Familij obrani być nie maią, ale całey gmini krewni/ kami z posrzodka siebie obrac onych ma przy widzu z Zamku [ze]słanym; Miesięczni zas Zydowscy pobory czyniąc, powinien ieden być z Starszyzny obrany, a drugi z/ czerni, y w kwartał ci Miesięczni y Poborce przed całym Gminem z Percepty y Expensy kalkulowacsię w obecnosci Rabina y takowe kalkulacyie przedpisane kon..owac/ **12mo.** Zołnierze u Szynkarzow gospod miec nie maią, czego Komenda ma postrzegac. **13mo.** Przyiezdzaiącym Kupcom a tu niemaiącym … Kromow y Domow własnych, na/ ……………………………… Jarmarkow … … przedawac wolno … Łokciami … Takowe ustawy y nadania/ ażely przez Jchms PP. Komissarzow Gubernatorow Kommendantow Kassyierow Pisarzow Administratorow Et omni tituli Dyspozytorow Dobr moich … …/ …, Zalecam y dla większego Waloru Ręką własną przy Pieczęci stwierdzam. Datum w Bychowie Roku Tysiąc Siedmsetnego Piędziesiąt [Osm]ego/ Miesiąca Februarij Siedymnastego Dnia/ Mi[chał Antoni Sapieha] Podkan. WoXaLo.”.

**Унізе дакументу на чырвоным плецяным шоўкавым шнуры прывешана ў жалезнай іржавай бляшанцы (68 мм) на чырвоным воску кепскавідочная пячатка (60 мм) Міхала Антонія Сапегі, падканцлера ВКЛ: картушовая тарча падзеляна на чатыры? часткі – у 1-ай герб “*Тры лілії*”, у 2-ой польскі герб “*Ліс*”, у 3-яй выява збройнай рукі, прашытай стралой зверху ўніз, а ў 4-ай герб “*Пагоня*”. Тарча пакрытая княжацкай мітрай з плашчом, вакол тарчы – стужка ордэну Белага Арла, які вісіць пад ёй. Надпіс у абтоку пячаткі ў два радкі зацёрты, чытаецца частковa:** “*...EL ANTHONIUS COMES IN BYCHOW ... DOMBROWNAE. SAPIEZYN. SAPIEHA.../ ...TUCHOLIENSIS. WOLKOWYSENSIS ...*”.

**На адвароце дакументу запісы размытыя і не чытаюцца, акрамя асобных словаў:** “*Wincenty Wierżbiłowicz Pisarz Ziem..../ Jozef Sawrycki Regent...*”. **У левым верхнім куце маецца размыты курадымны чорны адбітак пячаткі (28x32 мм): на французкай тарчы падзелянай на дзве часткі – у верхняй палова двухгаловага расійскага арла, у ніжняй – дзве перакрыжаваныя гарматы. Надпіс у абтоку:** “*ПЕЧАТЬ ……………… ЗЕМСКАГО СУДА*”. **Па краях дакументу чорнымі чарнілами прастаўлены па два разы нумары** “*7538*” **і** “*7949/5*” **(адзін раз закрэслены) і чырвоным алоўкам** “*7*”.

**5. 27.03.1775 г., (Варшава). Пергамін (КП № б/н), 59x43,2 см, захаванасць задавальняючая, тэкст чытаецца цалкам. Тэкст:**

“**Stanisław August** z Bożey Łaski Król Polski, Wielki Xiąze Litewski, Ruski, Pruski, Mazowiecki,/ Zmudzki, Kijowski, Wołynski, Podolski, Podlaski, Jnflantski, Smolenski, Siewierski, y Czerniechowski./

**O**znaymuiemy tym Listem Wieczystym Przywileiem Naszym wszem wobec y kazdemu zosobna komu otym wiedzieć Należy. Wychowani na Łonie Oyczyzny ci Dziełem/ Naywyzszey Opatrznośći na Tron Polski wyniesieni Zapatruiemy z ukontentowaniem na rozkrzewioną w

przeciągu Panowania Naszego Młodźi Krajowey Edukacyą/ Znayduiąc nieprozne troskliwośći Naszey Skutki, gdy mimo wszelkie obcych y domowych niespokoynosci Zawady, zasilone Protekcyą Naszą Nauki wzrost y przyzwoity/ w tey Rzeczypospolitey mieć poczeły Szacunek z większym ieszcźe uśilnośći Naszey natężeniem po zniesionym niedawno przeż Bullę Oyca Swiętego um Jnstituto Xięzy Jezui/ tow Zakonie, tę istotną potrzebę utrzymania Edukacyi Młodźi Krajowey na Nas przyiowszy, Kommissyą Edukacyiną na Seymie teraznieyszym z Pany, Radami y Posłami Ziem/ skimi pod Zwierzchnością y powagą Naszą Ustanowilismy Dobra zas ante Suppressionem Jnstituti przeż Jezuitów dzierzane do Fundusźu teyźe Edukacyi Narodowey nalezące./ na Dochod wieczysty z nich płacić śię maiący Przywileiami Naszemi nadac umyslilismy. Jakoz gdy Urodzony Andrzey Dzierzeński Czesnik Powiatu Grodźienskiego/ chcąc otrzymać Dziedźictwo Folwarku Stoszany nazwanego w Powiecie Pinskim leżącego za Summę Siedmdźiesiąt Pięć Tysięcy Pięćset Piędziesiąt Pięć Zł.[80] Groszy Sze=/ sznaśćie Szelągów dwa natym Folwarku wieczyśćie lokowana od tegoż ...ła Procent Wieczny pułpiąta Złotego od Sta Prawem teraznieyszym ustanowiony Płacić/ Submidowałsię y dla tey pewnośći Ewikcyą na własnych Dobrach Dziedzicznych Trzyrzecże nazwanych w Powiećie Grodzieńskim leżących przeż Dokument Kommissyi/ Edukacyiney dany, Zapisawszy Supplikował do Nas przeż Panów Rad przy Boku Naszym przytomnych Ozebyśmy Onemu Przywiley na przerzeczony Folwark/ Stoszany cum Attinentiis wydać y przy Possessyi Wieczystey Jego Samego Potomstwo Oboyga płći y Sukcessorów onego na wieczne Czasy utwierdzić Raczyli/ My Król do wnieśioney za nim prozby Łaskawiesię skłoniwszy Ninieyszym Listem wieczystym Przywileiem Naszym wspomniony Folwark Stoszany w Po=/ wiećie Pińskim sytuowany Urodzonemu Andrzejowi Dżierzeńskiemu Cześnikowi Powiatu Grodżienskiego Jemu Samemu Potomstwu Oboyga płći y Sukcessorów Jego na/ Wieczne Czasy Nadaiemy przy Dziedżictwie takowego Folwarku nazawsze Zachowuiemy Utwierdzamy y Ubespieczamy Mocą którego Przywileiu Naszego Urodzo/ ny Andrzey Dzierzenski Czesnik Powiatu Grodzienskiego namieniony tyle kroc Folwark Stoszany Sam Dwor ze Wsią także Stoszany nazwaną ze wszelkim Wsi/ y Dworu Zabudowaniem z Gruntami, Lasami, Sianozęciami, Puszczami, Gaiami, Rzekami, Zatokami, Jeżiorami, Stawami, Młynami, Tartakami, Waluszami, z Karczma/ mi Arędami y Poddanemi Oboyga płci z Czynszami Daninami y powinnościami onych cum Omnibus deniq[ae] Attinentiis usibus, Fructibus et Utilitatibus bez zadnych/ Excepcyi tak iako się ten Folwark w Swoich własnośćiach Obszernośćiach, y Ograniczeniach, Znayduie y znaydować się powinn [sic!] w Wieczystą Passessyą Offitiose obey:/ mować, trzymać, dzierzeć, uzywać, ten Folwark komu chcąc dać, darować, przedać, Zamienic, Zapisać y wszelkich Sobie ztamtąd pozytkow wynaydować bez Za:/ dney od kogoż kolwiek przeszkody wiecznemi Czasy wespoł z Sukcessorami Swoiemi, wolen y mocen będźie Salvis Conditionibus w Konstytucyi Seymu teraźnieysze-/ go pod Tytułem Rozrządzenie Dobrami, Jezuickiemi Expressis. Na co dla lepszey Wiary Ręką Naszą podpisawszyśię Pieczęć W*o*X*a*L*o* Zawiesic Rożkazalismy. Dan-/ *w*Warszawie Dnia XXVII*o* Miesiąca Marca Roku Panskiego MDCCLXXV Panowanania Naszego XI Roku./ Stanisław August Krol./ Folwark Stoszany w Powiecie Pin/ skim lezący do Fundusżu Eduka-/ cyi Narodowey nalezący Urodzo-/ nemu Andrzejowi Dzierzenskiemu/ Czesnikowi Powiatu Grodżieńskiego/ wiecznośćią confertur./ Jerzy Białopiotrowicz Łowczy Pttu Lidzkiego/ J*o*Kmci Pieczęci WXL*o* Sekretarz”.

**Унізе дакументу на выцьвілым чырвоным плецяным шоўкавым шнуры прывешана ў бляшанцы вялікая пячатка ВКЛ на чырвоным воску, якая дрэнна захавалася: у цэнтры зацёрты герб “*Пагоня*” пад княжацкай мітрай, над якой у кляйноце на картушы польскі “*Арол*” пад каронай, па баках “*Пагоні*” – две постаці ў туніках – тарчатрымальнікі, якія абапіраюцца на тарчы з зацёртым гербам “*Цялё*” (справа) і манаграмай “*SAR*” (злева). Уся кампазіцыя знаходзіцца на пліце, у цэнтральнай частцы якой пададзена дата: “*MDCCLXIV*”. Надпіс у абтоку пячаткі:** “*STANISLAVS AVGVSTVS DG REX POL M DVX LIT. RVS. PRVS. MAS. SAM. KI. VOL. PODO. PODL. LI. SMO. SEV. CZE...* ”.

[80] Замест прапушчанага пісарам слова “*Złotych*” ўцiснута скарочанае “*Zł.*”.

**Над тытулам манарха маецца надпіс па-расійску:** “*По Описи: № 2*”. **Злева ад тэксту на палях чытаецца:** “*Roku 1775 Mca Maia Jedynastego d[ie] Stanowszy Osobiscie w Trybunale Gł/ WXL$^{o}$ Patron WJP$^{a}$ Franciszek Wołk Czeszn[ik] Nowogr[odzki] ten Przywiley do Akt/ podał./*”. **Пад запісам – подпісы:** “*Antoni Giełgud ... ... ... Tł$^{u}$ Gło WXL$^{o}$/ Tmsz Czudowski Miecz Ptt$^{u}$ Słonim/ Pisarz TRł$^{u}$ Gł$^{o}$ W$^{o}$X$^{a}$Litt$^{o}$/ Conco[r]datus cu$^{m}$ Actio PR Kołłupayło Trybun Gł$^{o}$ WXL$^{o}$ Regent/*”. **Злева ўнізе на загнутым для пячаткі кавалку пергамену чытаецца:** “*Roku 1809 Msca 8bra 9 Sąd Kommissyi/ Odukacyiney Litewskiey Takowy Przywiley/ Konnotuje./ Antoni Dyz Lachnicki Kosrz/ Michał Zaleski Kmsrz/ Adam hrabia Chreptowicz/ Kmsrz/*”.

**На адвароце дакументу па верхняму краю ледзь відочны зацёрты надпіс:** “*R$^{u}$ 1793$^{o}$ Miesiąca 7bra 16$^{o}$ dnia Na Roczkach 7browych Powiatu Pinskiego przed Nami Mateuszem Topor Butrymowiczem Łowczym y Podstarostą Kawalerem Orderu S$^{o}$ Stani-/ sława, Dominikiem Ordą Sędzią, Pawłem Szyrmą Chorązym ZaPin: Stawuiąc Osobiscie Patron WJP Leon Laskowski Ko/ mor: Wdwa Brzeskiego Takową Dypplomę od Nayiasnieyszego Stanisława Augusta Krola Polskiego na Folwark Pojezuicki Stoszany w Pcie Pin: leżący WJP andrze-/ jowi Dzierzynskiemu Czesnikowi Pttu Grodzien: wzdaną do Akt podał – przyięto –/ Mateusz Topor Butrymowicz/ Podstarosta Sądowy Pttu Pinskiego/ Kawaler Orderu S$^{o}$ S$^{a}$/ Dominik Orda/ Sędzia Grodzki Pinski/ Paweł Szyrma Chorązy Pttu Zapinskiego/ pisarz Grodzki Pttu Pinskiego/*”. **Пад подпісамі злева направа: шасцікутны ромбападобны фіялетавы штамп (47x20 мм) з надпісам у тры радкі:** “*Беларускі Дзяржаўны/ №_______/ МУЗЕЙ*” **(пад ім простым алоўкам прастаўлены нумар:** “*5991$^{20}$*”, **а справа – чырвоным алоўкам лічба:** “*4*”), **далей – недапісанае польскае слова** “*Przy[ięto]*” **і запіс па-расійску:** “*По описи № 2*”.

**Ніжэй злева ад штампу добра чытаецца надпіс**: “*1775$^{o}$ Marca 27 Dnia w Warsza=/ wie dattny, codem Maia 11$^{o}$ w Trybu-/ nale Głm W$^{o}$X$^{a}$Littew aktykow et etc/ rum 1793$^{o}$ 7bra 16$^{o}$ w Grod Pin/ aktykow Przywiley od Krola Augusta/ Stanisława na Folwark Poiezuicki/ Stoszany cum attnen w Pow. Pin Sy=/ tuowany W$^{u}$JP Andrzeiowi Dzierżyńskie-/ mu Czeszn Pttu Grodz dany y służący/*”, **пад ім:** “*№ 1*”, **а пад нумарам – кепска відочны зацёрты запіс:** “*Pro Cancellariata/ Jllustrissimi et Excellentissimi Dni/ Joachimi in Szczorse Ziembin et/ Wiszniew, Comitis Littawor/ Chreptowicz/ Pro Cancellary Magni Docatus/ Lithuaniae Orsensis Zoslensis et/ Ry..ensis Capitaneus/ Sigillatum/ Est in Actis*”.

**6. 04.05.1775 г., (Варшава). Пергамін (КП № б/н), 37,7x41,9 см, захаванасць задавальняючая, тэкст чытаецца цалкам. Тэкст:**

“**Stanisław August** z Bożey Łaski Krol Polski Wielki Xiąze Litewski, Ruski, Pruski, Mazowiecki/ Zmudzki Kijowski, Wołynski, Podolski, Podlaski, Jnflantski, Smolenski, Siewierski, y Czerniechowski/

Oznaymuiemy tym Listem Wieczystym Przywileiem Naszym wszem wobec y kazdemu zosobna komu o tym wiedzieć Należy. Wychowani na Łonie Oyczyzny/ a Dziełem Nayważszey Opatrznośći na tron Polski wynieśieni Zapatruiemy się z ukontentowaniem na rożkrzewioną w przećiągu Panowania Naszego Młodżi/ Krajowey Edukacyą, znayduiąc nieprozne troskliwośći Naszey Skutki, gdy mimo wszelkie obcych y domowych niespokoyności Zawady Zaśilone Protekcyą Naszą Nau:/ ki wzrost y przyzwoity w tey Rzeczypospolitey mieć poczeły Szacunek z większym ieszcze uśilnośći Naszey natężeniem po zniesionym niedawno przeż Bullę Oyca So/ cum Jnstituto Xięży Jezuitow Zakonie, tę Jstotną potrzebę utrzymania Edukacyi Młodzi Krajowey na Nas przyiowszy Kommissyą Edukacyiną na Seymie terazniey:/ szym z Pany, Radami y Posłami, Ziemskimi, pod Zwierzchnośćią y powagą Naszą Ustanowilismy Dobra zaś ante Suppressionem Jnstituti przeż Jezuitow dżierzane/ do Funduszu teyże Edukacyi Narodowey nalezące na dochod Wieczysty z nich płaćić śię maiący Przywileiami Naszemi Nadać Umyslilismy. Jakoz gdy Urodzony Mi:/ chał Szyrma Sędżia Grodżki Powiatu Pinskiego chcąc otrzymać Dziedzictwo Folwarku Jwańczyce nazwanego w Powiecie Pinskim lezącego za Summę Czterdzieści dwa/ Tysiące Dwieście dwadzieścia dwa Złotych Polskich Groszy Sześć Szelągow dwa na nim wieczyście lokowaną od tegoz Kapitału Pracent Wieczny Pułpiąta Złotego od Sta/ Prawem teraznieyszym ustanowiony płacić Submittowałsię y dla tey pewności Jwikcyą na własnych Dobrach Dziedzicznych Duboia nazwanych w Powiecie Pinskim/ leżących przez Dokument

Kommissyi Edukacyiney dany Zapisawszy. Supplikował do Nas przez Panow Rad przy Boku Naszym przytomnych Azebyśmy/ onemu Przywiley na przerzeczony Folwark Jwańczyce cum, Attinentiis wydać y przy Possessyi Wieczystey Jego Samego Potomstwo Oboyga płci y Sukcessorow/ onego na wieczne Czasy Utwierdzić Raczyli My Krol do wniesioney za nim prożby Łaskawie się skłoniwszy Ninieyszym Listem Wieczystym Przywilejem/ Naszym wspomniony Folwark Jwańczyce w Powiecie Pinskim leżący Urodzonemu Michałowi Szyrmie Sędziemu Grodzkiemu Powiatu Pinskiego Jemu Sa-/ memu Potomstwu oboyga Płći y Sukcessorom Jego na Wieczne Czasy Nadaiemy, przy Dziedzictwie takowego Folwarku na zawsże Zachowuiemy Utwierdzamy y/ Ubespieczamy Mocą ktorego Przywileju Naszego Urodzony Michał Szyrma Sędzia Grodzki Powiatu Pinskiego namieniony tyle kroć Folwark Jwańczyce Sam/ Dwor z Folwarkiem Sołomer y wsią także Jwańczyce nazwanymi ze wszelkim Dworu Folwarku i Wsi Zabudowaniem, z Gruntami, Lasami, Sianozę:/ ciami Puszczami, Gaiami, Rzekami, Zatokami, Jeziorami, Stawami, Młynami, Tartakami, Waluszami, Karczmami, Arędami, z Poddanymi Oboyga Płći z Czyn:/ szami, daninami, y Powinnościami onych cum omnibus deni*que* Attinentiis usibus fructibus et Utiktatibus bez zadnych excepcyi tak jako się ten Folwark w/ swoich własnośćiach Obszernośćiach y ograniczeniach Znayduie y Znaydować się powinien w Wieczystą Possessyą Offitiose obeymować, trzymać, dzierzeć uzywać, Ple:/ banow Cujuscun*que* Ritus vacantibus Beneficiis ex Jure Suo Patronatus prezentować ten Folwark komu chcąć dać Darować, przedać Zamienić Zapisać,/ y wszelkich Sobie ztamtąd Pozytków wynaydować, beż Zadney od kogoż kolwiek przeszkody wiecznemi Czasy wespoł z Sukcessorami Swoiemi wolen y/ mocen będzie Salvis Conditionibus w Konstytucyi Seymu teraznieyszego pod Tytułem Rozrządzenie Dobrami Jezuickiemi Expressis Na-/ co dla Lepszey Wiary Ręką Naszą podpisawszyśię Pieczęć W*o*X*a*L*o* Zawiesić Rozkazalismy. Dan w Warszawie Dnia IV Mie/ siąca Maja Roku Pańskiego MDCCLXXV Panowania Naszego XI Roku./ Stanisław August Krol/ Folwark Jwańczyce w Powiecie Pin:/ skim Sytuowany do Funduszu Edu:/ kacyi Narodowey nalezący Urodzone-/ mu Michałowi Szyrmie Sędziemu/ Grodzkiemu Powiatu Pinskiego wiecno/ scią Confertur./ Jerzy Białopiotrowicz Łowczy Pttu Lidzkiego/ J*o*Kmci Pieczęci WXL*o* Sekretarz".

**Унізе дакументу на чырвоным плецяным шоўкавым шнуры прывешана ў жалезнай з плямамі іржы бляшанцы вялікая пячатка ВКЛ на чырвоным воску, якая добра захавалася: у цэнтры герб "***Пагоня***" пад княжацкай мітрай, над якой у кляйноце на картушы польскі "***Арол***" пад каронай, па баках "***Пагоні***" – дзве постаці ў туніках – тарчатрымальнікі, якія абапіраюцца на тарчы з гербам "***Цялё***" (справа) і манаграмай "***SAR***" (злева). Уся кампазіцыя знаходзіцца на пліце, у цэнтральнай частцы якой пададзена дата: "***MDCCLXIV***". Надпіс у абтоку пячаткі: "***STANISLAVS AVGVSTVS DG REX POL M DVX LIT. RVS. PRVS. MAS. SAM. KI. VOL. PODO. PODL. LI. SMO. S…***".

**На адвароце дакументу захаваліся наступныя запісы:** "*Ru 1793 Msca 7bra 27 Dnia ... Na Rokach Sądowych/ Ziemskich So Michalskich Pttu Pin ... .../ ... ... WJP Adam Jacynicz Staroscic ... .../ Przywiley na Dobra Jwanczyce ... ... od=/ Nayiasnieyszego Krola ... Polskiego Stanisława/ Augusta WJPu Michałowi Szyrmie Sędziemu Grodz/ Pinskiemu ... y do Akt podał .../ Kazimierz Swiezyński Sę: Zi: Ptt Pgo .../ Michał Seyfan ... Ziem y Hor Ptt Pingo mp/ Teodor Rodziewicz ... Ziem Pttu .../*", **пад ім:** "*Jest w xiągach/ Paweł Kaczanowski/ JWZyGPPR/*" **і:** "*Roku 1812. Msca Januarii 23 dnia Kommissya Sądowa Edukacyina Takowy/ Przywiley przy Sprawdzeniu Prawa na Possessyą, na Jnstancyą W JPana Piotra/ Szyrmy Sędzica Grodkiego Pinskiego. judicialiter Konotuie./ Jerzy Białopiotrowicz Komissarz Sąd: Eduk: tymczasowa Prezyduiący/ Antoni Dyzmas Lachnicki Komisarz/ Rudolf Tyzenhauz Komissarz/*". **У левым верхнім куце захаваўся шасцікутны ромбападобны фіялетавы штамп (47х20 мм) з надпісам у тры радкі:** "*Беларускі Дзяржаўны/ №_______/ МУЗЕЙ*", **пад ім простым алоўкам прастаўлены нумар** "*5991/21*" **і чырвоным алоўкам** "*8.*".

## Літаратура:

1. Jodkowski J. Muzeum w Grodnie. Zarys dziejów powstania i rozwoju. 1920–1922.– Grodno, 1923.– 36+7 s.

2. Jodkowski J. Muzeum w Grodnie. Sprawozdanie z czynności za rok 1923.– Grodno, 1924.– 58 s.
3. Шаланда А. Пергаміны канца XVI–XVII ст. на лацінскай і польскай мовах у фондах Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.// Герольд Litherland.– Горадня, 2002.– № 3–4.– С.97–119.

*Аляксей Шаланда.*

## ***<u>РЭЦЭНЗІІ.</u>***

### Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей.

*Мат-лы навукова-практычнай краязнаўчай канферэнцыі 22 снежня 1995 г.*

Пад рэд. І.П.Крэня.

Ваўкавыск: Ваўкавыская ўзбуйненая друкарня, 1997.– 267 с.



У 1995 г. адбылася адная з шэрагу раённых навукова-практычных краязнаўчых канферэнцыяў, па якой, з цягам часу, выйшаў зборнік матэрыялаў “*Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей*”. Агучаныя на канферэнцыі навуковыя тэмы сталі сведчаннем шырыні і глыбіні навуковых інтарэсаў пераважна гісторыкаў Гарадзеншчыны да мінуўшчыны Ваўкавыскага рэгіёна. Заўважым, што сярэдзіна 90-х – гэта адметны час, калі да разгляду браліся, часам упершыню, шмат якія пытанні і праблемы беларускай гісторыі. Час “*выбуху*” цікавасці да ўласнай мінуўшчыны, абумоўлены палітычнымі зменамі, спрыяў рэалізацыі даследніцкіх памкненняў, і першыя вынікі іх прадэманстраваны на старонках згаданага “*ваўкавыскага*” выдання.

Агульны агляд праблемаў, узнятых гісторыкамі, дае падставу бачыць стартавы ўзровень, з якога можна адсочваць далейшы рух у назапашванні ведаў і асэнсаванні іх у дачыненні да гісторыі Ваўкавышчыны. І рабіць адпаведныя высновы.

Разгледзім тэмы аўтараў у храналагічнай паслядоўнасці. На падставе грунтоўных археалагічных даследаванняў Я.Зверуга акрэсліў асаблівасці ўзнікнення і асноўныя этапы развіцця старажытнага Ваўкавыска. М.Чарняўскі засяродзіў увагу на такім фенаменальным археалагічным помніку Ваўкавышчыны, як крамянёвыя шахты. Паказальная ўвага археолага да пытання аб музейным і турыстычным выкарыстанні гэтага археалагічнага комплексу, як “*стрыжня магчымага турыстычнага маршрута*”. А.Квяткоўская на падставе звестак аб 3-х з 10-ці каменных могілак, частка з якіх была даследавана ўласна аўтаркай, палічыла магчымым зрабіць выснову аб “*цэласнасці і пераемнасці пахавальных традыцый насельніцтва ў перыяд ад XI да XVIII стст., як яцвяжскай па асаблівасцям канструкцый каменных кладак і пахавальнаму абраду*”. Л.Побаль у артыкуле “*Антычны імпарт Ваўкавыскай зямлі*” звярнуў увагу на сляды на Ваўкавышчыне Нёманска-Бужскага варыянту зарубінецкай культуры. Вёска Мсцібава стала прадметам навуковай цікавасці для гарадзенскага археолага і гісторыка фартэфікацыі С.Піваварчыка. Даследчык спрабуе знайсці тлумачэнні тапоніму сучаснай вёскі, а некалі мястэчка з Магдэбургскім правам.

Час ВКЛ мае ў зборніку дзевяць з 45 тэмаў. Сярод іх І.Кулевіч зрабіла агляд зменаў месца і значэння горада Ваўкавыска ў гісторыі Княства. Пераемнасць валодання землямі гэтага беларускага места, памеры і характар гандлю і рамёстваў, удзел мяшчанаў Ваўкавыска ў палітыцы і войнах сталі крытэрыямі для такога асвятлення ваўкавыскай гісторыі. Для краязнаўцаў цікавасцю ёсць пералік назваў ваўкавыскіх вуліцаў на 1513 г. Гісторыя рэлігійных дачыненняў знайшла адлюстраванне ў даследванні язычніцтва на прыкладзе аб’ектаў пакланення, археалагічных помнікаў і этнаграфічным матэрыяле ў артыкуле Э.Зайкоўскага. В.Коржыч, Л.Карнілава і С.Марозава прапанавалі храналагічныя агляды гісторыі, адпаведна – праваслаўнай, каталіцкай і уніяцкай цэркваў на Ваўкавышчыне. Гісторык архітэктуры І.Трусаў звярнуў увагу на палацава-паркавыя комплексы: Вярэйкі, Гнезна, Краскі, Майсяевічы, Мачульна, Падароск, Рось, Субічы, Тэалін, Шчыпава. Уласнае тлумачэнне герба Ваўкавыска далі гарадзенскія краязнаўцы В.Швед і А.Госцеў. Знаўца беларускай геральдыкі і генеалогіі А.Шаланда ўдакладніў, на падставе новых архіўных

дадзеных радавод ваўкавыскай галіны роду Аляхновічаў. Этапы гісторыі роду князёў Агінскіх у Ваўкавыскім павеце акрэслены Г.Акунеўскім. Вёска і маёнтак Косін стала ў канцы XIX ст. месцам працы беларускага этнографа М.Федароўскага, а Вітольд Карпыза з Польшчы прапанаваў гістарычнае апісанне гэтага паселішча.

Прысвечаных непасрэдна перыяду гісторыі Ваўкавыска і яго ваколіцаў у Рэчы Паспалітай артыкулаў зборнік не мае, калі не лічыць адпаведныя факты з гістарычных аглядаў. Перыяд жа ўваходжання Ваўкавышчыны ў склад Расійскай імперыі прадстаўлены 11-цю працамі. І.Соркіна (Папко) ў якасці этапу свайго дысертацыйнага даследавання па гісторыі беларускіх мястэчак звярнула ўвагу на мястэчкі Ваўкавышчыны канца XVIII–першай паловы XIX ст. Сістэма адукацыі, у тым ліку Свіслацкай гімназіі, развіццё жывапісу, кніжная справа, тэатр – гэта праблемы артыкула С.Куль-Сільверставай аб гісторыі культуры Ваўкавышчыны першай паловы XIX ст. Ж.Паўтарак стварыў апісанне падзеяў гісторыі горада ў часы вайны 1812 г. Асобна даследчык звярнуў увагу на пасляваеннае аднаўленне горада, чым падкрэсліў наступствы вайны для яго жыхароў. Постаць генерала П.Баграціёна – фігуры вызначальнай для расійскага ракурса бачання месца Ваўкавыска ў вайне 1812 г. – была прадстаўлена супрацоўнікам Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэта У.Ягорычавым. В.Швед у артыкуле “*Ваўкавыскі павет падчас лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг.*” адзначыў такіх удзельнікаў-ваўкавычан, як Ян Жылінскі, Тадэвуш Тышкевіч, ксёндз з Зэльвы Коцін, вуніяцкі святар Бенедыкт Плуцінскі, адвакат Вінцэнт Янкоўскі. Даследчыкам была складзена табліца характарыстыкі паўстанцаў і тых, хто ім спачуваў, па павету па сацыяльнаму стану. Пададзена інфармацыя аб 37-мі ўдзельніках паўстання. На падставе архіўных матэрыялаў Э.Ярмусік напісаў артыкул пра падзеі на Ваўкавышчыне другога вызваленчага паўстання – 1863 г. Гісторык медыцыны Ф.Ігнатовіч паказаў такую катэгорыю паўстанцаў 1863 г. як медыкі. Л.Барэйшык звярнуў увагу на такі след паўстання 1863 г., як памеры пакарання. Н.Паўлючэнка дала агляд падзеяў рэвалюцыі 1905–1907 г. на Ваўкавышчыне. Міжрэвалюцыйны перыяд, часы Сталыпінскай рэформы коратка паказаныя ў артыкуле В.Працэнка. В.Карнялюк скіраваў сваю ўвагу на такі цмяны перыяд гісторыі XX ст., як першая сусветная вайна. У артыкуле паказаны памеры ўдзелу сялянаў з Ваўкавышчыны ў будаўніцтве Гарадзенскай крэпасці.

Перыяд знаходжання Ваўкавыска ў Другой Рэчы Паспалітай паказаны у артыкулах М.Сямёнчыка, В.Карпызы і Г.Сяменчука, С.Дразда. Гэта – тэмы прамысловага развіцця горада, абставінаў выхаду “*Tygodnika Wołkowyskiego*”, палітычнай барацьбы КПЗБ і КСМЗБ. Падзеі Другой сусветнай вайны былі падняты ў артыкулах М.Васілючака “*Ваўкавышчына напярэдадні вайны*”. Сярод мерапрыемстваў Савецкай улады ў даваенны час 1939–1941 г. аўтар асцярожна звяртае ўвагу і на рэпрэсіі. А.Чарныш, паказваючы ваенны перыяд Ваўкавыска, асноўную частку артыкула прысвячае акупацыйнаму рэжыму ў горадзе, дзейнасці савецкіх партызанаў і падпольшчыкаў. Прафесар І.Коўкель прапанаваў шырокі па перыяду – 1939–1953 г. агляд польскага руху ў Ваўкавыскім краі. Тэма Арміі Краёвай на той час толькі ўздымалася ў айчынай гістарыяграфіі.

Сярод артыкулаў біяграфічнага зместу ў зборніку вызначаецца матэрыял гарадзенскага краязнаўцы А.Майсяёнка “*Браты Найдзюкі на цярністысм шляху беларускасці*”. Постаці Язэпа і Чэслава Найдзюкоў – прыклад адкрыцця тых імёнаў найноўшай беларускай гісторыі, якія раней не траплялі поле зроку беларускіх гісторыкаў і краязнаўцаў.

Падыходзячы да агляду дадзенага зборніка мы ставілі сабе за мэту знайсці перш за ўсё станоўчае, канструктыўнае ў работах знаўцаў ваўкавыскай мінуўшчыны. Вядома, што працы змяшчаюць і часовае, памылковае і спрэчнае. Тая акалічнасць, што такія канферэнцыі дазваляюць, нават, прадугледжваюць магчымасць агучвання розных тэмаў, прывяла да даволі вялікай колькасці агульных матэрыялаў, па сутнасці аглядаў. Пройдзены навукай шлях за дзесяць год штосьці абвергнуў або, наадварот, падцьвердзіў. З другога боку частка артыкулаў, наадварот носіць дэталізаваны, прыватны характар, бо яны з’яўляюцца фрагментамі, этапамі буйных навуковых даследаванняў аўтараў-выступоўцаў. Стракатасць

тэматыкі – гэта і дэманстрацыя тых лакунаў мінуўшчыны, якія не былі ўзяты на той час да разгляду навукоўцамі, і “*новае*”, на пачатак 90-х г. XX ст., у айчынай гістарыяграфіі: “*гісторыя мястэчак*”, “*шляхецкая геральдыка і генеалогія*”, “*гісторыя уніі*”, “*першая сусветная вайна*”, “*беларускі вызваленчы рух*”, “*акаўская барацьба*”. Гэта тыя старонкі, якія істотна дапаўняюць агульнагістарычную карціну Ваўкавышчыны ў прыватнасці і Беларусі ў цэлым. Як паказала жыццё, прадэманстраваныя на канферэнцыі крокі, сталі цэлым навуковым шляхам. Насуперак усяму.

*Віталь Карнялюк.*

## Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa Nowogródzkiego.

*Tom 1. Redakcja naukowa Maria Kałamajska-Saeed.*
*W: Materiały do dziejów sztuki sakralnej na ziemiach wschodnich dawnej Rzeczypospolitej.*
Część II. Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa Nowogródzkiego.
Redaktor naukowy serii Jan K. Ostrowski.
Kraków, 2003.– 296 s., 412 il.



Напачатку 90-х г. мінулага стагоддзя ў асяроддзі кракаўскіх і варшаўскіх гісторыкаў мастацтва і архітэктуры нарадзіўся цікавы навукова-даследчы праект па інвентарызацыі каталіцкіх культавых помнікаў – касцёлаў і кляштараў, размешчаных на землях былых ўсходніх ваяводстваў Рэчы Паспалітай (тэрыторыі сучасных Украіны, Беларусі і Літвы). Вынікі шматгадовых экспедыцыйных даследаванняў, архіўных, бібліятэчных і музэйных пошукаў адпаведна падрыхтаваныя друкуюцца ў сэрыі *Materiały do dziejów sztuki sakralnej na ziemiach wschodnich dawnej Rzeczypospolitej*, якую выдае Міжнародны цэнтр культуры ў Кракаве. Першая частка дадзенай серыі (выйшла 10 тамоў) была прысвечана касцёлам і кляштарам заходніх раёнаў сучаснай Украіны – дыяцэзіі Львоўскай, Камянецкай, Перамышленскай, Луцкай і іншым. Першая кніга другой часткі прысвечана помнікам Наваградскага ваяводства, якія калісьці ўваходзілі ў склад Віленскай дыяцэзіі. На старонкі рэцэнзуемай кнігі трапілі 10 аб’ектаў, размешчаных на тэрыторыі сучасных Ваўкавыскага, Свіслацкага і Слонімскага раёнаў.

Сярод прадстаўленых помнікаў парафіяльныя касцёлы Святога Міхала Арханёла ў Гнезна, Святой Троіцы ў Росі, Святога Вацлава ў Ваўкавыску, Святога Станіслава Косткі ў Ваўкавыску, Святога Яна Хрысціцеля ў Воўпе, Святых Пятра і Паўла ў Дзявяткавічах, могілкавыя капліцы ў Ваўкавыску і Святога Стэфана ў Росі, руіны касцёла і кляштара францішканаў у Вялікай Лапеніцы. Гэтая невялікая група, на першы погляд, уяўляе сабою прыклады характэрныя для культурнага ландшафту дадзенага рэгіёну. На старонках кнігі прадстаўлены мураваныя і драўляныя будынкі амаль усіх мастацкіх стыляў, вядомых на нашых землях. Касцёл у Гнезне адносіцца да адзінкавых познегатычніх помнікаў Беларусі. Познебарочны драўляны касцёл у Воўпе вылучаецца сваеасаблівасцю фасаду і ансамблем раннебарочных алтароў. Небанальныя формы маляўнічага барока прасочваюцца ў напаўразбураным касцёле францішканаў у Вялікай Лапеніцы. Характэрныя элементы станіслаunion эпохі мае касцёл у Дзявяткавічах. Класіцызм у варшаўскай і віленскай формах прадстаўляюць касцёлы ў Росі і Ваўкавыску. Прыкладамі архітэктурнага гістарызму з’яўляюцца неараманская могілкавая капліца ў Росі, неабарочная ў Воўпе і неагатычная ў Ваўкавыску, пабудаваныя ў пачатку XX ст., а драўляны касцёл св.Станіслава Косткі ў Ваўкавыску – прыклад нацыянальных мастацкіх пошукаў 20–30-х г. XX ст.

Кожнаму з прадстаўленых помнікаў прысвечаны асобны артыкул, у якім падаецца гісторыя будынка і парафіі, падрабязнае апісанне вонкавага і ўнутранага выгляду, алтароў, касцельнага абсталявання, прадметаў культу, будынкаў і муроў вакол касцёла. Таксама характарызуецца стан захаванасці помніка і падаецца яго мастацтвазнаўчы аналіз. Да

кожнага артыкула ў дадатках падаюцца інвентарныя апісанні касцёлаў і парафіяў, якія захоўваюцца ў архівах Вільні, Менску і Горадні. Для касцёла ў Дзявяткавічах гэта інвентары за 1805 і 1844 г., у Гнезна – за 1732 г., у Вялікай Лапеніцы – за 1679, 1800, 1832 г., у Росі – за 1675, 1721, 1827 г., у Ваўкавыску (св.Вацлава) – за 1927 г., у Воўпе – за 1668, 1700, 1712, 1801, 1822 г.

Кніга багата ілюстравана фатаздымкамі архітэктурных помнікаў, іх планаў, прадметаў культу, узораў ужытковага мастацтва, памятковых і фундацыйных табліцаў. Ілюстрацыі прадстаўляюць чытачу выгляд касцёлаў ад канца XIX ст да сярэдзіны 90-х г. XX ст. Вельмі важна, што зафіксаваны таксама сучасны жудасны стан часткі помнікаў, як напамін аб атэістычным варварстве на нашых землях.

Нельга пакінуць па-за ўвагай пэўныя памылковыя сцверджанні аўтараў. Напрыклад, Марцін Зглінскі ў артыкуле пра Ваўкавыск і яго культавыя помнікі безкрытычна, услед за Ю.Ядкоўскім, падае факт знішчэння горада ў 1244 г. мангола-татарамі. Дадзенага факта няма ў ніводнай крыніцы. Той жа самы аўтар падае, што Ваўкавыск атрымаў магдэбурскае права ў 1486 г., дзякуючы прывілею вялікага князя Аляксандра Ягелончыка. Але апошні быў князем у 1492–1506 г., а наданне магдэбурскага права Ваўкавыску, на думку большасці даследчыкаў, адбылося ў 1503 г. Важным фактам з'яўляецца тое, што частку абразоў у Ваўкавыскім касцёле св.Вацлава пасля пажару 1929 г. маляваў выдатны беларускі мастак Пётра Сергеевіч з Вільні, як ўстанавіла беларускі гісторык з Польшчы Алена Глагоўская.

*Альбіна Семянчук.*

## ***<u>ПЫТАННІ, АДКАЗЫ, КАНТАКТЫ, ІНФАРМАЦЫЯ.</u>***

### Складаны герб Яраслава Аляксандра Мальхеравіча Шэмета (1619 г.).
*(Адказ на пытанне № 3).*

У № 3–4 "*ГЛ*" за 2001 г. намі была змешчана пячатка Яраслава Мальхеравіча Шэмета, віленскага падкаморыя з яго асабістым складаным гербам: ***тарча падзелена на чатыры часткі – у 1-ай і 2-ой выявы лебедзя, у 3-яй – галава льва, з пашчы якога вырываецца полымя і ў 4-ай – падкова канцамі ўніз з простым крыжам паміж імі, над тарчай гелм са шляхецкай каронай, у кляйноце – галава льва з полымем у пашчы, вакол тарчы намёт, ініцыялы: "I[arosław] S[zemiet]"*** [1, с.130]. Пытанне гучала так: каму належалі гербы, якія ўвайшлі ў складаны герб Я.М.Шэмета?



Як вядома, асабістыя складаныя гербы ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай адлюстроўвалі генеалогію ўладальніка. Чатырохчастковы герб павінен быў мець ў першым полі родавы (бацькоўскі) герб, у другім – герб маці, у трэцім і чацьвертым – гербы бабак па бацьку і па маці адпаведна [2, s.49]. Аднак, на практыцы існавалі пэўныя адхіленні ад правіла. У ВКЛ шырока была распаўсюджана з'ява захавання ў складаных гербах гербавых выяваў, якія адлюстроўвалі найбольш важныя шлюбныя сувязі ў гісторыі рода.

Яраслаў Аляксандр Шэмет, падкаморы віленскі († пасля 1633 г.) быў сынам Мальхера Мальхеравіча Шэмета, падкаморыя спярша вількамірскага, а потым віленскага († 1616 г.) і княжны Зоф'і Галаўчынскай. Дзедам яго быў Мальхер Станіслававіч Шэмет, каштэлян жамойцкі († 1570 г.), а прадзедам Станіслаў Мікалаевіч Шэмет. Жонкай апошняга і прабабкай Яраслава з'ўлялася Ганна Кежгайла [3, tabl.IV].

У сувязі з гэтым, складаны асабісты герб Яраслава Аляксандра Мальхеравіча Шэмета, падкаморыя віленскага (1619 г.) чытаецца так:

1 – "*Лебедзь*" – родавы герб Шэметаў;

2 – герб "*Лебедзь*" маці княжны Зоф'і Галаўчынскай;

3 – герб "*Задора*" прабабкі па бацьку Ганны Кежгайлы;

4 – герб “*Тупая падкова*” бабкі па маці (?), а ў кляйноце – “*Задора*” зноў Кежгайлаў[81].

На нашу думку, змяшчэнне Яраславам Шэметам герба “*Задора*” сваёй прабабкі тлумачыцца толькі яго жаданнем падкрэсліць шлюбны саюз Шэметаў са славутым, але выгаслым родам Кежгайлаў. Пазней у кляйноце “*Лебедзя*” Шэметаў замацавалася палова льва, пра што пісаў В.В.Каяловіч: “*Шэметы дом старадаўні ...поле [свайго “Лебедзя”] кладуць блакітнае, а ў гелме палову льва белага*” [5, s.128].

Не зусім зразумела каму належаў герб “*Тупая падкова*” у 4-ым полі. Па правілах ён павінен быў адносіцца да бабкі па маці. Маці Яраслава княжна Зоф’я Галаўчынская ў радаводзе князёў Галаўчынскіх – асоба незнаёмая [6, s.131]. Магчыма, яна была дачкой князя Яраслава Матвеявіча Галаўчынскага і Дароты Касцевіч (адсюль імя Яраслаў у Шэмета). Аднак, род Касцевічаў адносіўся познімі геральдыкамі да гербу “*Ляліва*” [7, T.11, s.350; 8, T.7, s.313]. Магчыма, гэта быў герб прабабкі па маці – княжны Людмілы Духніч, але герб князёў Духнічаў – невядомы. Былі выпадкі, калі ў 4-ым полі змяшчалі герб жонкі. Але жонкай Яраслава Шэмета была Канстанцыя Сапега, таму такі варыянт адпадае.

Складаны герб бацькі Яраслава – Мальхера Мальхеравіча Шэмета – нам невядомы. Аднак, польскі даследчык Ю.Пузына апублікаваў у свой час складаны герб роднага дзядзькі Яраслава – Вацлава Мальхеравіча Шэмета, падкаморыя жамойцкага (1588 г.): тарча падзелена на чатыры часткі – у 1-ай выява лебедзя (“*Лебедзь*” Шэметаў), у 2-ой – месяц рагамі дагары, паміж якімі шасцікутная зорка (“*Ляліва*” маці Гальшкі Глябовіч), у 3-яй – галава льва[82] (“*Задора*” бабкі па бацьку Ганны Кежгайлы), у 4-м – тры трубы, складзеныя ў вехер (“*Трубы*” бабкі па маці Зоф’і Пятковіч), над тарчай гелм з каронай, у кляйноце – пяць пёраў паўліна, вакол тарчы намёт, ініцыялы: “*S[zemiet] W[acław]*” [9, s.73, № 27; 3, tabl.I, IV; 7, T.7, s.288]. Пячатку са складаным гербам дзеда Яраслава – Мальхера Станіслававіча Шэмета, каштэляна жамойцкага (1569 г.) апублікавалі Ў.Сэмковіч і С.Кутшэба: тарча падзелена на чатыры часткі – у 1-ай выява лебедзя (“*Лебедзь*” Шэметаў), у 2-ой – выява зацертая (павінна быць “*Задора*” маці Ганны Кежгайлы), у 3-яй – зноў выява невідочная (бабкі па бацьку нейкай Марыны), у 4-ай – выява галавы казы (“*Палукоз*” невядомай бабкі па маці), над тарчай гелм з каронай, у кляйноце – лебедзь з узнятымі крыламі, вакол тарчы намёт, ініцыялы: “*Mal[cher] Sze[miet] K[asztelan] S[amogitiae]*” [10, s.349, № 11]. Вынікае, што ініцыятарам вынасу ў кляйнот выявы галавы льва з полымем з пашчы быў або бацька Яраслава, або ён сам. Апошняе выглядае больш праўдзіва.

Такім чынам, асабісты чатырохчастковы герб Я.М.Шэмета быў складзены з парушэннем правілаў з-за жадання ўладальніка падкрэсліць свае крэўныя сувязі з выгаслым магнацкім родам Кежгайлаў.

## Літаратура і крыніцы:


1. Герольд Litherland.– Горадня, 2001.– № 3–4.– С.129–130.
2. Kulikowski A. Heraldyka szlachecka.– Warszawa, 1990.– 239 s.
3. Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium do połowy XVI wieku.– Poznań, 1982.– 163 s.
4. Górzyński S., Kochanowski J. Herby szlachty polskiej.– Warszawa, 1992.– 175 s.
5. Kojałowicz Wijuk W. Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego tak zwany Compendium./ Wyd. F.Piekosiński.– Kraków, 1897.– 527 s.
6. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku.– Warszawa, 1895.– 698 s.
7. Boniecki A. Herbarz Polski.– Warszawa, 1899–1913.– T.1–16.
8. Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej.– Warszawa, 1904–1931.– T.I–XV.
9. Puzyna J. Niektóre pieczęcie Litewskie z XVI i XVII w.// Misięcznik heraldyczny.– Warszawa, 1933.– R.XII.– № 4.– S.55–58; № 5.– S.73–77.
10. Akta Unii Polski z Litwą 1385–1791./ Wyd. S.Kutrzeba, W.Semkowicz.– Kraków, 1932.– 570 s.


*Аляксей Шаланда.*

[81] Герб “*Задора*” выглядаў так: у блакітным полі срэбная галава льва, якая выдыхае чырвонае полымя, у кляйноце такая ж самая галава [4, s.162].

[82] Ю.Пузына не ўбачыў яе і адзначыў, што ў 3-яй частцы змешчаны: “*znak figuralny, który określić trudno*” [9, s.73].

* * *

*Інфармацыя.*

## Натрунная табліца Тамаша Карнеўскага, стольніка цехаnoўскага (сярэдзіна XVII ст.).

Шматлікія помнікі беларускай гісторыі і культуры захоўваюцца не толькі ў дзяржаўных музеях і архівах. Ёсць яны і ў прыватных калекцыях. Некаторыя з іх непасрэдна звязаныя з геральдыкай і генеалогіяй ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Рэдакцыя "*ГL*" звяртаецца да ўсіх калекцыянераў з просьбай дасылаць у часопіс фотаздымкі, прамалёўкі і апісанні такіх помнікаў з мэтай іх далейшага навуковага даследавання. Тое, што такая праца прыносіць плён, сведчыць наступны прыклад. З ласкавага дазволу Алеся Госцева, вядомага гарадзенскага краязнаўцы і калекцыянера нам удалося азнаёміцца з натруннай табліцай шляхціча Тамаша Карнеўскага, апісанне якой мы змяшчаем ніжэй.

Табліца зроблена з пасярэбранай меднай бляхі і ўяўляе сабой трапецыю з закругленымі верхнімі вугламі (памеры 27(30)х26,2 (29) мм), па краі табліцы ідуць пялёсткі (захавалася 55, страчаны ўнізе справа, па праваму боку і пасярэдзіне зверху), а па вуглах – пяцелькі з дзіркамі ад цьвікоў (адзін у левым ніжнім вуглу захаваўся), якімі яна прыбівалася да труны. Сёння яна прыбіта да дзвух сучасных дошак. Табліца пакрытая чаканкай – па яе краю выбіты арнамент з лісця аканта шырынёй 20 мм, уверсе па цэнтру змешчаны лацінскі надпіс у чатыры радкі: "**Tres ...uas Stemma cruces nec me portasse negarim/ Assiduus Soleam fregerit vsq***ae* **labor/ Hac tandem Thomas Karniewski claudor in vrna/ Quam dare Ulta neguyl (?) mors mihi facta quies**/" (мы пераклалі як: "*Тры крыжы ў гербе не мне браму зачынілі, Жвавая падкова астыла ад бесперапыннай працы, Тут нарэшце Тамаш Карнеўскі закрыты ў труне, Аб сумнай смерці якога мне прыходзіцца паведамляць*"), пад ім – герб: на гішпанскай тарчы падкова канцамі ўніз з простым крыжам наверсе, з канцоў падковы ўправа і ўлева наўскос выходзяць таксама простыя крыжы, над тарчай гелм са шляхецкай каронай, у кляйноце крыло, якое прашыта стралой управа (герб "*Дуброва*" [1, s.48]), вакол тарчы намёт з лісця і ініцыялы: "*T//K D//C C//W*".

Асоба Тамаша Карнеўскага вядома слаба. У К.Нясецкага пад родам Карнёўскіх ("*Karniowscy*") гербу "*Дуброва*" гаворыцца, што яны "*starodawna na Mazowszu familia*". Пра Тамаша згадваецца толькі тое, што ён быў дзяржаўцам васількоўскім і ў 1647 г. фундаваў пабудову езуіцкага касцёлу ў Пултуску, якому запісаў на вечныя часы свой маёнтак Малехі [2, s.37; 3, s.211]. А.Банецкі дадаў, што Тамаш Карнеўскі на Карневе і Малехах быў сынам Себастыяна, у 1631 г. склаў тэстамент, у 1637 г. згадваецца як падстароста суражскі, а ў 1645 г. – як стольнік цеханоўскі [4, s.262].

Такім чынам, табліца можа датавацца сярэдзінай XVII ст., бо ў 1647 г. Тамаш Карнеўскі быў яшчэ жывы. Ініцыялы вакол гербу расшыфроўваюцца так: "*T[homas] K[arniewski] D[apifer] C[iechanoviensis] C[apitaneus] W[asilkoviensis]*" – "*Тамаш Карнеўскі, стольнік цеханоўскі, староста васількаўскі*".

### Літаратура:


1. Górzyński S., Kochanowski J. Herby szlachty polskiej.– Warszawa, 1992.– 175 s.
2. Niesiecki K. Herbarz polski.– Lipsk, 1840.– T.5.– 476 s.
3. Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej.– Warszawa, 1909.– T.VI.– 392 s.
4. Boniecki A. Herbarz Polski.– Warszawa, 1906.– T.9.– 400 s.


*Аляксей Шаланда, Сяргей Амелька.*

* * *

## Спіс скаротаў:

АВАК – Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией.
Архив ЮЗР – Архив Юго-Западной России.
аўт. – аўтограф.
АЮЗР – Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией.
БРК ГДГАМ – Бібліятэка рэдкай кнігі Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.
зг. тв. – згаданы твор.
ЛДГА – Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў.
РИБ – Русская историческая библиотека.
РНБ – Российская национальная библиотека.
руб. – рублёў.
СА – старажытныя акты.
стар. – старонка.
ЭГБ – Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.
LSP – Lituano-Slavica Posnaniensia.
PSB – Polski słownik biograficzny.
R.– Rocznik.
tabl. – tablica.
* – нарадзіўся.
† – памёр.

* * *

### *Памятка для аўтараў часопіса “Герольд Litherland”:*

З мэтай удасканалення выдання Рэдакцыя звяртаецца да аўтараў часопіса з просьбай прытрымліваццa адзіных нормаў афармлення тэкстаў. Апошнія (на дыскеце і 1 экзэмпляр на паперы) аб’ёмам да 10 старонак фармата А4 (210 x 297 мм) павінны быць набраны ў рэдактары *Word* (версія не ніжэй 6,0) для *Windows* праз 1 інтэрвал шрыфтам *Times New Roman* памеру 12 *pt* без пераносаў.

Палі: верхняе, левае, ніжняе – 20 мм, правае – 15 мм.

Першы радок: назва матэрыялу (па цэнтры), вылучаная тлустым шрыфтам памеру 14 *pt*. Праз інтэрвал друкуецца тэкст. У канцы яго праз інтэрвал справа падаецца курсівам прозвішча (прозвішчы) і імя (імёны) аўтараў, у дужках горад, назва навучальнай ці іншай установы.

Спасылкі на літаратуру і крыніцы падаюцца ў тэксце ў квадратных дужках. Першая лічба – нумар са спіса выкарыстанай літаратуры і крыніцаў, наступныя лічбы – старонкі ці аркушы. Напрыклад, [1, с.22], [2, s.11], [3, a.2–2 адв.]. Пасля асноўнага тэксту падаецца спіс выкарыстанай літаратуры і крыніцаў.

Тэксты можна дасылаць на адрас рэдакцыі і па электроннай пошце:
litherland@tut.by